**Радзім Гарэцкі**

# Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі і Украіна

Мінск
«Тэхналогія»
2009

УДК 55(476+477)(092)+929 Гарэцкі
ББК 26.3г(4Бел) Г21

На франтыспісе — партрэт Гаўрылы Гарэцкага. 1966 год

Гарэцкі, Р.

Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі і Украіна і Радзім Гарэцкі. - Мінск: Тэхналогія» 2009. - 98 с.

ISBN 978-985-458-188-0

Кніга прысвечана некаторым падзеям жыцця і творчасці акадэміка Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага (вядомага беларускага эканаміста, геолага, географа, грамадскага дзеяча), звязаным з Украінай, вывучэнню геалагічнай будовы якой ён аддаў шмат гадоў.

Для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай навукі.

УДК 55(476+477)(092)+929 Гарэцкі
ББК 26.3ч(4Бел)

ISBN 978-985-458-188-0

© Гарэцкі Р., 2009

Гаўрыла Гарэцкі нарадзіўся ў вёсцы Меншая (пазней Малая) Багацькаўка былой Шамаўскай воласці (цяпер Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці) 10 красавіка 1900 г. Бацькі, Іван Кузьміч і Еўфрасіння Міхайлаўна, былі сялянамі, займаліся земляробствам. Абое непісьменныя.

У Гаўрылы Гарэцкага, як і ў яго старэйшага брата Максіма, любоў да роднай мовы, да роднага кута пайшла ад маці, Еўфрасінні Міхайлаўны, і дзядзінай Хрысцёны[1], якія ведалі процьму цікавых казак і прыгожых песняў. Ужо ў дзяцінстве яны адчулі шчасце ад матчынай ласкі, ад крышталёвай паэзіі беларускіх песняў, казак і мовы. Брату Гаўрылу і самай меншай сястрычцы Ганулі[2] Максім казаў, што маці — першая і найлепшая настаўніца нашай роднай мовы, найдаражэйшага скарбу чалавека, таму трэба шанаваць сваю родную маці, родную мову. Максім у школе, а потым у Горацкім каморніцка-агранамічным вучылішчы прагна глытаў новыя веды, перачытаў шматлікія класічныя творы расейскіх, украінскіх, польскіх, беларускіх пісьменнікаў, шчыра палюбіў мастацкую літаратуру. Вялікі ўплыў зрабіла на яго паэзія Япкі Купалы і Якуба Коласа, ён захапляўся беларускай мовай, і неўзабаве яго самога пацягнула пісаць. У "Нашай ніве"[3] з'явіліся яго першыя нататкі і першае апавяданне "У лазні". Гаўрыла, які сталеў пад вялікім уплывам брата Максіма, ішоў яго шляхам і ў школе, і ў вучылішчы.

У Горках Гаўрыла, які вучыўся ў тым самым каморніцка-агранамічным вучылішчы, арганізаваў беларускі вучнёўскі гурток, які затым атрымаў назву "Беларуская секцыя вучняў Горацкіх сельскагаспадарчых школ", а з 1914 г. — "Беларуская секцыя вучняў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута", якая існавала да 1924 г. Пры секцыі дзейнічалі аддзелы розных кірункаў. Гаўрыла актыўна ўдзельнічаў у працы тэатральнага аддзела. Яны інсцэніравалі паэму "Тарас на Парнасе"[4], ставілі шмат якія п'есы беларускіх аўтараў — Францішка Аляхновіча[5], Уладзіслава Галубка[6], Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча[7] ды інш. У.Галубок, які быў задаволены спектаклямі, нават падараваў на памяць свой фотаздымак з надпісам: "Г.Гарэцкаму — У.Галубок".

---

[1] Хрысцёна — жонка дзядзькі Якава Кузьміча Гарэцкага, брата Івана Кузьміча.

[2] Ганула — Ганна Іванаўна, малодшая сястра братоў Гарэцкіх.

[3] "Наша ніва" — штотыднёвая беларуская грамадска-палітычная, навукова-асветніцкая і літаратурна-мастацкая газета нацыянальна-адраджэнскага кірунку; выдавалася ад 10.11.1906 да 07.08.1915 г. і ад 28.10.1920 да 20.12.1920 г. у Вільні на беларускай мове.

[4] "Тарас на Парнасе" — ананімная сатырычна-гумарыстычная паэма, помнік беларускай літаратуры 19 стагоддзя.

[5] Аляхновіч Францішак (1883-1944) — беларускі драматург і тэатральны дзеяч, публіцыст, празаік.

[6] Галубок Уладзіслаў (1882-1937) - беларускі тэатральны дзеяч, драматург, рэжысёр, акцёр, мастак, першы народны артыст Беларусі (1928).

[7] Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (1808-1884) — паэт, драматург, класік беларускай літаратуры.

Гаўрыла сур'ёзна ставіўся да ведання моваў: ён дасканала авалодаў ня толькі беларускай, але і расейскай, украінскай, польскай і нямецкай. Вывучыў эсперанта, вёў перапіску на ім, а пазней выкладаў у розных гуртках. У 1917 г. ён выпісаў "Курс стэнаграфіі" па сістэме Ф.К.Габельсбергера і самастойна авалодаў ім. Пазней у Горках і Смаленску працаваў стэнаграфістам і ўсё жыццё карыстаўся ў сваёй працы стэнаграфіяй.

Пасля заканчэння вучылішча 20 верасня 1919 года Г.Гарэцкі быў накіраваны ва Уфу ў якасці каморніка-агранома і інструктара-рэвізора па землеўпарадкаванні Уфімскага губземаддзела, але ўжо праз год паступіў на эканамічны факультэт Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі, дзе стварыў Беларускую культурна-навуковую асацыяцыю студэнтаў[1]. На сходзе, прысвечаным першаму году яе працы, ва ўступным слове ён падкрэсліў (матэрыялы выдадзеныя ў Маскве ў 1922 годзе): *"... только перед пустыней культурной опустились его (беларуса — Р.Г.) руки. Опустились бессильно потому, что он оказался "без языка", он онемел при виде небывалого исторического грабежа своих культурных ценностей братьями-славянами, онемел, когда убедился, что и родные сыны его — интеллигенты — покидают свой серый край, чтобы веселее прожить жизнь в "больших городах", насладиться небесами юга, красотами востока, сытостью Сибири, обещаниями и посулами Америки. [...] Гремели много лет громы смерти и ужаса. Они смолкли. А белорус остался у разбитого корыта. Мир кричал о помощи маленькой Бельгии. А об измученной, истерзанной Белоруссии никто не сказал ни слова. Сама же она все еще "без языка". Повторилась наша историческая трагедия: народ не смог стать сам себе хозяином".* Наколькі гэтыя словы, якія зусім малады студэнт сказаў амаль 90 гадоў таму, актуальныя і цяпер! Народ без роднай мовы, без нацыянальнай самасвядомасці не можа быць гаспадаром у сваёй краіне.

Г.Гарэцкі, які марыў пра адраджэнне Беларусі, вельмі цікавіўся праблемай нацыянальных адраджэнняў. У артыкуле "Регрессивность и прогрессивность национальных возрождений" (1922)[2] ён пісаў: *"История XIX века была историей национальных возрождений. Европа пережила ренессанс Чехии, Болгарии, Сербии, Кроатии, Дании,*

---

[1] Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Маскве. Існавала ад 14.11.1920 да вясны 1923 г. Арганізатар і першы старшыня (да лістапада 1922 г.) Г.Гарэцкі, затым Павел Жук. Аб'ядноўвала больш за 200 сяброў. Галоўная мэта — спрыянне культурна-гаспадарчаму адраджэнню Беларусі. Выдала справаздачы за 1921 і 1922 гг., навуковы зборнік-альманах, літаратурна-навуковы альманах "Маладая Беларусь" (1922) ды інш.

[2] Артыкул "Регрессивность и прогрессивность национальных возрождений" упершыню надрукаваны ў часопісе "Младость. Дополнение к журналу" (Москва, 1922); перадрукаваны ў кнізе Гаўрылы Гарэцкага "Выбранае" (Мінск: Беларускі кнігазбор, 2002).

*Ирландии; а от этих стран национальные движения, шествуя с запада на восток, через Польшу, докатилась до Украины, Белоруссии, Литвы... [...] важно обсудить национальную проблему на страницах органа студентов именно Петровки, где среди кружковых организаций есть организации национальные — Украинский кружок, Белорусская культурно-научная ассоциация, Еврейский агрономический кружок, Латышский и др.".*

Далей Г. Гарэцкі падкрэсліў надзвычайнае значэнне роднай мовы ў інтэгральных адраджэннях: *"Безусловно, центральное место занимает язык как главнейший признак нации, наряду с территорией, национальным характером, психологией, бытом, естественными условиями, историческими судьбами и т.д. Язык главным образом придает национальные формы культурным ценностям. Со смертью языка умирает народ, умирает национальная культура".* На пытанне "Каков же идеал будущего?", ён адказвае: *"... всемирная культура более красива, многоколоритна, многоообразна лишь при многонациональном составе ее творцов [...]. Ничем не может быть оправдано запрещение народу говорить на родном языке". [...] "Сомневаться в реальности, обвинять в выдуманности национальные движения в России (например, украинское и белорусское) нет никаких оснований: движения эти стали массовыми, в них принимает участие главный и единственный судья, его Величество — сам народ. Задача возрожденческой белорусской и украинской интеллигенции — стремиться так повлиять на ход движений, чтобы они резонировали с лучшими освободительными социально-политическими идеями XX века".*

Г.Гарэцкі ўважліва вывучаў Украіну, бо бачыў у гісторыі братняй краіны і роднай Беларусі шмат агульнага і таму дбаў пра адраджэнне не толькі беларускага, але і ўкраінскага народа, а як эканаміст часта параўноўваў розныя статыстычныя дадзеныя абедзвюх краін. Так, у артыкуле "На новы шлях" (1922)[1] ён пісаў: *"Ідэі дэмакратызму ўжо ў пачатку XIX стагоддзя выклікалі вызваленьне прыгнечаных народаў. Дэмакратызм ажыццёвіў адраджэньне чэхаў, харватаў, славенцаў, кроатаў, сербаў, балгар. У зьвязку ж з пашырэньнем дэмакратычнага руху стаяць пачаткі ўкраінскага і беларускага адраджэньня".* Падкрэсліўшы, што для новага жыцця, уздыму культуры, палітыкі, эканомікі галоўнае — мова, Гарэцкі ў якасці прыкладу адзначыў: *"Сьпярша зьявіліся чэскія паэты, пісьменьнікі, а тады ўжо вучоныя,*

[1] Артыкул "На новы шлях" упершыню надрукаваны ў навукова-літаратурным зборніку "Маладая Беларусь" (Менск, 1922); перадрукаваны ў кнізе Гаўрылы Гарэцкага "Выбранае" (Мінск: Беларускі кнігазбор, 2002).

*інжынэры, эканамісты, палітыкі; першым запеў Шаўчэнка, а потым ужо загаласілі на ўсе лады "'Украіна, Украіна". З гэтага боку выяўленьне нацыянальнага аблічча народа, пашырэньне нацыянальнае сьвядомасьці ёсьць першы камень у падмуроўку адраджэнцкае працы".*

Гаворачы пра шлях эканамічнага адраджэння, Г.Гарэцкі паказваў важнасць кааперацыі і прыводзіў некаторыя лічбы: *"А між тым беларуская каапэрацыя зусім слабая і пачала разьвівацца толькі ў апошнія дзясяткі гадоў. На Чарнігаўскай Украіне сельскагаспадарчых гурткоў 108, на Палтаўскай — 305, а на Беларусі толькі да 20 на губэрню. [,..] на 1 пазычковы каапэратыў прыходзілася на Чарнігаўшчыне — 107 тысяч насельнікаў, на Палтаўшчыне — 126, на Беларусі — 170 тыс.".*

Пра культурны заняпад Беларусі сведчыла наступнае параўнанне: *"У 1897 годзе ў Прыбалтыцы на 100 дарослых сельскіх жыхароў было пісьменных 96, у цэнтральнай Велікарасіі — 26-39, у Украіне — 15-17, а на Беларусі толькі 12-13 чалавек. [...] у 1910 годзе на 100 гарадзкіх людзей было навучальных устаноў: на Чарнігаўшчыне — 0.9, Палтаўшчыне — 1.2, а на Беларусі ледьве 0.5. [...] выходзячыя ў сьвет газэты і журналы: у гарадох Кіеўскай губэрні іх выходзіла 67, на Харкаўшчыне — 13, на Палтаўшчыне — 12, а ў гарадох Беларусі толькі каля 3 на горад... ".*

Г. Гарэцкі лічыў, што нацыянальнае адраджэнне (у тым ліку і беларускае) павінна быць не толькі культурным і моўным, але і ўсеабдымным, інтэгральным. У тым самым артыкуле ён пісаў: *"У адраджонай эканамічна Беларусі закрасуюць мастацтва, навука, закрасуець беларуская мова. [...] Грамадзянскае, культурные, эканамічнае, дзяржаўнае будаўніцтва паўстае перад беларусамі як вольным народам. Часовыя палітычныя завірухі шыбка мінуцца. Разорванае цела Беларусі зрасьцецца, ажывіцца, і трэба цяпер ужо дбаць аб усебаковай культуры гэтага цела. Мова займе пачэснае, падабаючае ёй месца. А папярэднімі задачамі стануць стварэньне новае гаспадаркі як падмуроўка культурнага рэнэсансу".*

* * *

У ноч з 19 на 20 студзеня 1922 года Максіма Гарэцкага арыштавалі польскія ўлады і кінулі ў адзіночку віленскай турмы Лукішкі. А 31 жніўня гэтага года ў Маскве арыштавалі і пасадзілі ў турму на Лубянцы Гаўрылу Гарэцкага. Ён хоць і быў яшчэ студэнтам, але трапіў у тую групу "прадстаўнікоў вольнадумнай інтэлігенцыі", якую на загад У.І.Леніна пастанавілі выслаць за мяжу, каб "очистить" краіну ад "интеллигентиков, лакеев капитала, мнящих себя мозгом нации: на

деле это не мозг, а говно"[1]. Любімая і вельмі здольная сястра Ганна, якая вучылася ў Зоатэхнічным інстытуце, несла зняволенаму брату перадачу, трапіла пад трамвай і праз тры дні памерла. Трагічны дзень на ўсё жыццё стаў для братоў самым журботным. Максім прысвяціў Ганне "Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век - 1905 год" (Вільня, 1922). "Яе дарагому вобразу, як памятку на магілку на чужыне, гэтую кнігу прысвячаю. Брат". Уладзімір Дубоўка[2], які сябраваў з Гарэцкімі, на зборніку вершаў "Строма" (Вільня, 1923) напісаў: "Светлае памяці Ганулі Гарэцкай, як вяночак на магілку ў чужыне, прысвячаю. Аўтар".

Максім разам з сям'ёй здолеў у канцы 1923 года пераехаць у Менск, дзе працаваў у Інбелкульце[3], а пазней — у Беларускай акадэміі навук, выкладаў беларусазнаўства на рабочым факультэце Беларускага ўніверсітэта, быў загадчыкам кафедры беларускай мовы і літаратуры і дацэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі ў Горках.

Гаўрылу тады ўсё ж не выслалі за мяжу (меркавалі выслаць у Нямеччыну), ён скончыў акадэмію, працаваў выкладчыкам эканамічнай геаграфіі Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду (г. Масква), дацэнтам і загадчыкам кафедры сельскагаспадарчай эканоміі і эканамічнай геаграфіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі (г. Горкі), дырэктарам Беларускага навуковадаследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі імя У.І.Леніна (г. Меыск). У 1925 г. быў абраны членам Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), а ў канцы 1928 г. — правадзейным членам (акадэмікам) — заснавальнікам Беларускай акадэміі навук. Дарэчы, ён стаў адным з самых маладых акадэмікаў за ўвесь час існавання Акадэміі навук Беларусі. На ўрачыстым адкрыцці Беларускай акадэміі навук ён сядзеў на пачэсным месцы — паміж Янкам Купалам і Якубам Коласам. У 1927 г. Г.Гарэцкі — кандыдат, а затым і член Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

Яшчэ ў 1924 г. кіраўнікі Інбелкульта звярнуліся да ўрада БССР з прапановай ператварыць гэты інстытут у Беларускую акадэмію навук. Але дазвол належала атрымаць у Маскве, і ён прыйшоў толькі праз 4 гады. Г.Гарэцкі таксама браў актыўны ўдзел у арганізацыі Беларускай акадэміі навук і нават напісаў адмысловы праект. Адна-

---

[1] Прыведзены вытрымкі з лістоў У.І.Леніна да М.Горкага, Ф.Дзяржынскага і І.Сталіна, узятыя аўтарам нарыса з артыкула «Владимир Ильич Ленин: "Морали в политике нет"» (Комсомольская правда, 1992, 12 лютага).
[2] Дубоўка Уладзімір (1900-1976) - беларускі паэт, празаік, перакладчык.
[3] Інбелкульт (Інстытут беларускай культуры) - першая ў найноўшай гісторыі Беларусі шматгаліновая навуковадаследчая ўстанова (1922-1928), затым ператвораная ў Беларускую акадэмію навук.

часова тады ж распачаліся захады для арганізацыі ўстановы ў галіне даследчай справы па сельскай гаспадарцы. У Расеі меркавалі стварыць Усесаюзную акадэмію сельскай гаспадаркі (прычым яна мелася быць размешчаная амаль выключна ў Ленінградзе і Маскве), зусім не кранаючы нацыянальных рэспублік, як УССР, БССР ды інш. У супрацьвагу гэтай ідэі ўкраінскія і беларускія даследчыкі (Яната і Смоліч[1]) вылучылі праект арганізацыі нацыянальных рэспубліканскіх акадэмій сельскай гаспадаркі. Г. Гарэцкі падтрымаў гэтую думку і дапамагаў вядомаму беларускаму эканамісту і грамадскаму дзеячу Аркадзю Смолічу наладзіць кантакт з Янатай. Ён у канцы 1926 г. нават наведаў Янату ў Харкаве і прывёз ад яго праект арганізацыі Усеўкраінскай акадэміі сельскай гаспадаркі імя Леніна.

У 1928 г. Гарэцкі зноў наведаў Харкаў, дзе ўдзельнічаў ва Усесаюзным з'ездзе наркамаў земляробства, а затым пазнаёміўся з Харкаўскай абласной доследнай станцыяй.

У манаграфіі "Народны прыбытак Беларусі" (1926), у якой яскрава паказаны гаспадарчыя асаблівасці краіны, Г.Гарэцкі часта ў якасці параўнання карыстаўся разнастайнымі лічбамі па розных кірунках народнай гаспадаркі Украіны.

У 1928 г. з друку выйшла манаграфія Г. Гарэцкага "Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (Нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)", у якой аўтар на базе вялікага статыстычнага матэрыялу па дэмаграфіі і ўсіх перапісаў насельніцтва аб'ектыўна развязаў пытанне пра нацыянальна-этнаграфічную мяжу Заходняй Беларусі (як і Заходняя Украіна, яна ўваходзіла тады ў склад Польшчы). Матэрыял па Украіне асабліва шырока выкарыстоўваўся пры правядзенні паўднёвай мяжы Беларусі з Украінай.

Яшчэ пры канцы 1927 г. XV з'езд ВКП(б) абраў курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі і "наступ сацыялізма па ўсяму фронту". На наступны год узрасла барацьба супраць усякіх праяваў "антикоммунистических идеологий и немарксистских уклонов", "буржуазной нацдемовщины" і г.д. 1929 г. — год "великого перелома", супольнай калектывізацыі, новай "чистки" партыі пад знакам барацьбы супраць трацкістаў, правых апартуністаў, буржуазных нацыяналістаў і г.д. Гэта быў год пераходу да дзікіх таталітарных метадаў кіраўніцтва краінай, калі, па словах Сталіна, "репрессии в области социалистического строительства являются необходимым элементом на-

[1] Яната — украінскі эканаміст, нацыянал-дэмакрат. Смоліч Аркадзь Антонавіч (1891-1938) — дзеяч беларускага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, прафесар, вучоны ў галіне эканомікі сельскай гаспадаркі, картаграфіі, геаграфіі.

ступления". Неабсяжны Савецкі Саюз паступова ператвараўся ў вялізарны "архіпелаг ГУЛаг".

Незадаволенасць выклікала і новастворанaя Беларуская акадэмія навук, якая здавалася занадта нацыянальнай. З Масквы прагучаў сігнал супраць "нацдэмаў" у выглядзе шэрагу артыкулаў, якія надрукавала газета "Комсомольская правда". Яны мелі выразныя назвы: "Тени прошлого", "Призрак Столыпина в стенах Наркомзема", "Любимая мозоль национал-демократов", "С камнем за пазухой", "Под прикрытием национальных особенностей", "Кулацкая политика под советским флагом. Тайное стало явным", "Новая национал-демократическая вылазка" і г.д. У гэтых артыкулах крытыкавалася дзейнасць новых акадэмікаў З. Жылуновіча[1], Я. Лёсіка[2], С. Некрашэвіча[3], У. Пічэты[4], Г. Гарэцкага, наркама асветы А. Баліцкага[5], "бывшего белогвардейца" В. Ластоўскага[6], "бывшего деникинца" І. Замоціна[7], а таксама М. Гарэцкага, І. Цвікевіча[8] ды інш.

Ужо ў канцы 1929 г. знялі з пасады і выключылі з партыі А. Баліцкага, наркама асветы, вызвалілі ад абавязкаў віцэ-прэзідэнта Беларускай акадэміі навук С. Некрашэвіча і неадменнага сакратара акадэміі В. Ластоўскага. У верасні выключылі з Беларускай акадэміі навук М. Дурнаво[9], а ў пачатку 1930 г. — М. Яворскага[10] (Украіна), якога аб'явілі авантурыстам і немарксісцкім гісторыкам і арыштавалі у сувязі з сфабрыкаваным працэсам "Спілкі визволення України".

У 1930 г. па інспіраваных АДПУ справах "Саюз вызвалення Беларусі (СВБ)" і "Беларускі філіял Працоўнай сялянскай партыі (ПСП)" былі асуджаны вялікія групы беларускай інтэлігенцыі: па першай справе — 86, па другой — 59 чалавек. Праз год па справе "СВБ" чатыры чалавекі без суда былі пазбаўленыя волі тэрмінам на 10 гадоў,

---

[1] Жылуновіч Зміцер, псеўданім Гартны Цішка (1887-1937) - беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), старшыня Часовага рэвалюцыйнага ўрада Савецкай Беларусі (1919).

[2] Лёсік Язэп (1883-1940) - беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, мовазнавец, пісьменнік, педагог, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), дзядзька Якуба Коласа.

[3] Некрашэвіч Сцяпан (1883-1937) — беларускі мовазнавец, грамадскі дзеяч, старшыня Інбелкульта, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928).

[4] Пічэта Уладзімір (1878-1947) - беларускі гісторык-славіст, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), акадэмік АН СССР (1946), доктар навук, заслужаны прафесар Беларускай рэспублікі (1926), першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921).

[5] Баліцкі Антон (1891-1937) - дзяржаўны дзеяч БССР, наркам асветы, правадзейны член Інбелкульта.

[6] Ластоўскі Вацлаў (1883-1938) - беларускі грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, філолаг, этнограф, публіцыст, пісьменнік, літаратуразнавец, член-карэспандэнт Украінскай акадэміі грамадазнаўства ў Празе (1926), акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928).

[7] Замоцін Іван (1873-1942) — расейскі і беларускі літаратуразнавец, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), член-карэспандэнт АН СССР (1929), доктар філалагічных навук (1934).

[8] Цвікевіч Іван (1891-1938) — беларускі дзеяч навукі і культуры, правадзейны член Інбелкульта, малодшы брат Аляксандра Цвікевіча — беларускага палітычнага дзеяча, гісторыка, філосафа, публіцыста.

[9] Дурнаво Мікалай (1876-1937) — філолаг-славіст і педагог, член-карэспандэнт АН СССР (1924), акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), прафесар.

[10] Яворскі Мацвей (1884-1937) — гісторык, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), акадэмік Усеўкраінскай акадэміі навук (1929), доктар палітычных навук (1910), доктар гісторыі культуры (1929), прафесар.

астатніх засудзілі на 5 гадоў высылкі ці канцлагераў, па справе "ПСП" шэсць чалавек прысудзілі да расстрэлу (чатыром замянілі на 10 гадоў зняволення ў канцлагеры), 13 чалавек — да 10 гадоў, астатніх — да меншых тэрмінаў адбыцця пакарання ў лагерах ці ў высылцы.

З Беларускай акадэміі навук у ліку асуджаных па гэтых справах апынуліся 30 вучоных, што склала амаль 1/3 усяго складу акадэміі, дзе ў той час налічвалася 100 супрацоўнікаў. Тадысама СНК БССР прыняў пастанову: "в связи с установлением вредной деятельности группы академиков Белорусской академии наук, деятельность которых была направлена против диктатуры пролетариата и на срыв успешного социалистического строительства, Совет Народных Комиссаров БССР постановляет исключить из состава Белорусской Академии наук академиков В. Ю. Ластовского, В. И. Пичету, Я. Ю. Лёсика, С. М. Некрашевича, Г. И. Горецкого, А. Д. Дубаха[1], лишив их звания академиков, как врагов пролетарской диктатуры". Гэтую пастанову прынялі яшчэ да рашэння пазасудовага органа АДПУ і таму яна тым больш з'яўлялася незаконнай.

Сярод асуджаных былі Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Гаўрылу інкрымінавалі артыкулы 58-6 (шпіянаж), 58-7 (падрыў дзяржаўнай прамысловасці, транспарту, гандлю, грашовага абарачэння, кааперацыі), 58-11 (арганізаваная антысавецкая дзейнасць ці ўдзел у антысавецкай арганізацыі) і прысудзілі да расстрэлу, а пазней змянілі гэтае пакаранне зняволеннем у канцлагер тэрмінам на 10 гадоў. Яго накіравалі на Салаўкі, але затым ён трапіў на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала (ББК) ў Карэлію і на Кольскую паўвыспу. Максім Гарэцкі асуджаны на 5 гадоў высылкі ў г. Вятку (Кіраў).

Тым часам Янку Купалу, якога АДПУ хацела паставіць на чале СВБ, усё ж не арыштавалі, але бясконца цягалі на допыты ў ДПУ. Пратэстуючы супраць нечуванага цкавання і мардавання беларускай інтэлектуальнай эліты, паэт у канцы лістапада 1930 г. пайшоў на самагубства (зрабіў сабе харакіры), але цудам застаўся жывы. 4 лютага 1931 г. закончыў самагубствам першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук Усевалад Ігнатоўскі[2]. Магчыма, што гэтыя акты самагубства найбольш выдатных дзеячоў Беларусі вымусілі бальшавікоў не праводзіць адкрытага судовага працэсу па справах СВБ і ПСП, як меркавалі спачатку зрабіць паводле гатовага сцэнара, адпрацаванага ва Украіне. Там ад 9 сакавіка да 17 красавіка 1930 г. такі адкрыты

---

[1] Дубах Аляксандр (1883-1942) — беларускі вучоны ў галіне меліярацыі і гідралогіі, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), прафесар (1921), доктар сельскагаспадарчых навук (1926).

[2] Ігнатоўскі Усевалад (1881-1931) - беларускі гісторык, грамадскі і палітычны дзеяч, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), прафесар, прэзідэнт Інбелкульта (з 1927), першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук.

судовы "спектакль" быў наладжаны ў Харкаве, дзе судзілі 45 дзеячоў нацыянальнай культуры і навукі, якія нібыта ўваходзілі ў "Спілкі визволення України".

Калі Гаўрыла Гарэцкі сядзеў у менскай турме, дзе спачатку дазвалялася чытаць кнігі і газеты, ён, быццам прадчуваючы, што яму лёсам наканавана стаць геолагам, папрасіў прынесці кнігі вядомага ўкраінскага геолага, акадэміка Украінскай, а затым і Беларускай акадэміі навук П.А.Туткоўскага "Геологический очерк Минской губернии" (Киев, 1915) і "Геологические исследования на территории бывшей Минской губернии" (Витебск, 1925).

Жонка Г. Гарэцкага Ларыса Восіпаўна Парфяновіч-Гарэцкая апынулася ў вельмі цяжкім становішчы: засталася адна з двума сынамі — 6-гадовым Усяславам і паўтарагадовым Радзімам, з працы звольнілі, з службовай кватэры выселілі, амаль усе былыя "сябры" і знаёмыя адвярнуліся. З цяжкасцю атрымала месца на доследнай сельскагаспадарчай станцыі Брылёва пад Гомелем. Наступным летам старэйшага сына адправіла ў Малую Багацькаўку (да мужавых бацькоў), а малодшага з сваёй маці Марыяй Міхайлаўнай — да бацькі Восіпа Іванавіча на станцыю Мокрая (каля Запарожжа), дзе той працаваў начальнікам чыгуначнага вакзала.

Мокрая — дробны паўстанак, там нават крамы не было, а ў ларочку прадавалі толькі хлеб. Таму бабуля мусіла ездзіць па харчы ў Запарожжа. А дзе падзець малога? Дзед жа на працы... У службовым пакойчыку, дзе мы туліліся недалёка ад вакзала, быў шырокі падваконнік. Бабуля садзіла мяне на яго, абкручвала markrознымі коўдрамі і загадвала, каб ціха сядзеў і не дужа круціўся, бо можна зваліцца. Часта давала лупіць вараную бульбу. І вось я гадзінамі мадзеў на гэтым падваконніку - нават часам і ў мокрых штоніках, баючыся паварухнуцца, каб не зваліцца. Лупіў бульбу, глядзеў у вакно, як рухаюцца сюды-туды паравозы, цягнікі. Гэта сталася для мяне добрай выпрацоўкаю дысцыпліны, цярплівасці і ўпартасці, што гэтак спатрэбілася ў жыцці. Так я ўпершыню пазнаёміўся з Украінай, але сэрцам і розумам яшчэ не адчуў яе.

* * *

У Карэліі Г. Гарэцкаму досыць хутка ўдалося паступіць на працу ў Геалагічны аддзел будаўніцтва ББК і самавукам стаць інжынерам-геолагам, атрымаўшы зусім новую спецыяльнасць. Тут ён займаўся інжынерна-геалагічнымі вышуканнямі пад Ніжне- і Верхне-Туломскую ГЭС, Кольскі канал ды іншыя "будоўлі сацыялізму".

У 1933 г. у Мядзведжай Гары Г. Гарэцкі пазнаёміўся з Пятром Мікалаевічам Чырвінскім, выдатным геолагам-энцыклапедыстам, выпускніком Кіеўскага ўніверсітэта, прафесарам Данскога політэхнічнага інстытута, сынам вядомага вучонага-заатэхніка, прафесара сельскагаспадарчага факультэта Кіеўскага політэхнічнага інстытута. Дарэчы, яго брат Уладзімір Мікалаевіч стаў вядомым украінскім геолагам, а пляменніца Марына Уладзіміраўна — выдатным украінскім геафізікам, Героем Сацыялістычнай працы. Пётр Мікалаевіч таксама быў высланы і працаваў у Хібінагорскім камбінаце. Ён зрабіў вялікі ўплыў на станаўленне Г. Гарэцкага як геолага. Яны шчыра пасябравалі і зноў сустрэліся пасля Другой сусветнай вайны ў Пермі, дзе Чырвінскі працаваў прафесарам універсітэта. Але ўвесь час рэгулярна перапісваліся, абмеркоўвалі розныя геалагічныя праблемы, раіліся. Нездарма сваю трэцюю манаграфію аб прарэках "Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра" (1970) Г. Гарэцкі прысвяціў яму: "Светлой памяти выдающегося советского ученого-энциклопедиста Петра Николаевича Чирвинского — наставника, друга и вдохновителя — посвящаю." У 1967 г. Гарэцкі напісаў артыкул "Воспоминания о П. Н. Чирвинском", які быў надрукаваны ўжо пасля яго смерці ў беларускім часопісе "Літасфера" (2003).

У 1934 г. майго тату датэрмінова вызвалілі, але кагэгарычна "параілі" працаваць на тым самым месцы і нікуды не пераязджаць. Тата толькі змог перавезці да сябе ў пас. Мядзведжую Гару нашу сям'ю.

Максім Гарэцкі таксама ўжо адбыў тэрмін высылкі ў Вятцы (ад 1934 г. — Кіраў). Гаўрыла напісаў братавай, Леаніле Чарняўскай-Гарэцкай, ліст з парадай пераехаць на Украіну ў горад Нікапаль, які яму вельмі хваліў Сяргей Восіпавіч Парфяновіч (родны брат Ларысы), што жыў тады ў Запарожжы. Ліст Гаўрылы:

*"24.VIII.35г. Кола[1].*
*Дарагая Лёля!*
*Пішу ліст у дагонку, каб параіць Вам паехаць у гор. Нікаполь і гэта недалёка ад Запарожжа, у 75 км і недалёка ад Крывога Рога. Там будуецца вялікая ГЭС, амаль як Днепрабуд, будуюцца і камбінаты. Шмат, шмат садоў; прыгожы Дняпро, добры клімат. І горад гэты не рыжымны. Патрабуецца там шмат спецыялістаў, асабліва па будаўніцтву. Дык ніхай бы Вы паехалі ў Нікапаль. 5.IX у Запарожжа вернецца Сяргей, брат Лары — ніхай Максім зьверніцца да іх. Цалую Вас усіх, вітаю, бывайце бадзёры.*

*Ваш Гурык[2]"*

---

[1] Кола — пасёлак недалёка ад г. Мурманска на Кольскім паўвостраве.
[2] Маці Гарэцкіх, а за ёй і ўся сям'я называлі Гаўрылу “Гурыкам”, таму і ён так падпісваў свае лісты да родных.

Максім прагнуў быць як мага бліжэй да Беларусі і таму выбраў пас. Пясочня (пазней таксама г. Кіраў) Заходняй (потым Смаленскай, а цяпер Калужскай) вобласці, дзе працаваў настаўнікам расейскай мовы і літаратуры. У кастрычніку 1936 г. Гаўрыла і Ларыса на свята здолелі наведаць Максіма. Радасць сустрэчы запаланіла душы братоў і родных. Але з ёй суседзіў сум ад нядаўняй (сакавік 1935 г.) смерці маці, на пахаванне якой ні Максіма, ні Гаўрылу не адпусцілі, дый перспектыва не выклікала аптымізму. І нездарма: браты бачыліся апошні раз...

Наступіў сумнавядомы 1937 год — год найбольшага разгулу сталінскіх рэпрэсій. Дабівалі "не дабітых" у мінулыя гады "ворагаў народу". У канцы кастрычніка 1937 г. "чорны воран" забраў тату, а ў ноч з 3 на 4 лістапада арыштавалі Максіма. У пачатку снежня Гаўрылу вызвалілі (хоць перад гэтым зноў прысудзілі да вышэйшай меры пакарання), а Максіма 21 снежня перавялі ў турму Вязьмы і праз 15 дзён, 5 студзеня 1938 г., адбылося пасяджэнне "тройкі" Кіраўскага аддзялення НКУС, якая пастанавіла: “Горецкого Максима Ивановича расстрелять". 10 лютага прысуд выканалі. Аб гэтым склалі пратакол: "(Совершенно секретно). Перечисленные осужденные, всего в числе сорока человек, из места содержания под стражей были взяты в 14 часов 45 минут 10-го февраля 1938 года, а решение Заседания Тройки проведено в исполнение путем расстрела в 15 часов того же 10-го февраля 1938 г. Трупы зарыты на установленную глубину, о чем и составлен настоящий акт в одном экземпляре". За 15 хвілін расстралялі і закапалі на "адпаведную глыбіню" 40 чалавек! Мой дзядзька не дажыў да свайго 45-годдзя васьмі дзён.

Пасля арышту таты мая маці зноў страціла працу і службовую кватэру. Яна вырашыла адаслаць бабулю са мной у Запарожжа, да роднага брата Сяргея Восіпавіча, які працаваў майстрам-брыгадзірам на авіяцыйным заводзе і жыў з жонкай Тусяй (Эстэр Зіноўеўнай Валавік) і дачкой Інай. Так я зноў трапіў на Украіну, пражыў там амаль год і вучыўся ў 2-м класе.

Увосень 1937 г. план па выкарчоўванні "ворагаў народа" быў спушчаны і на Запарожскі авіяцыйны завод. Ноччу прыехаў "чорны воран", прыйшлі тры вайскоўцы, пачалі рабіцьператрус. Я і мая стрыечная сястра Іначка, маладзейшая за мяне на 4 гады, нічога не разумелі, што адбываецца. Нам стала весела, што нас пабудзілі сярод ночы, зрабілі ў хаце гармідар. Мы скакалі і смяяліся. Калі адзін з вайскоўцаў, закончваючы вобшук, спытаўся: "А хто яшчэ ў вас ёсць?", я адказаў: "У нас ёсць Баранэсачка!" (так мы жартам звалі Іначку). Ён насупіўся, і энкавэдысты з яшчэ большай зацятасцю прадоўжылі по-

шукі. Дзядзьку Сяргея забралі. Бабуля і Туся, якая была цяжарнай прыблізна на шостым месяцы, ушчэнт разгубленыя, пасля адыходу начных "гасцей" заплакалі. Вось тут і мы, малыя, зразумелі, што здарылася вялікая бяда, і прыціхлі. Цікава, што наш сусед — рабочы таго самага завода, па якога ў тую ноч таксама прыязджалі, выскачыў у вакно і ўцёк. Ён хаваўся каля месяца, а потым прыйшоў на працу, і яго не забралі, бо, як казалі, ужо выканалі план па колькасці неабходных "ворагаў народа" на заводзе.

У апошні дзень года ў сям'і Парфяновічаў нарадзіўся сын, якога ў гонар асуджанага назвалі Сяргеем. Бацька і сын так і не пабачылі адзін аднаго. Пасля вайны прыслалі пасведчанне аб смерці — хлусню пра тое, што Сяргей Парфяновіч памёр ад хваробы лёгкіх у 1940 г. і толькі пасля смерці Сталіна даведаліся праўду: Сяргея Восіпавіча расстралялі ў канцы снежня 1937 г., амаль у той час, калі нарадзіўся ягоны сын.

Маё кароткае знаходжанне ў Запарожжы пакінула не толькі жудасны ўспамін пра арышт майго дарагога дзядзі Сяргея, але і тое, што ў размове я дагэтуль кажу не беларускае "што", а ўкраінскае "шо".

Як найбольш зламыснага і небяспечнага "ворага народа" ("шпіёна і контррэвалюцыянера", што завербаваў кіраўнікоў БССР Чарвякова[1] і Галадзеда[2]) Г. Гарэцкага адаслалі на допыт у Маскву. А ў гэты час з 27 кастрычніка да 4 лістапада 1937 г. ва ўрочышчы Сандармох (карэльскія Курапаты пад Мядзведжай Гарой) расстралялі 1111 зняволеных, сярод якіх былі 102 беларусы, а таксама правадзейныя члены Беларускай акадэміі навук М. Дурнаво і М. Яворскі. Калі б Гарэцкага не забралі ў Маскву, ён хутчэй за ўсё апынуўся б у іх ліку.

Сітуацыя паўтарылася на наступны год, калі бацька ад 8 траўня 1938 да 22 чэрвеня 1939 г. больш за год праседзеў у сталінскіх казематах, спазнаўшы голад і катаванні, карцар і здзекі. Дайшоў да таго, што хацеў з дапамогай ляза скончыць жыццё самагубствам, але прыродная жыццястойкасць зберагла... Зноў яго адправілі ў маскоўскую Бутырку, а тым часам некалькі тысяч (агулам больш за 9 тысяч) зняволеных расстралялі і закапалі ў "жоўты пясочак" Сандармоху.

* * *

Г. Гарэцкі працягваў працаваць у сістэме Гідрапраекта НКУС (пазней МУС) у якасці старшага, галоўнага геолага розных экспе-

---

[1] Чарвякоў Аляксандр (1892-1937) — дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі і СССР, старшыня ЦВК БССР, член ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б.

[2] Галадзед Мікалай (1894-1937) — дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, старшыня СНК БССР, кандыдат у члены ЦК ВКП(б) і член Бюро ЦК КП(б)Б.

дыцый па інжынерна-геалагічных вышуканнях пад будаўніцтва на рэках Мета і Чусавая, у час вайны пад ваенна-палявое будаўніцтва ў Ленінградскай, Калінінскай, Валагодскай абласцях, а затым — на Волзе, Каме, Доне, Дняпры і інш. У 1945 г. у Геалагічным інстытуце АН СССР (Масква) ён абараняў кандыдацкую дысертацыю, а Вучоны савет прагаласаваў за прысуджэнне не толькі кандыдацкай, але і доктарскай навуковай ступені. На жаль, ВАК не зацвердзіў апошняй, бо не было трэцяга апанента. Тады Гарэцкі праз год абараніў тамсама доктарскую дысертацыю. У 50-х і 60-х гадах Гарэцкі быў прызначаны намеснікам начальніка Аддзела геалагічных вышуканняў, галоўным геолагам экспедыцыі № 8 (станіца Раманаўская Растоўскай вобласці), а затым галоўным геолагам паўднёвых аб'ектаў і галоўным спецыялістам Гідрапраекта. Яму давялося займацца шмат якімі гідратэхнічнымі будоўлямі таго часу: Волга-Донскі, Сальскі, Азоўскі і Пралетарскі каналы, Горкаўская, Цымлянская, Ніжнекамская, Кіеўская, Чэбаксарская, Кахоўская, Саратаўская гідраэлектрастанцыі, Дона-Сальскі (Мартынаўскі) тунэль, Сарпінская абвадняльная і арашальная сістэмы, Чаграйскае водасховішча, канал Днепр — Крывы Рог, схема выкарыстання Кубані, шлюзавая сістэма Кубань — Калаўская і нізавіны Дона, Чарнаморска-Балтыйскі глыбокаводны шлях, Ніжне-Прыпяцкі гідравузел ды іншае. У гэты час Г. Гарэцкі часта наведваў пералічаныя будоўлі, у тым ліку і тыя, што былі на тэрыторыі Украіны ці паблізу яе. Тады ён пазнаёміўся і пасябраваў з многімі ўкраінскімі геолагамі, вышукальнікамі, вучонымі. У сваіх шматлікіх лістах да жонкі, сыноў, родных ён дзяліўся сваімі ўражаннямі пра вандроўкі і працу.

Г. Гарэцкі вельмі ўважліва, далікатна ставіўся да мовы і таму з расейцамі размаўляў на чыстай расейскай мове, з украінцамі — на ўкраінскай, з палякамі — на польскай, з немцамі — на нямецкай, а ў Беларусі з усімі яе грамадзянамі незалежна ад іх нацыянальнасці — толькі па-беларуску. Ён вельмі тонка адчуваў асаблівасці беларускай мовы (дый іншых славянскіх моваў), што дазваляла яму адразу вызначыць, з якой мясцовасці Беларусі паходзіць яго суразмоўца. Беларуская мова Гаўрылы Гарэцкага была нагэтулькі прыгожай і выразнай, што многія, хто ведаў і чуў вучонага, да гэтага часу з вялікай павагай і прыемнасцю ўспамінаюць яго і адзначаюць яскравыя, цудоўныя па вымаўленні яго размовы, выступленні і даклады.

Г. Гарэцкі быў вельмі блізкі да літаратуры, любіў яе, многа чытаў і тонка яе адчуваў. Ён надрукаваў цікавую працу "Горкі і беларускі фальклор" (Полымя, 1966), а затым шэраг нарысаў і ўспамінаў пра беларускіх пісьменнікаў — Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Дубоўку ды іншых.

У лісце ад 30 студзеня 1947 г. да маёй маці з Масквы, дзе ён наведаў жонку Янкі Купалы Уладзіславу Францаўну, Гарэцкі пісаў: *"[...] Дала мне прачытаць верш М.Рыльскага — вельмі чулы і прыгожы, дзе ён раўнуе Купалу з Шаўчэнка, адзначае, як граніў Купала беларускае слова, як застаецца ён на вякі вобразам крылатай Беларусі".*

У канцы траўня 1951 г. Г. Гарэцкага ўключылі ў групу, якой належала прасачыць, як ідуць інжынерна-геалагічныя вышуканні пад Паўднёва-Украінскі і Паўночна-Крымскі каналы. Вандроўка мела заняць некалькі тыдняў. У лісце да жонкі ад 21 траўня 1951 г. з Масквы ён пісаў: *"[...] Рад я вельмі, што мары мае зьдзясьняюцца і давядзецца мне пабачыць красу Украіны, пазнаёміцца з яе геалогіяй, Акадэміяй навук, з будаўнікамі і вышукальнікамі. Пабачу Керч, клясычныя абгаленні тэрас, морскія адклады. А мо і крамяньчыкі трапіцца адшукаць..."*

І вось з Кіева карталюшка ад 28 траўня: *"[...] ужо другі дзень я ў Кіеве. [...] Учора хадзіў у Укр. оперу на "Богдана Хмельніцкага " — вельмі хараша было, высокай культуры дасягнулі ўкраінцы. [...] Хадзіў у Ак. навук да П.П.Ефіменка[1] — ён ужо раней паслаў мне ліст. Пагаманілі, паказалі мне цікавыя рэчы, асабліва ашэль[2] з Дняпра. Быў і ў Ін-це геалогіі, агледзіў музей. Магутная ўсё ж Акадэмія. Падабаецца мне Кіеў, такі ён прыгожы. Але Хрышчацік усё яшчэ не адбудаваны, ёсць руіны ".*

Далей прывяду вытрымкі з некалькіх лістоў таго падарожжа.

*"31.V.51. Прыстань Ламоватае на Дняпры, ніжэй Чэркас. Параход "Кіраў". Дзень. №8[3].*

*Мая дарагая, родная Ларута!*

*На маленькой прыстані Ламоватае будзем доўга стаяць: пагружаюць шмат бульбы. Вось і выпаў мне зручны час пагаманіць з Табою.*

*Калі Ты думаеш, што цікава вандраваць на параходзе па Дняпры аднаму, то памыляешся. Зусім не цікава.*

*Увесь час ліе дождж, асабліва сёньня. Хмары абклалі ўсё неба, вокны заплаканыя, як увосень. Ніякага просьвіту сонейка німа.*

---

[1] Ефіменка Пётр Пятровіч — украінскі археолаг.

[2] Ашэль (па назве мясцовасці на поўначы Францыі Saint-Acheul) — археалагічная культура ранняга палеаліту, якая мае шырокае распаўсюджанне, галоўным чынам у Заходняй Еўропе і Афрыцы.

[3] Г.Гарэцкі, каб ведаць, якія лісты дайшлі да адрасата, а якія - не, нумараваў свае пасланні, прычым у кожным новым падарожжы пачынаў такую нумарацыю спачатку.

*Досыць холодна: мы ўсе апрануты, я ў плашчы і ў капялюшы, — а ўсё ж халаднавата.*

*Я не даспаў удадатак. Бо сёньня а палове 6-й раніцою мы ўжо прачнуліся ў Каневе, каб падзівіцца на стромкія берагі і магілку Шаўчэнкі.*

*Прыгожа ў Каневе. Усё у дрэвах і садах, квітнеюць акацыі. Упершыню ўбачыў праз доўгі час прытульныя ўкраінскія хацінкі, з саламянымі стрэхамі, парослымі зялёным мохам.*

*Магілка Шаўчэнкі, помнік яго выглядаюць з купаў дрэў неяк непрыкметна, скромна. Усе засьцілае будынак музэю паэта, збудаваны тут жа, побач з помнікам. На будынку чырвоны дах, і ўся ўвага прываблівaецца да гэтага даху. Нібы гэта нейкі хутар аднаасобніка.*

*Вось неразумна нехта прыдумаў. Будынак музэю трэба было будаваць унізе, а ня побач з помнікам. Помнік павінен стаяць адзін і прыцягваць да сябе ўсю ўвагу цалкам. Купкі дрэў ля помніка трэба было б разчысьціць...*

*Шукаў на беразе крамяньчыкі і знайшоў адзін палеалітычны адшчэп (аськялёпак) досыць старажытняга выгляду, з багатай патынай. Вельмі рад [...].*

*6.VI. 51. Гор. Токмак. Дзень. № 16.*

*Любая мая Ларута! Калі б Ты ўбачыла мяне зараз, дык пэўна не познала б: я ніколі ня быў такі запылены і гразны, як сёньня. Мой пінжачок ператварыўся ў нейкае шэрае рызьзё.*

*Як паехалі з Запарожжа, я вырашыў сесьці не ў "Победу", а на "бобіка" (гэтак завуць тут наш "вілліс"), каб зрабіць прыемнае геолагу Маляўко (пасадзілі яго ў "Победу"). І ўсю дарогу нас так пыліла, што мы не маглі не сьмяяцца, гледзячы адзін на другога (Оськін, Бабій і я) [...].*

*7.VI.51. Мелітопаль. Раньне. №17.*

*Любая Ларута! Учора ўвечары былі ўжо ў Мелітопалі. Сёньня спытаўся лістоў да патрабаваньня — нічога няма; трошку засмуціўся...*

*Мелітопаль прыгожы, але гразны гарадок, страшэнна разбураны. Шмат тут садоў, гэта — чарэшневы раён. Расьце ўсё тут шчодра, багата. У садах шмат кветак. У садзе нашай гаспадыні квітнее вялізарны куст язьміну — увесь у кветках, бялюсенькі, дурманячы.*

*Даліна рэчкі Малочнай, уздоўж якой мы ехалі, багаты оазіс, усё бурна расьце, і ў полі, і ў садзе. Скрозь камяніцы — дамы былых немцаў; фантануючыя шчыліны з мяккай, але пахучай вадою. Бачылі*

*Каменную магілу — неалітычнае пахаваньне з вялізарнымі камяннымі глыбамі, на якіх выбіты петрогліфы[1] [...].*

*7. VI. 51. Гор. Нагайск. Дзень. № 18.*

*Любая мая Ларута! Сёньня — самы найлепшы дзень падарожы: мы едзем да мора. Скрозь багатыя палеткі, нівы, травы. У адным месцы мы спыніліся, і я паказваў жанчынам-касцам, як трэба касіць. Добры быў з мяне касец.*

*Нагайск — горад маленькі, разбіты, гразнаваты. А вось прыстань на моры і само мора спадабалася нам надзвычайна. Я быў у захапленьні ад гуку мора, ад яго дыханьня, паху, марскіх хваль, прыгожых бялюсенькіх птушак з чорнымі крапінкамі на крылах і вялізарных абгаленьняў. Я адшукаў да дзесятку старажытных костак пліацэнавых[2] [...].*

*7.VI.51. Мелітопаль. Вечар. № 18.*

*Дарагая мая, добрая, ласкавая Ларута! Мілая мая Сольвейг[3], якая ўсе чакае свайго бязпутнага Пер-Гюнта-Гура, а ён бадзяецца ды бадзяецца, шукае нечага, шукае, ды ніяк не знаходзіць, і ўсё нездаволены шукае...*

*Сёньня знаёміўся з геолагамі Малочнай даліны і лімана, бачыў шмат разрэзаў, краявідаў [...].*

*8.VI.51. Мелітопаль. Надвечар. № 19.*

*Дарагая мая Ларута! Толькі што зьвярнуліся з Азоўскага ўзьбярэжжа. [...] Сёньняшняй подорожай я вельмі задаволен. Апрача эстэтычнай уасалоды ад слуханьня гоману мора і наглядуньня яго прастораў, я ўпэўніўся, што рухі земнае паверхні на Азоўшчыне ідуць нераўнамерна і там, дзе мы сёньня былі, наглядаецца не пагружэньне, а ўзьняцьце. Добры стаў у мяне настрой у час падарожы, сыйшоў на душу нейкі супакой, замілаваньне да жыцьця, да людзей, да прыроды. Я гатоў маліцца сёньня велічы існуючага.*

*Цалую Цябе, абыймаю, родных таксама.*

*Твой Гурык.*

---

[1] Петрогліфы (от грэч. pétros — камень iglyphe — разьба, выразанне) — старадаўнія высяканні на сценках пячор, скальных паверхняў, асобных камянях.

[2] Пліяцэн — верхні аддзел (позняя эпоха — ад 5,1 да 2 млн. гадоў таму) неагенавай сістэмы (перыяду) геалагічнага летазлічэння.

[3] Сольвейг, Пер Гюнт — героі драмы нарвежскага драматурга Генры ка Ібсена "Пер Гюнт", да якой нарвежскі кампазітар Эдвард Грыг напісаў музыку, у тым ліку "Песню Сольвейг", якая набыла сусветную вядомасць.

*9.VI.51. Асканіа-Нова. Дзень. № 21.*

*Дарагая, родная, ласкавая Ларута!*

*Сама Асканіа-Нова як бы оазіс у стэпу. Але пад'езды да гэтага оазісу — нешта жудаснае. Скрозь пыл, бедная расьліннасьць, бедныя паселішчы, скупая прырода. Аж смутна зрабілася. Я ўвесь замурзаны...*

*Перад Асканіа-Нова спаткаў нас стэп незачэплены, некрануты, кавыльны. Мы аж супыніліся і пахадзілі па траве, паляжалі на ёй.*

*Асканіа-Нова здалёк вылучаецца купаю дрэў — гэта вялікі парк. Вуліцы скрозь добрыя, тратуары з цэглы. Будынкі нізкія, але зграбныя, адмысловай архітэктуры. На двары Інстытуту гібрыдызацыі і акліматызацыі сквер, квітнеюць платаны, язьмін, каштан — такі прыемны водар. Я сяджу ў цяньку ля фантану і гаманю з Табою. Каля экскурсбюро 7 каменных баб — з цікавасьцю разглядзеў іх. На габінэце заг. сьвінагадоўлі надпіс: "Академик Леонид Кондратьевич Грэбень[1]" [...].*

*10. VI.51. Асканіа-Нова. № 22. Раньне.*

*Любая Ларута! Асканіа-Нова нам вельмі спадабалася. Агледзілі ўчора парк, дэндрарый (усе паліўнае), зоапарк, авечую фэрму (авечкі, выведзеныя Івановым[2]).*

*Надзвычайна ўсё цікава, дзіўны парк. У парку няпужанае дзікае птаства: фазаны, качкі, гусі і інш. У зоапарку жывёла ў загонах, як палонная: зубрабізоны, які, зебра, конь Пржэвальскага і інш. Шмат птушак: буслы, лебедзі, гусі, пава, журавы, папугаі і інш. Авечкі асканыскага заводу вялізарныя, да 11 пудоў вагі, з поўсьцю даўжынёй да 12-15 см, настрыгам да 1½ пуда! Сапраўдны оазіс сярод стэпу. Бачылі і некрануты стэп.*

*Нас добра прымалі. У гасьцініцы мы не толькі адпачылі, але і памыліся ў ванне. Я купаўся нанач і моцна спаў таму. Пад раньне ў парку прыгожа сьпявалі салаўі.*

*Раніцою гаманіў з сястрою Грэбня. І яна ўжо сівая. Помніць асацыяцыю. Жалілася, што апошнія два гады Грэбню працуецца дужа цяжка маральна: грызе яго дырэктар. Але зараз старого дырэктара здымаюць [...].*

---

[1] Грэбень Леанід Кандратавіч — вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, акадэмік, прафесар.

[2] Іваноў Міхаіл Фёдаравіч (1871-1935) — савецкі вучоны ў галіне жывелагадоўлі, прафесар, акадэмік, закончыў Харкаўскі ветэрынарны інстытут; у 1925 г. на яго прапанову ў Аксаніі-Нова створана зоатэхнічная доследная станцыя і племянная станцыя; кіраўнік Аксаніі-Нова. Ларыса і Гаўрыла Гарэцкія вучыліся ў Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі разам з дачкой М.Ф.Іванова.

*10. VI. 51. Поле пад г.Армянскам. Дзень. № 23.*

*Родная мая Ларута!*

*З Асканіі-Нова сёньня паехалі на Сіваш. Краявіды зьмяняюцца, набываюць усё большае падабенства да манычскіх. Бяднее прырода, бяднеюць і людзі. Хаткі амаль такія як на Доне. Але ўраджай сёлета і тут добры; пшанічку ўжо праз тыдні два жаць можна будзе.*

*Спадабалася мне на самым Сівашу. Ёсьць досыць вялікія абгаленьні. Лёсападобныя*[1] *суглінкі з шчылінамі (трэшчынамі) высыханьня, кратавінамі, пахаванымі глебамі зьнікаюць часткова пад ровень мора: тут мясцовасьць сапраўды зьніжаецца, апушчаецца, прагінаецца [...].*

*12.VI.51. Керч. Раньне. № 25.*

*Дарагая, родная Ларута! Учора зрабілі даўгі рэйс на "Пабедзе" ад Джанкою да Керчы. Было хмарна, таму Крымскія горы выглядалі толькі неяснымі сілуэтамі. Заяжджалі на самы Сіваш і ехалі ўсьцяж яго. Палеткі з добрай пшаніцай даходзяць да самага Гнілога мора. Сёлета ў Крыме былі дажджы, ішлі яны і зусім недаўна. Таму ўраджай дзіўны, травы высачэнныя, шмат пырніку, доннiку. Паабапал дарог процьма дзікіх чырвоных макаў і нейкіх сінюсенькіх кветак. Буяе прырода ў Крыме, нават без арашэньня. У 70 км ад Керчы пайшоў дождж і мы ледзьве даехалі: дарогі жудасныя і гразь крымская вельмі ліпучая.*

*Краявіды на Керчанскай паўвыспе чароўныя — даліны шырокія, мяккія, горы-ўзгоркі нявысокія, плаўныя, ласкавыя. Вось тут нават і я б жыў. Каля самой Керчы від маляўнічы — ужо і мора відна і прыгожыя, прыгожыя горы. Нездарма сюды імкнуліся каланісты грэкі да рымляне, вось яно — сэрца былога Баспорскага царства [...].*

*12. VI.51. Керч. Вечар. № 26.*

*Любая мая Ларута! Зноў захацелася пагаманіць з Табою, пачуць Твой голас, Твае звароты, інтанацыі ("я першая"), Твой сьмех, Тваю гульлівасьць, пяшчотнасьць. На пошце лісту, канешне, ня было. А таму я перачытаў (ужо каторы раз!) узноў Твой ліст ад 26.V.51, адчуў Цябе, такую выключную, такую чыстую, такую ласкавую... І мне ўжо не так сумна.*

*Сёньня аглядаў Керчанскі музэй. Колькі тут выключна каштоўных помнікаў, арыгіналаў, — ад усіх народаў, пачынаючы з кіммерый-*

---

[1] Лёсападобныя — ападкавыя пароды, якія нагадваюць лёс (аднародныя, звычайна неслаістыя порыстыя адклады, хутчэй за ўсё эолавага паходжання).

*цаў. Асабліва ўразілі мяне надгробныя помнікі тых часоў, якія заўсёды канчаюцца жалобным словам "хайре" — бывай, прашчай (вось адкуль і татарскае "хайр"). Чамусьці запомніўся помнік адной царэўны: "Ідзікэ, хайрэ"...*

*Аглядаў гару Мітрыдата[1], які з гора атруціўся. На гэтай гары велічны абяліск — помнік абаронцам Керчы. Цяпер ніхто ня жыве на гары. А ў траншэях я бачыў культурныя слаі да 2,5-3,5 м. Магутнасьці!*

*Бачыў сёньня керчанскія зялезныя руды, сабраў іх абразкі і морскія ракавіны, якія іх падсьцілаюць. Зрудзяненьне месцамі ператварыла і ракушкі ў руду — вось цікава.*

*Божа! Колькі тут руін. Цалую, лашчу, абыймаю. Твой Гурык.*

*13.VI.51. Феадосія. Надвечар. № 27. Гасьц. "Асторыя".*

*Дарагая мая Ларута! На сёньняшні дзень я надта спадзяваўся, як на самы для мяне цікавы, бо мы мусілі заехаць на возера Чокрак і Узунлар[2], аб наведаньні якіх я марыў ужо 2 гады...*

*І вось Табе 13... На Чокрак спадарожнікі мае не захацелі заехаць, на Узунлар таксама. Поўнае расчараванне! На Казанцінскім заліве абгаленьняў зусім ня было — скрозь споўзьні. Толькі і сабраў я троху сучаснае морскае фаўны.*

*У дадатак мы зарыліся ў топкія пліацэнавыя пяскі і праседзілі там 3 гадзіны (ледзь выбраліся). А потым пайшоў дождж - і мы ледзь трапілі ў Феадосію. Мне сумна, сумна і злы я на Семянцова[3]: былі побач, за якіх 15-20 км, і не заехалі. Уся прыемнасьць і вартасьць мае падарожы рэзка зьніжаюцца — як зьвязаны і прывязаны я, не геолаг, а вандроўнік, жывы даведнік. Вось як пагана! Але я не здамся — і з яшчэ большай упартасьцю свайго даб'юся!*

*Цалую. Твой Гурык.*

*14.VI.51. Феадосія. Гасьц. "Асторыя". Раньне. №28.*

*Дарагая Ларута! І сёньня ў Крыме дождж — вось як перакруцілася прырода. Шкадаваньне мае па Узунлару і Чокраку мінаецца толькі патроху. Прыдзецца мне з Кахоўкі адмыслова варочацца сюды, выдаткуючы і грошы і час.*

*[...] Феадосія досыць вялікі горад, вельмі мала разбураны. Шмат дрэў унізе, але горы — голыя, бруднаватыя, і гэта псуе ўвесь краявід.*

---

[1] Мітрыдат - (132-63 да н. э.) — цар Пантыйскага царства, куды ўваходзіў Крым.

[2] Чокрак і Узунлар — азёры на Керчанскай паўвыспе, па іх назве вылучаны геалагічныя адклады плейстацэну — чоркакскія і ўзунларскія.

[3] Сяменцоў - геолаг "Гідрапраекта".

*Вялікае мора, зусім спакойнае, як возера-пруд. Мора адлучана ад бульвару чыгункаю і побач з Домам адпачынку, з Галерэяй Айвазоўскага Ты пабачыш паравік і пачуеш прарэзьлівыя гудкі, панюхаеш пах гару — гэта зусім псуе горад [...].*

*14.VI.51. Сімферопаль. Надвечар. №29.*

*Любая Ларута! Падарожа з Феадосіі да Сімферопаля была цікавай, маляўнічай. Дзіўныя краявіды. Буяньне прыроды. Небачаныя ніколі раней палеткі дзікага маку, руж — нешта выключнае, непаўторнае.*

*Спыніліся ў гасьцініцы ля шашы Сімферопаль-Масква, у харошым нумары. Я ўзяў 2 томікі Чэхава — хачу пачытаць, адчуць насалоду ад прыгожага пісьменства. Зараз схаджу у горад — і за чытаньне, піцьцё нэктару.*

*Матар'ялы геалагічныя ў Феадосіі былі надзвычайна цікавымі, новымі, — яны часткова замянілі мне Узунлар і Чокрак. І мне стола так хороша, хороша — я зноў шчасьлівы, нястомны![...]*

*15. VI.51. Сімферопаль. Гасьцініца на аўтамагістралі. Раньне. №30.*

*Дарагая мая Ларута![...] Сімферопаль — зусім не разбураны, цалюсенькі, як і Феадосія: кажуць, немцы сумысьля шкадавалі гарады татар.*

*Гэта — тыповы паўднёвы горад. Шырокія тротуары, абсаджаныя дрэвамі, бульвары, садкі, скверы. Шмат садоў, яблынкі, чарэшні, вішні, грэцкія арэхі, ружы. Увечары на некоторых вуліцах тонкі прыемны водыр.*

*Горад чыставаты, асабліва цэнтральныя вуліцы: Пушкінская, К. Маркса, Чарнышэўскага, Гогаля, Жукоўскага. Па Пушкінскай вуліцы німа ніякага праезду; падвечар і ўвечары народу тут процьма, як у Кіеві на Хрышчаціку. Усе насельніцтва падвечар на вуліцах — гэта стварае зусім асобны калярыт городу.*

*Апрануты жыхары ня кепска і выгляд іх досьць добры. Мова выключна руская. Шмат магазынаў, асабліва вінных. Нідзе я не бачыў столькі віннага продажу, як тут.*

*Новых будынкаўу горадзе мала. Старых вялікіх будынкаў таксама німа — пераважна 2 паверхі, зрэдку 3. Ёсьць с.-г. інстытут, досыць скромны па выгляду будынак. Скромны і Крымскі філіял АН СССР, куды мы сёньня накіруемся. Вялікі будынак абласнога музэю краязнаўства, дзе мы абавязкова пабудзем.*

*(У Феадасійскім музэі краязнаўчым, што месьціцца ў адным будынку з галярэяй Айвазоўскага, мала рэштак палеаліту; найбольш каштоўныя знаходкі зроблены А. Д. Архангельскім[1], — мне было прыемна бачыць гэта).*

*Горад вялікі, раськіданы, зялёны, купчасты. Салгір — зусім малюсенькая рэчка, але даліну вырабіў сабе досыць вялікую.*

*Зьвярнуўшыся ўчора, пачытаў з насалодай Чэхава, але баяўся доўга чытаць пры настольной лампе, бо суседзі ўжо спалі [...].*

*15.VI.51. Сімферопаль. Дзень. №31.*

*Дарагая мая, харошая Ларута! Ад гамонак, ад прагляду матэр'ялаў, ад экспанатаў вялізарнага Крымскага музэю шмат добрых уражаньняў.*

*Канешне, каб не сьпяшацца, можна было б праведаць яшчэ больш і лепш. Але галоўнае зроблена [...]*

*16.VI.51. Джанкой. Раньне. У страўні. № 33.*

*Дарагая Ларута!*

*Сядзімо ў страўні перад выездам на Херсон. Мае спадарожнікі пайшлі на рынак, купляць абы-што на дарогу. А я тым часам пагаманю з Табою. Наглядаў у прыгарадзе Джанкою, як укараняюцца людзі ў жыцьцё. Хаткі такія ж, як у данскім і сальскім стэпу, глінабітна-саманныя, нізенькія, з прысадзістай земляной страхою, маленькімі вокнамі, беленькія ўсе, акуратныя. Шмат кветак, невялічкіх садкоў, абгарожаных усякім ламаччам. Дрэвы ўсе сухастойкія: акацыі, кляны — усё гэта маленькое, прыземістае — мала вады, вада такая салёная, што ад паліваньня дрэвы сохнуць. Людзі аздабляюць жыцьцё, чым могуць, — але беднае яно тут, вельмі беднае. Вось галубкоў разводзюць, пушчаюць іх у паветра лятаць. Ну, прыйшлі нашы.*

*Бывай, мая родная, дарагая, харошая. Беражы сябе і ўсіх сваіх родных. Цалую. Твой Гурык.*

*17.VI.51. Брылеўская дасьледчая станцыя па арашэньню. Раньне. № 34.*

*Дарагая мая, любая Ларута! Па дарозе з Джанкою мы зноў заехалі ў Перакоп, і я атрымаў Тваю карталюшку № 10. Вось дзякуй*

---

[1] Архангельскі Андрэй Дзмітрыевіч (1879-1940) - геолаг, акадэмік АН СССР (1929), прафесар (1918), дырэктар Геалагічнага інстытута АН СССР.

*Табе, мая Ларутанька — вось добра мець ліст ад роднай у далёкой дарозе.*

*Былі ў дзьвюх геалагічных партыях і а другой палове дня спыніліся на дасьледчай станцыі, дзе і начавалі.*

*[...] У захапленьні мы ўсе ад дасьледчай станцыі, ад яе працаўнікоў, так палка адданых сваёй працы і маючых такія скромныя ўмовы жыцьця. Цікавага тут надзвычайна шмат: уплыў арашэньня на збожжа, травы і інш. выключна вялікі. Ну, дык бывай, мая ласкавая, любая. Цалую Вас усіх, абыймаю. Хутка едзем на Кахоўку. Твой Гурык.*

*18.VI.51. Кахоўка. Панядзелак. Раньне. № 35.*

*Дарагая, любая Ларутаа! Учора выйшаў у нас прымусовы выхадны дзень. Адпачылі добра. Пахадзілі па Кахоўцы, вясковы характар якой усё яшчэ пераважае. Трапілі ў украінскую навальніцу, з перунамі, грымотамі, бліскавіцай, моцным дажджом. Дыхалі бальзамічнае паветра. Слухалі мілагучныя ўкраінскія песьні. Бачылі процьму гулякаў (учора ж была Троіца Духа). Я аглядаў тутэйшыя лёссы, пяскі над імі, понт і сармат[1] (вапнякі), шукаў краменьчыкаў (не знайшоў нічога — не шанцуе)...*

*Моцна спалі і вось зараз пачынаем працоўны дзень: сёньня высятліцца, дзе тут быў Пра-Днепр і ці быў ён. Вельмі цікава. Цалую ўсіх Вас, абыймаю. Твой Гурык.*

*21.VI.51. Херсон. Раньне. № 42.*

*Дарагая мая, родная Ларута! Учора адбылася гамонка з С.Я.[2]. Ты праўду прадбачыла — мне трэба ехаць у Маскву. Будзем там дзён праз 8-9, — ворочаемся праз Запарожжа, Кіеў. Буду рад мець ад Цябе вестку на М., 64, да патрабаваньня.*

*Учора бачыў шмат цікавага для гісторыі Чорнага мора — вельмі рад. Херсон спадабаўся. Асабліва прыгожа ля Дняпра, з шырокім зялёным левым берагам, пляжам, далямі [...]*

*21.VI.51. Пас. Сьнегірова на р. Інгулец. Дзень. № 43.*

*Дарагая Ларута! Заехалі ў Херсон на кірмаш. І аж зьдзівіліся. Тут было столькі гародніны, абрыкосаў, груш, яблык, вішань,*

---

[1] Понт і сармат — геолага-стратыграфічныя падраздзяленні: понт — ніжні ярус ніжняга пліяцэну, сармат - ніжні ярус верхняга міяцэну.

[2] Жук Сяргей Якаўлевіч (1892-1957) - вучоны ў галіне гідратэхнікі, адзін з заснавальнікаў школы савецкіх гідратэхнікаў; акадэмік АН СССР (1953), генерал-маёр інжынерна-тэхнічнай службы (1943), Герой Сацыялістычнай Працы (1952), дырэктар інстытута "Гідрапраект".

*чарэшань, як некалі ў даўныя гады ў Запарожжы! Аж радасна зрабілася ад такой заможнасьці Херсоншчыны. Мы, канешне, усяго насмакаваліся.*

*Краявіды цікавыя, спачатку ўсё былі балкі, а потым пайшла раўнядзь водападзелу з добрымі глебамі, безкрайнімі засевамі, рэдкімі, але вялікімі сёламі. Ураджай вельмі добры. Пачалі абы-дзе ўжо ўборку, але малавата відаць камбайнаў. А ўсё дасьпявае. Каб толькі ўсё добра сабралі збожжа — вось было б багацьце [...].*

*23.VI.51. Нікаполь. Раньне. № 45.*

*Любая, дарагая Ларута! Цяпер я разумею, чаму Сяргейка так любіў Нікаполь: нельга не захапляцца гэтым найпрыгажэйшым городам Украіны. Тут усё ласкавае, зграбнае. І затока Дняпра, і вуліцы-прысады, і чысьцюсенькія прыбраныя будынкі, і паркі, і ўвесь гэты горад-сад і кожная драбніца ў ім, старанна зробленая, адпавядаючая ўсяму ансамблю. Паветра тут дзіўнае. Самі грамадзяне такія ж чысьценькія, як іх горад і такія ж нетурботныя, паважныя, рытмічныя. Проста, як у казцы. Гэта — прыклад гарадоў будучыні. Начуем тут у такой жа, як увесь горад, добрай гасьцініцы, я ў зграбненькім пакоі з балконам у кветках (васількі і інш.), з бальзамічным паветрам. Хвала Табе, горад перамогі (Ніка — перамога) і Вам, добрым грамадзянам! Цалую Вас усіх, вітаю. Твой Гурык.*

*24.VI.51. Параход "Ламаносаў". Днепрапетроўск. Раньне. № 46.*

*Дарагая Ларута! Вось зноў мы едзем па знаёмай ужо рацэ, вярней па возеру Леніна. Учора была цёмная украінская і цёплая ноч, ласкавая, таямнічная, выгукаючая роздум і элегічны настрой.*

*Сёньня халаднавата. На возеры моцныя хвалі. Хмурынкі на небе. Прад намі магутны горад. Праплывае прад вачыма створаная людзьмі аграмада, самі людзі, жыцьцё. І радасна за чалавека, за яго здольнасьць — і неяк сумна. Чамусьці шчэміць троху сэрца, мо ад непадзеленай радасьці.*

*Умовы ў 1-ым класе вельмі добрыя, адпачываем. Але хоць бы хутчэй Кіеў, Москва і родная Раманаўка. Цалую Вас, абыймаю. Твой Гурык.*

*25.VI.51. Кіеў. Надвечар. № 52.*

*Дарагая мая, любая Ларута! Падыходзіць канец нашаму вандраваньню па Украіне, — праз некалькі гадзін выяжджаем у Маскву.*

*Яшчэ раз зайшоў сёньня на галоўны паштамт і на цэнтральны тэлеграф, даведацца, ці ня было чаго ад Цябе. На жаль, ня было нічога. Шкада, шкада, — пачакаю да Масквы.*

*Сёньняшні дзень зрабіўся для мяне днём наведваньня музеяў. Быў у музэі Шаўчэнкі, у музэі рускага мастацтва, заходняга мастацтва, гістарычным музэі, у музэі — Сафійскім соборы, у Уладзімерскім саборы і ў Андрэяўскім саборы.*

*Музэй Шаўчэнкі вялізарны, багаты, нават, мне здаецца, трошку перагружаны. Такога моцнага ўражаньня, як музэй Лермонтова зрабіў на нас, не засталося.*

*Музэй рускага мастацтва вельмі добры. Тут ёсьць добрыя рэчы Васнецова, Верашчагіна, Рэпіна, Шышкіна, Кіпрэнскага, Баравікоўскага, Врубеля, Айвазоўскага, Левітана і інш.*

*У музэі заходняга мастацтва мала экспанатаў, — ёсьць творы эгіпцян, грэкаў, італьянцаў, гішпанцаў, французаў. Асабліва ўразіла мяне галава эгіпцянкі, зробленая 4 тысячы год назад з граніту. Жанчына як жывесенькая, з таямнічай усьмешкай і сумным складам вуснаў. Захаванасьць выключная — я быў зачараваны.*

*У гістарычным музэі — выхадны дзень, і мне задалося агледзіць толькі аддзел першабытнай грамады. Вось дзе багацьце — ў палеаліце Пушкарэй і Мезіну, ў гіганталітах, у неаліце. Можна б было тут як мае быць падвучыцца.*

*Музэй украінскага мастацтва таксама вялічэзны, але часова зачынены ў зьвязку з дэкадай украінскай культуры ў Москве. Толькі й бачыў каменных баб пры ўваходзе.*

*Уладзімерскі собор зьдзівіў мяне наіўнасьцю сьвятых малюнкаў і іх прымітывізмам, малой мастацкасьцю на мой погляд.*

*Сафійскі сабор зьдзіўляе велічнасьцю старажытняга, строгасьцю і вялікім уплывам грэкаў на старославянскую культуру, асабліва ў пісьменнасьці, ў напісаньні, ў малярстве. Просты народ нічога ня мог зразумець з напісанага, яго глушылі ўсім незразумелым, каб вялікасьць бога была яшчэ большай.*

*Будаўнічая культура таго часу была вельмі высокая — аж дзіва. Бачыў саркафаг Ярослава Мудрага, яго скульптурны партрэт (зрабіў М. М. Герасімаў), Радзівілаўскі летапіс, цікавыя образы архітэктуры Старой Беларусі (царква ў Супрасьлі, Полацку, Мірскі замак і інш.).*

*Выключны па прыгажству Андрэяўскі сабор, пабудаваны ў 1767 г. архітэктарам Расстрэллі: гэта шэдэўр архітэктуры, упрыгожаньне Кіева. Ад сабору — захапляючы малюнак Падолу, Дняпра, поймы...*

*[...] Якая бязмежная веліч прыроды, гісторыі, жыцьця — аж галава круціцца, нібы зірнуў у бездань. Наша існаваньне — малюсенькая дробачка ў гістарычнай вадаверці — тым больш трэба цаніць яго.*

*Цалую, вітаю Вас усіх. Як Твае здароўе, Ларутанька? Беражыся ўсяго паганага, не хвалюйся, рабі гімнастыку, гуляй, не пячысь надта на сонейку. Вельмі, вельмі хачу Цябе пабачыць, адчуць, нагаманіцца.*

*Лашчу Цябе, тулю, галублю, будзь радаснай, мая Зараначка.*

*Твой Гурык"*

* * *

З 1956 г. Г.Гарэцкі з сям'ёй жыў у Дзедаўску Маскоўскай вобласці, прыблізна за 40 км ад Масквы. Ён меў пасаду намесніка начальніка Аддзела геалагічных вышуканняў і галоўнага геолага паўднёвых аб'ектаў Гідрапраекта. Павялічылася колькасць паездак ва Украіну.

Але галоўная мара Г. Гарэцкага за ўвесь час яго жыцця па-за межамі Радзімы — вярнуцца ў Беларусь, прынесці карысць беларускаму народу, таму ён з вялікай радасцю вывучаў геалогію паўднёвых краін еўрапейскай часткі Саюзу, у тым ліку і Украіны, бо разумеў, што гэтым ён набліжаецца да сваёй бацькаўшчыны. У лісце ад 21.1.56 да Якуба Коласа ён пісаў: *"[...] Незалежна ніадчога, я буду працаваць з мэтаю прынесьці карысць сваёю навуковаю дзейнасьцю Беларусі, беларускаму народу. Каб лепш зразумець геалагічную гісторыю Беларусі ў антрапагене, трэба добра разумець гэтую гісторыю для усёй еўрапейскай часткі СССР, для яе сухазем'я і для яе марэй, што я і раблю ужо на працягу амаль 25 год. Здалёку падыходжу я да прастораў Беларусі, але падыйду абавязкова і зразумею іх гісторыю ў новы геалагічны час — антрапаген. Вось і зараз з замілаваньнем вывучаю я геалагічную гісторыю Чорнага і Каспійскага мораў, морскія адклады Понта-Каспія і іх суадносіны з сухаземнымі адкладамі. Цікава надзвычайна — а гэта гісторыя вядзе мяне і да гісторыі Беларусі, да гісторыі яе рэк, зледзяненнеў і міжледавіковых эпох".*

І вось Г. Гарэцкі зноў ва Украіне, з цікавасцю вывучае геалогію, пільна працуе ў інжынерна-геалагічных вышуканнях, знаёміцца з украінскай культурай. Пра ўсё гэта ён пісаў у лістах.

*"2.11.57; 9 г. 30 хв. веч. Крывы Рог. Субота.*

*Дарагая, любая Ларута! [...] Зусім асобнае пачуцьцё ахапіла мяне тут, на Украіне, — пачуцьцё замілаваньня да ўкраінскае*

*прыроды, да народу, да працы на яго карысьць. Нейкая захаваная радасьць загарэлася, нягледзячы на неарганізаванасьць працы.*

*Прыдзецца мне і самому працаваць і " камандаваць". Але працу зрабіць трэба. Толькі больш удумлівасьці трэба, больш канцэнтраванасьці высілкаў.*

*[...] Ды і самому мне ўжо робіцца тут сумна, як адарванаму ад гнязда. Але — гэты сум трэба перамагчы і працаваць, працаваць.*

*5.ІІ. 57. 2 г. 40 хв. дню. Аўторак.*

*Дарагая, родная Ларута! [...] З прыемнасьцю я паезьдзіў, паглядзеў пайднёвую Украіну. Усё тут нагадвае Доншчыну, і прырода, і геалёгія, і сёлы, хутары, і людзі, - падабенства вялізарнае, стэп.*

*[...]А ніжэй Міхайлаўкі, уся даліна р. Каменкі, проста самой прыродай створана для каналу: рэчышча ўсё амаль у гранітах. Асабліва маляўнічыя віды і выгляды ля с. Мар'еўкі. На працягу 3-4 км тут ёсьць старажытныя парогі — відовішча красамоўнае, велічнае. На бартах даліны і на схілах выходзяць граніты, на паверхні якіх ляжаць велічэзныя валуны — глыбы граніту, вылізаныя ракою. Уражаньне такое, нібы адчуваеш жывыя вадаспады і парогі, якія толькі што змоўклі. Я ніколі не бачыў такога прыгажства.*

*8. ІІ. 57. 9 г. веч. Крывы Рог. № 3.*

*Дарагая, любая Ларута! [...] Езьдзілі мы 3 дні. У сераду надвор 'е было нішто сабе. І я шмат хадзіў.*

*[...] Даехалі мы да раённага цэнтру Ліхаўкі, дзе і заначавалі ў "готелю " — звычайнай сялянскай хаце з 3-х пакояў, у вялікім з якіх стаіць 7 ложкаў (а надпіс на шыльдзе "готель"). Увечары пайшлі мы з геолагам Броньнікавым у кіно, бо ішоў "Іван Франко". Мне было цікава паглядзець, якіх посьпехаў дасягнула ўкраінскае кіно з Бандарчуком. Так сабе посьпехі, хоць Бандарчук часам вельмі таленавіты... І вось у кіно пачуў я, што мне цісьне правую нагу, і ўсе больш і больш. З кіно я ішоў ужо кульгаючы. Зараз жа лёг у ложак. Але заснуць ня мог. Нагу проста ламіла. А я ж уражлівы. І вось мне задалося, што нага мая ўжо не палепшае, што я буду кульгавы, што скончылася мая геалёгічная праца. І пайшлі розныя вобразы ўяўляцца — і поўнай бездапаможнасьці, і чаканьня канца... Пачаў я рабіць назе масаж, узьняў яе да гары — лягчэй зрабілася, але боль не прайшла. Раніцою — зноў кульгаю. А маршрут, як насумысля, самы цікавы, самы адказны. Надвор'е ж — самае паганае: туман-туман, сьцюжа, вецер, зябка. Стараўся, каб менш схадзіць з машыны, менш трудзіць нагу...*

*Але вось даехалі да Дняпра — гэта было 7.II (мне шанцуе на 7. II — гэта быў пачатак і канец маёй працы на Туломе[1]) — гэта пачатак маіх дасьледаваньняў на Дняпры. Дняпро здаўся мне няшырокім, ня шырэй Дону, але прыгожым і прывабным, з высокім правым берагам і добрымі кавалкамі тэрас.*

*[...] Я быў так рад: нарэшце я пачынаю сам, непасрэдна вывучаць даліну Дняпра і яго тэрас.*

*І калі ступіў я на тэрасы, асабліва на І н.т. (першая надпоплаўная тэраса[2] — Р. Г.), дык на ўсё забыўся: і пабег без усякага кульганьня ўперадзе ўсіх.*

*[...] І сёньня — і сьледу німа ад хваробы маёй нагі — зусім здаровая!*

*Украінскія сёлы і хутары здаюцца мне прыгожымі, але беднымі, стаяць адны хаткі, без двароў, ды абы дзе невялічкія клуні. А хаткі такія маленькія, аднастайныя, дзе ж тут у невялічкіх хацінках месьціцца вялікае шчасьце? Мне аж сумна зрабілася. Але садоў тут вельмі, вельмі шмат — і велізарных! А які даўжэзны горад Крывы Рог — звыш 40 км! Чуецца ва ўсім велізарны індустрыйны асяродак.*

*16.11.57. Крывы Рог. № 9. 8 г. веч.*

*Дарагая мая дружына, добрая мая Ларута! Як мне падабаецца працаваць і жыць на Украіне. Зьбіраю кавалачкі ведаў пра геалёгію Дняпра і тым быццам бы набліжаюся да Беларусі.*

*І чую часта-часта ўкраінскія песьні, музыку, музычную мову, у якія я проста закаханы, — столькі ў іх хараства, магутнасьці, арыгінальнасьці, няўмiручасьці.*

*Толькі часам сэрца кіпцюрамі нехта схоплівае ад крыўды за лёс і адсталасьць беларускае музыкі і мастацтва.*

*Вось учора і заўчора шмат-шмат перадавалі пра Глінку. Усе народы гаварылі голасам сваіх кампазітараў пра ўплыў Глінкі на іх нацыянальную музыку. Ад Беларусі ж сказаў пустое вітальнае слова Дзянісаў[3], як быццам Глінка зусім чужы быў Беларусі.*

*А вось учора і сёньня асабліва, была дзіўная перадача на тэму "Глінка і Украіна". Які зьмест, якое музычнае афармленьне, колькі цеплаты, замілаваньня. Ёсьць чаму пазайздросьціць.*

---

[1] Тулома — рака на Кольскай паўвыспе, дзе Г.Гарэцкі працаваў у высылцы да 1937 г. старшым інжынерам-геолагам Туломбуда НКУС на будаўніцтве Туломскай ГЭС.
[2] Тэрасы - ступенепадобныя формы рэльефа схлонаў далін рэк; І надпоплаўная тэраса - першая ступенепадобная форма (тэраса) над поплавам (поймай) ракі.
[3] Дзянісаў Міхаіл Іванавіч (1900-1971) — беларускі оперны спявак.

*18.11.57. Крывы Рог. № 10. 9 г. 20 хв. веч. Панядзелак.*

*Дарагая мая Ларута! [...] Спадзяюся, што і 8 экспедыцыі праца добрая ўсё ж знойдзецца. Думаю ў канцы сваёй тут працы, каля 5.III, зьезьдзіць адмыслова ў Нікаполь, на марганцавыя руднікі, пазнаёміцца з умовамі "паверхневых распрацовак", вышуканьнямі пад якія і магла б заняцца 8 экспедыцыя. А скарочаных людзей часткова забярэм сюды.*

*Паганае надвор'е тут яшчэ не прайшло: туманы, хмарнасьць, гразь. Але ўжо лепшае, і палявыя вышуканьні патроху ідуць. Аднак езьдзіць мне ў поле яшчэ ранавата.*

*Таму ўсё працую ў тэхархіве, бяру матар'ялы дахаты на вечары і ў нядзелю. Працую пільна, бо цікава. Але да вялікага стамленьня сябе не даводжу. На жаль, разумею, што ня тая ўжо працаздольнасьць, ня тая сакавітасьць і нястомнасьць. Гады, гады, няўмольны час — ніхто Вас не пераадолее... Таму стараюся выдаткаваць свае рэшткі высілкаў разумна, эканомна. Стараюся не стамляцца, гуляць трошку пасьля працы. Вось і сёньня, пасьля 5-е гадзіны (канец працы) пайшоў гуляць у бок рэчкі Саксагані (менш Сьвіслачы, менш Кумсы). Сонейка праблiснула, гразь падсыхае, абы дзе купачкі зялёнае травы зьявіліся. Прыемна было троху пахадзіць. Ну, і з боку геалагічнага цікава: убачыў, што пойма Саксагані зусім вузенькая і нявысокая — да 1-1,5 м! I бачыў горы старых горных адкідаў — стварылася новая слаяватая парода.*

*Учора знайшоў алювi Пра-Саксагані, самы сапраўдны — і так рад яму!*

*[...] З цікавасьцю чытаў Твоё паведамленьне пра культурныя навіны з Беларусі і пра нашага земляка-палкоўніка. Як я рад, што самародак той, хлопчык-музыка ўзрастае, вучыцца. Дай, Божа, нам свайго Глінку!*

*22.11.57. Крывы Рог. № 13 8 г. 10 хв. веч. Пятніца.*

*Дарагая мая, родная Ларута! [...] Прыемна, што нават у Кісла-водску чуецца ўкраінская мова. Якая моцная ўкраінская культура, як захоўваюць украінцы сваю мову і жартаўлівасьць.*

*24.11.57. Крывы Рог.*

*Дарагія мае, любыя Лёля і Галя[1]! [...] На Украіне, у Крыварожчыне, цяпер ні зіма, ні вясна, ні нават — не прадвесьне, а ліха ведае, што такое: хмарна, то марозік, то дождж, то густы сьнег*

---

[1] Галя - Галіна Максімаўна Гарэцкая, пляменніца Гаўрылы Гарэцкага.

*хлопам валіць, гразюка страшэнная. Езьдзіць можна толькі на трактарах ды "вездеходах", выдаткуючы процьму паліва...*

*Дык я ўжо тыдзень як нікуды ня еджджу, жыву ў гасьцініцы "Руда", працую ў тэхнічным архіве Крыўбаспраэкту. Шмат чытаю, раблю выпіскі, апрацоўваю матар'ял. Так мне прыемна і добра працаваць, пазнаваць новае.*

*Якое ж гэта стамленьне? Наадварот, гэта — найлепшы для мяне адпачынак.*

*14.Х. 57. 1 г. 40 в. дню. Ст. Полтава. Панядзелак.*

*Дарагія родныя! [...] Дык я вырашыў паехаць у Музэй Палтаўскай бойкі.*

*Хоць гэта далекавата, за горадам, але я зьездзіў. Вось толькі што зьвярнуўся назад, — пішу Вам, чакаючы цягніка.*

*Цікавае поле Палтаўскай бойкі, цікавы музэй, помнікі загінуўшым — рускім і швэдам.*

*На сучасную мерку — гэта была невялічкая бойка.*

*Карл XII меў толькі 27 тысяч солдат і 4 гарматы, а Пётр I — 42 тыс. салдат і 64 гарматы. Рускіх загінула 1345 чалавек. Бойка цягнулася менш 2 гадзін...*

*Каля Пераваланай капітуліравала ўся армія швэдаў.*

*А на свой час — гэта была найвялікшая бойка! Як усё зьмяняецца...*

*Зьдзівіла мяне мова часоў Пятра. Як мала гэта мова подобна да сучаснае рускае мовы! Як няпісьменна друкаваліся кнігі!*

* * *

Нягледзячы на цікавую працу, якой, як заўсёды, Г. Гарэцкі аддаваў увесь свой імпэт, дастаткова някепскі дабрабыт і спакой у сям'і і родных, думкі ўвесь час вярталі яго да Беларусі. Калі ж здзейсніцца мара ўсяго жыцця і ўдасца трапіць у Беларусь, працаваць для Айчыны?! Ён вёў на гэтую тэму перапіску з Якубам Коласам, акадэмікам Паўлам Рагавым[1] — сваім даўнім сябрам - ды іншымі, якія прыкладалі шмат намаганняў, каб Гарэцкаму дазволілі вярнуцца на працу ў Акадэмію навук, але пакуль што адказ з ЦК КПБ быў адмоўны. Нарэшце тата атрымаў доўгачаканы дакумент:

---

[1] Рагавой Павел Пракопавіч (1895-1985) - беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства, акадэмік АН Беларусі (1953), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (1923), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1949).

***Военный трибунал Белорусского военного округа 26 апреля 1958 г.***

***№ 610***

***гор. Минск***

***Справка***

***Дело по обвинению Горецкого Гавриила Ивановича, до ареста 24 июля 1930 г. работал директором Научно-исследовательского института сельского и лесного хозяйства и зав. кафедрой штандорта Народного хозяйства Белорусской Академии наук, пересмотрено Военным трибуналом Белорусского военного округа 22 апреля 1958 г.***

***Постановление от 30 мая 1931 г. в отношении Горецкого Гаврила Ивановича отменено и дело за отсутствием состава преступления прекращено.***

***Зам. председателя Военного***
***Трибунала Белорусского***
***военного округа***
***полковник юстиции (В.Кондратьев)***

17 мая 1958 г. Г. Гарэцкі напісаў яшчэ адну заяву на адрас Прэзідыума Акадэміі навук БССР, далучыўшы да яе копію даведкі аб поўнай сваёй рэабілітацыі ў сувязі з адсугнасцю складу злачынства. Ён прасіў: *"... яшчэ раз прашу хадайнічаць перад Саветам Міністраў БССР аб скасаванні пастановы СНК БССР ад 1930 г., паводле якой я быў выключаны з складу Беларускай Акадэміі навук, як "вораг дыктатуры пралетарыяту", і аб аднаўленні мяне ў годнасці правадзейнага члена АН БССР"*. У канцы заявы ён зазначыў: *"Хачу на схіле год дадаць хоць кроплю ў скарбніцу беларускае савецкае культуры"*. Але станоўчага адказу не было...

А тым часам Гарэцкі зноў працуе і вандруе па Украіне, пра што піша ў лістах да жонкі.

*"16. VII. 58. Кіеў. 9 г. 30 хв. веч. № 1.*

*Дарагая, любая, добрая, мая Ларута! Даехаў сюды вельмі добра.*

*[...] Дзівіўся на прыгажство краявідаў паўночнае Украіны, куды мілейшых і больш блізкіх беларускаму сэрцу, чым краявіды паўднёвай Украіны.*

*[...] Зноў убачыў хараство Кіева, помнікаў яго, сабораў, культуры...*

*21.VII.58 г. 7 г. раньня. Малодава. № 6.*

*Дарагая мая, родная Ларута! [...] Слухаю апошнія весткі і трошку лягчэй робіцца, — мо абыдзецца ўсё без вайны. І ўсё ж — час грозны і трывогі поўны.*

*Учора, як вярнуліся з станцыі, доўга аглядалі раскопкі на Малодава V. Здзіўляе шматлікасьць культурных слаёў адзін над другім — аж 12! Дужа добра захаваліся вогнішчы — нібы ўчора згас іх агонь: такая чырвоная зямля над вогнішчам, попел, вугольле — усё выразна вылучаецца. Некаторыя вогнішчы вялікія, — попел, гарэлая зямля пад імі тоўстыя.*

*Добра відаць пахаваныя глебы, кратавіны, шчыліны адсяданьня і высыханьня.*

*Ўсе гэтыя шчыліны нахілены ў бок схілу, па скату, — але зьмяшчэньне іх невялікае — сантыметраў 20-30.*

*Па аглядзе пайшлі з Масквіціным*[1]*, Пановым*[2] *і ўкраінскім археологам Савічам купацца ў Днястро — іншыя ўдзельнікі агляду стаміліся і не пайшлі.*

*Вада такая прыемная днястроўская, ласкавая, чыстая. Толькі дно камяністае і ілістае — дужа нязручна ўваходзіць у ваду.*

*Надвечар даліна Днястра робіцца зусім асаблівай: сонейка прасякае ўсё, нібы промені сабраліся ўсе ўнізе, усё такое празрыстае, аб'ёмнае, — нельга адарваць вока...*

*22.VII. 58. Сяло Малодава на Днястры.*

*Дарагія мае, любыя Лёля і Галя! Пасылаю Вам вітаньне з Букавіны, дзе я жыву і працую ужо 5-ы дзень.*

*Усё мне тут вельмі падабаецца. Маляўнічая прырода, прыгожыя краявіды, ласкавы Днястро з цёплаю вадою; высокая культура земляробства, садаводства, гароднiцтва, дужа прыемныя людзі, з пявучаю, чысьцюсенькаю ўкраінскаю моваю, такія ўважлівыя, простыя, гасьцінныя, утульныя хаткі, прыбраныя, пафарбаваныя, з своеасаблівымі кілімамі, нацыянальнымі тканінамі...*

*І столькі тут сонца, чыстага паветра, нейкай празрыстасьці, хараства.*

*А любілі гэты край людзі яшчэ ў далёкай першабытнасьці. На Букавіне ёсьць паселішчы ўсіх аддзелаў палеаліту, часта паселішчы пахаваны адно пад другім, ствараючы да 8-10 культурных насьцілаў!*

---

[1] Масквіцін Аляксандр Іванавіч - геолаг, старшы навуковы супрацоўнік Геалагічнага інстытута АН СССР (Масква), доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар.

[2] Паноў Георгій Іванавіч — геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар Новачаркаскага політэхнічнага інстытута.

*І гушчыня старадаўняга насельніцтва была вялікая, аж задзіўляе гэта: нідзе ў Савецкім Саюзе такой гушчыні старадаўняга насельніцтва ня было.*

*А чацьвярцёвая геалогія тут, асабліва шматлікія тэрасы Днястра, выключна цікавыя, але мала яшчэ вывучаныя.*

*22.VII.58. 3 г. дню. Гор. Хоцін. № 7.*

*Дарагія родныя! Вось мы і ў Хоціне. Невялічкі, чысьценькі, заходняга тыпу горад, з аднапавярховымі дамамі, абы-дзе з румынскімі надпісамі. Многа кветак на шырокіх вуліцах-бульварах.*

*Краявіды Прыднястроўя маляўнічыя, але надта няроўны рэльеф — лагчыны, балкі, увалы, узгоркі, роўных мясьцін амаль німа. Дарогі абсаджаны фруктовымі дрэвамі, на якіх многа яблык дасьпявае і ніхто іх ня рве. Кажуць, што ёсьць і варта адпаведная. У полі нядрэнны ўраджай, але нямала ўбіраюць рукамі, сярпамі, косамі. Многа люцэрны, цукровых буракоў, пшаніцы, азімага ячменю. Макі паўз дарог. Дзіўны пах жніва і пакосаў. Вёскі, сёлы, хутары выключнай акуратнасьці, чыстаты, белыя, з чарапічнымі дахамі, ўсё ў зялёных садах. Хараша, прыгожа. Зараз едзем у Камянец-Падольскі, дзе і начуем.*

*Цалую Вас, абыймаю. Ваш Гурык*

*23.VII.58. 9 г. 20 хв. раньня. Камянец-Падольскі. № 8.*

*Дарагая мая, родная, любая Ларута! Мой мілы і ласкавы дружа! Здрыжнічак*[1] *мой прыгожы! Добрай раніцы, заранaчка мая! Як тут хараша ў гэтым старажытным горадзе. Калі пад'яжджаеш да яго па Днястроўскаму асфальту, здаецца, што трапляеш у казку. Раптам зьяўляецца рэчка Смотрыч з камяністымі крутымі берагамі, на якіх нібы натуральны працяг камяністых абрываў узвышаюцца каменіцы турэцкай крэпасьці з усходнімі вежамі, грамады палацаў, касьцёлаў, ратушы, праваслаўнага напаўгатычнага сабору, касьцёла з мінарэтам, паркі і безьліч белых дамоў...*

*Начавалі ў музэі - архітэктурным заказьніку, каля касьцёла з мінарэтам (вышынёю 37,5 м, на гары на паўмесяцы стаіць Езус Хрыстус з крыжом — адзнака перамогі каталіцтва над мусульманствам, пабудаваная нейкімі бязглуздымі панамі ў XIX стагодзьдзі). Спалі побач з усыпальніцай яго эксцэленцыі найвышэйшага пробашча*

[1] Здрыжнічак - так Г. Гарэцкі ў лістах часта ласкава звяртаўся да сваёй жонкі, здрыжнік — назва травы Briza media з сям'і злакавых.

*Камянец-Подольское катэдры пана Казімера Францішка Клейна, памершага ў 1771 годзе. Былі і немцы, цалкам спалячаныя.*

*На былой могілцы, ля якой мы спалі, стаяць дзьве гіпсавыя фігуры — адна з бязмежным сумам, другая — з узвышанасьцю, ушэсьцем духа пад нябёсы.*

*Няглядзячы на прыгажосьць і славутае мінулае, губэрнскі горад Камянец-Падольскі не расьце, не мае прамысловасьці, зрабіўся толькі раёным цэнтрам ... нібы наш родны Мсьціслаўль.*

*24.VII 58. 8 г. раньня. Камянец-Падольскі. Калгасны рынак.*

*Дарагія родныя! Учорашні дзень мы многа працавалі ў полі. Агледзілі і дасьледавалі 2 вялікіх кар'еры ў Шуноўцах і Вялікай Мукчы і 1 маленькі.*

*[...] Даведаўся некаторыя дэталі з гісторыі городу. Быў ён два стагоддзі губэрскім городам Расійскай імпэрыі, ваяводзкім городам Польшчы, абласным городам УССР. А дзеля 300-лецьця злучэньня Украіны з Расіяй абласны цэнтр перанесьлі ў горад Праскураў, які назвалі Хмяльніцкім.*

*У Камянец-Подольску 2 ВНУ, у тым ліку СГІ, і 12 тэхнікумаў, — гэта горад навучэнцаў, моладзі. Туркі ўладалі городам толькі 80 год. Мінарэт пабудавалі самі туркі, прыбудавалі яго да касцёлу, а ўжо каталікі пасадзілі на гару мінарэту анёла з сонцам (герб Падоліі).*

*Крэпасьць будавалі палякі, а дабудавалі яе туркі, надаўшы вежам усходні выгляд.*

*Тут было біскупства Польшчы, біскуп быў намеснікам караля на Падоліі. Тут захаваліся будынкі — стаўкі Брусілава, Мікалая II, Пятлюры.*

*Горад некалі ляжаў на стыку 3-х дзяржоў: Расіі, Аўстра-Венгрыі і Румыніі. Выгляд городу пераважна заходні, насельніцтва — украінцы і яўрэі, галоўным чынам. Амаль скрозь чуваць украінскую мову, якая тут жывая, пануючая.*

*Але русіфікацыя і тут мае посьпехі, сярод чыноўніцтва, інтэлегенцыі.*

*25. VII. 58. 9 г. раньня. Малодава. № 10. Пятніца.*

*Дарагія родныя! Учора зьвярнуліся з падарожы. Троху стаміліся. Агледзілі ўчора яшчэ 2 кар'еры: Жванецкі (Брага) і Астраўчанскі.*

*[...] Жванецкі кар'ер ляжыць на тэрасе, якая мае вышыню 45-55 м, на ім гістарычны помнік — батарэя Хмяльніцкага. Перад выездам з Камянец-Падольскага агледзілі музэй у Катэдральным саборы і ў турэцкай крэпасьці. Поўны былі ўражаньняў ад багатае і трагічнае*

*мінуўшчыны. Задзівіла касьцёльнае "абсталяваньне" — колькі тэатральнасьці, эфекту, наіўнасьці, якія мяжуюць зараз з камічнасьцю (позы, выразы, выкачаныя вочы, убраньне).*

*Бачылі надгробны помнік Лауры Пшэздзецкай, зроблены з мармуру прафэсарам Бродскім у XIX стагодзьдзі. Прыгожая дзяўчына нібы заснула, ляжыць на ложку, ўсе драбніцы зроблены больш чым з фатаграфічнай натуральнасьцю. Побач бюсты бацькі і маці Лаўры. Наіўны надпіс:*

*"Dzewica Laura*
*Zgasła w lat kwiece*
*W najlepszym sa świecie"...*
*(Ці нешта ў такім парадку)*

*Усім падабаецца, як і статуя мадонны (побач з ёю стаіць); мне — ня вельмі.*

*Многа помнікаў з панскіх палацаў (гербы, надгробныя помнікі, надпісы з 1628 г., меморыі выдатным вучоным, між іншымі і Суліма-Пшыбароўскаму з Беларусі — з Хойнікаў), турэцкіх і інш. Тут жа ў касьцёле выстаўка мастакоў Украіны (такі кантраст сучаснага жывапісу з касьцёльным асяродзьдзем).*

*Найлепшыя помнікі турэцкай крэпасьці, гэта — музэй украінскай культуры, фактычна, сялянства, казацтва. Задзіўляе жыцьцё Кармалюка[1] — вось сапраўды народны герой, куды больш жывучы, чым Хаджы-Мурат[2]. Ёсьць у музэі некаторыя экспанаты, што гавораць аб Беларусі — ліст польскага магната пра паўстаньні сялян на Беларусі, літоўскія грошы і інш. Крэпасьць вельмі маляўнічая.*

*27. VII. 58. 9 г. 15 хв. раньня. Нядзеля. Малодава. № 11.*

*Дарагая мая, любая, хорошая Ларута! Ласкавы мой дружа! Учора не пасьпеў напісаць свае чарговае кранікальнае паведамленьне. Бо а 8-й гадзіне раніцы пайшоў у свой пешаходны маршрут, з якога зьявіўся толькі а 10-й гадзіне ўвечары.*

*Многа выхадзіў на абодвух берагах Днястра. Так было прыемна. Надвор'е ўмеркаванае спрыяла хаджэньню. Але троху і стаміўся, бо прайшоў каля 35 км. Хадзіў у Старую Ушыцу, Корман, пад Куляшоўку.*

*[...] Дужа тут прыгожа і добра. Але усё даецца дарагою цаною, упартаю працаю чалавека. Людзі тут вельмі гасьцінныя і жычлівыя, уважлівыя, ласкавыя, жывуць ня дрэнна. Уся Малодава радыёфіка-*

---

[1] Кармалюк Усцім (1787-1835) — кіраўнік сялянскага руху ва Украіне ў 1-й палове XIX стагоддзя.

[2] Хаджы-Мурат (1790-1852) — адзін з кіраўнікоў каўказскіх горцаў у час Каўказскай вайны 1817-1864 гг. Яму прысвечана аповесць Л.М.Талстога "Хаджы-Мурат".

*вана, амаль кожная хата і ўсё сяло гучна пяюць. Колькі прыгожых украінскіх сьпеваў тут...*

*Нешта трывога ў мяне зьявілася за Вас усіх — ці ўсё у Вас добра? Неякі неспакой — мо таму, што ня маю ад Вас вестак.*

*Ну, бывайце, мае родныя, дарагія, залатыя, брылянцістыя, агністыя. Моцна ўсіх Вас цалую, абыймаю. З якой прыемнасьцю пасядзеў бы я з Вамі...*

*Ваш Гурык*

*29. VI1.58. 10 г. веч. Ст. Окніца. № 12. Аўторак.*

*Дарагія мае родныя! Вось і скончыўся мой побыт у Малодаве. Сёньня а 9 г. 03 хв. вечару з вялікімі цяжкасьцямі сеў у цягнік, у мяккі вагон адзінага ў суткі цягніка да Кіева; даеду да Фастава а 9 г. раніцы — а потым будзе перасадка на Крывы Рог (праз Пяціхаткі). Не ведаю, як там будзе ў Фаставе, — спадзяюся, што добра.*

*У нядзелю езьдзілі ў апошні маршрут, на Луку Урублявецкую, Мар'яўку, Вялікую Мукшу. Дужа ўдалая была падарожа.*

*[...] А колькі прыгожых было краявідаў! Варочаліся позна ўвечары, было зусім холодна. У Якаўцах (Іванаўцах) бачылі вясельле, цэлую працэсію. Уперадзе ідзе нявеста, уся ў белым з абразом у руках, а побач несьлі сьвяцільнік з 3 тоўстых сьвечак. За нявестай і жаніхом ішлі шматлікія госьці і гледачы. А пазаду, на некаторай адлегласьці, ішоў духавы аркестр (чалавек 8-9) румынскага тыпу і іграў урачысты марш. Уражаньне было надзвычайнае, ўсе ўдзельнікі ішлі ў сьвяточным строі, строгія і ўзвышаныя.*

*Кожную нядзелю ў кожным сяле спраўляюць 1-2 вясельлі. Але А.П.Чарныш*[1] *паведаміў мне сумную статыстычную даведку. За 7 год яго працы ў раёне Малодавы з 300 дзяўчат, якія ў яго працавалі, пайшло замуж толькі 2 дзяўчыны, а рэшта ходзіць у дзеўках, робіцца векавухамі. Як сумна...*

*Гор. Нікалаеў. 5 г. дню. № 18.*

*Дарагія родныя! Сёньня а палове першае гадзіны паехалі мы ў падарожу па берагах Кахоўскага і Запарожскага вадасховаў.*

*[...] Праехалі новы горад Арджанікідзе — асяродак марганцавай прамысловасьці. Нікалаеў — вялічэнны горад. Але зараз ён здаўся мне не такім ужо надзвычай прыгожым.*

---

[1] Чарныш Аляксандр Панкратавіч — украінскі геолаг з Львова.

*[...] Кахоўскае мора паўнюсенькае, шырокае — другога берагу не відаць. Але берагі яго такія адхоныя, палогія, што амаль ніякіх абгаленьняў не відаць. Мо далей будзе ?*

*[...] Учора я дужа добра адпачыў — выспаўся аж занадта. Нікуды не хадзіў. Толькі ў тэатр. Глядзеў "Зямлю" па Кабылянскай; мы неяк раней бачылі такое кіно.*

*І артысты добрыя, і пастаноўка. Але німа ні ўзрушаньня, ні захапленьня — відаць падыйшлі гады "крытычнага рэалізму"...*

*Прыгожыя былі сьпевы, музыка, ўсё сцэнічна. Публіка глядзела з увагаю, гучна плескала. Але ўсё такое цяжкае і натуралістычнае (вясельле, пакойнік на сцэне і г. д.). Мова сакавітая, чыстая (ня тое, што ў беларускіх тэатрах). Скончылі аб 11 г. 40 хв. вечару. Мне наогул было прыемна".*

* * *

Г.Гарэцкі рупліва працаваў, выязджаў на палявыя працы ў геалагічныя экспедыцыі ў самыя розныя раёны, але былі і небяспечныя выпадкі, як тое часта здараецца пры вандраваннях. Найбольш жахлівы з іх адбыўся пры канцы жніўня 1958 г. На досыць вялікім схіле дарогі Масква-Харкаў, недалёка ад Чугуева (радзімы мастака Рэпіна), адмовіў тормаз аўтамабіля ГАЗ-69. Машына страшэнна разагналася і з'ехала з дарогі. Прычэп перакуліўся і пацягнуў за сабой машыну, якая таксама перакулілася. Г. Гарэцкі, які сядзеў побач з шафёрам, разбіўшы галавой шыбіну, вылецеў наперад, а машына прыдушыла яму грудзі. Вынік быў вельмі сумны: пераломы мноства рэбраў, асабліва з правага боку, грудзіны, страсенне мазгоў, шок. Мне пазванілі ў Геалагічны інстытут АН СССР, дзе я тады працаваў, і сказалі пра здарэнне. Надвечар таго дня я ўжо быў у больніцы. Стан бацькі быў вельмі цяжкі. Дзякаваць Богу, галоўны ўрач Андрэй Аляксандравіч Бурцаў (заслужаны дзеяч медыцыны УССР) аказаўся цудоўным хірургам: ён без аперацыі змог правільна скласці ўсе паламаныя косці і выратаваць хворага. Але ў такіх выпадках вельмі шмат значыць і маральны стан пацярпелага. Пра гэта яскрава сведчыць надпіс, які зрабіў хірург на сваім фотаздымку, падараваным Г. Гарэцкаму на памяць: "Ваше мужество, воля, выдержка и исключительная скромность явились залогом в Вашем выздоровлении". Гэты фатаздымак тата павесіў у кватэры каля пісьмовага стала.

Лета 1959 г. пачалося з новых службовых выправаў, падарожжаў, вандровак.

*"Ст. Ілавайская. 12. VII. 59. 1 г. дню. № 1.*

*Дарагая, родная мая Ларута! Мілы мой дружа! Вось я і ў дарозе. З прагнасьцю гляджу ў вакно, глытаю насалоду краявідаў і вольнае паветра, якога так мала ў вагоне.*

*Думкі часта варочаліся да непрыемнага паседжаньня. Усё больш сьпее жаданьне не працаваць больш з Д.*

*[...] Для іх геалогія чацьвярцёвая — нішто. Змагацца з ветракамі, як Дон-Кіхот, я таксама не хачу. Абаперціся мне німа на каго.*

*[...] Ну, што ж? Здавацца ня буду ніколі. Так сваім шляхам і пайду. Нікому ніколі не навязваў я свагх поглядаў. Ня буду гэтага рабіць і зараз... Пайду я сваім шляхам...*

*Калі будзе магчымасьць працаваць у Громава*[1]*, Герасімава*[2]*, обо Маркова*[3] *— пайду да іх. Але таксама не здаючы пазіцый прынцыповых...*

*[...] Калі ж добрых умоў не прапануюць, буду працаваць па-ранейшаму, скарыстоўваючы матар'ял шчылін для сябе і адстойваючы правы чацьвярцёвай геалогіі.*

*[...] Ну, досыць ужо пра справы гаманіць. Але вельмі мяне ўразіла гэтая парада. Убачыў зьвярыныя клыкі і лычы. Ну, ніхай ім трасца. Усё роўна сам я рабіць ім зла ня буду.*

*5.VIII.59. 10 г. 30 хв. веч. Горлаўка. № 20.*

*Добры вечар, дарагія родныя! [...] Аглядалі жалезабетонныя трубопроводы, якія цягнуцца на некалькі кіламетраў, у надзвычай разрэзаным, перасечаным рэльефе. Стан пабудоў добры. Чуецца, што зроблена шмат, але і недаробленага нямала.*

*[...] Па абедзе паехалі на агляд балкі Навуміхскае. Балка прыгожая, густавата заселеная, але неупарадкаваная, мясьцінамі забалочаная. Па балцы многа стаўкоў-прудоў з працьмай качак. Мала садоў, мала гародаў добрых. Насельніцтва здалося мне бедным.*

*У адным месцы сабраў крыху краменьчыкаў маладых, часу бронзы. Можна б было сабраць больш, але мы сьпяшаліся. Некалькі разоў ішоў дождж, часам моцны.*

*Пасьля агляду балкі Навуміхскай, зноў аглядалі пабудовы. Шмат зроблена, нават вельмі, — вада падаецца, але даводзіць усё да поўнага ладу яшчэ трэба. Вада весела бяжыць па каналу, нясучы жыцьцё Данбасу. Вада тут дужа патрэбна — столькі з ёю можна*

---

[1] Громаў Валяр'ян Інакенцевіч - геолаг, палеантолаг, загадчык лабараторыі Геалагічнага інстытута АН СССР (Масква), доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар.

[2] Герасімаў Інакенцій Пятровіч (1905-1985) — географ, геамарфолаг, глебазнаўца, дырэктар Інстытута геаграфіі АН СССР (Масква), акадэмік АН СССР (1953), прафесар.

[3] Маркаў Канстанцін Канстанцінавіч (1905-1980) — географ, геамарфолаг, прафесар Маскоўскага універсітэта, акадэмік АН СССР (1970).

*зрабіць. А без вады нават лісьцё на маладых каштанах бурэе, лісьцё на кустах сірэні сохніць. Сёньняшні дзень ажывіць расьліннасьць.*

*Уразіў мяне канал, схаваны пад зямлёю. Колькі пакладзена людское працы...*

*Агульнае ўражаньне станоўчае. Але дараблящь усяго на цэлы год хопіць...*

*[...] Ну, вось і набліжаецца да канца мой побыт у Горлаўцы. Гэты побыт цікавы з боку будаўнічае практыкі. Як трэба мець на будаўніцтве службу натурных наглядальнікаў за паводзінамі пабудоў, — але такой службы німа, і многія цікавыя зьявы застаюцца неадзначанымі або недастаткова вывучанымі. Гэтым павінны займацца гідратэхнікі.*

*Уразіў мяне вялікі ўдзел жанчын у складзе рабочых — хто ж будзе ствараць сям'ю, гадаваць дзетак? Ці не надта мы перагрузілі кволыя плечы жанчыны? Мне неяк заўсёды няёмка... I шкада, шкада. "Для хлеба, для хлеба "...*

*Ну, дык дабранач, мае родныя, дарагія. Сьпяшаюся ў Чаркеск, каб хутчэй вывучаць чацьвярцёвыя адклады, перш-наперш — тэрасы Кубані. Так яны і вабяць мяне...*

*З якой прыемнасьцю пабыў бы я хоць адну суботу і нядзелю разам з Вамі, пасядзеў бы пагаманіў і... зьбегаў у баравікі, у грыбы...*

*Цалую Вас усіх моцна, абыймаю.*

*Ваш Гурык*

*12.XI.59. Масква. Курскі вакзал. Цягнік № 13 (Тбілісі), вагон 6, месца 21. 7 г. 35 хв. веч.*

*Дарагія родныя! [...] Зноў лёс зрабіўся ласкавым да мяне — і ўсе мае патаемныя намеры (больш дакладна вывучыць украінскую частку Дняпра, каб потым падыйсьці да беларускай, да Сожу, Прыпяці, Дзясны) могуць зьдзейсьніцца.*

*Ну і прыемна, што ў крытычны момант Г.А.Руссо*[1] *ўспомніў пра мяне...*

*Дык настрой мой узвышаны, цьвёрды, але цьвярозы. Як я рад магчымасьці пазнаць мілы і родны Дняпро, дадаць кроплю ў мой твор пра прарэкі...*

*Ура! Ура!*

*Ну, ужо больш пісаць не магу — зараз едзем...*

*Цалую ўсіх, абыймаю, вітаю*

*Ваш Гурык*

---

[1] Русо Г.А. — адзін з кіраўнікоў "Гідрапраекта".

*22.XI 1.59. Харкаў, вакзал. 1 г. веч. № 1.*

*Дарагая, любая Ларута! Добра прабылі ў Харкаві амаль 2 дні. Усе справы зрабілі, — і добра, што мы сюды прыехалі — гэта дапамагае шыбкасьці вышуканьняў. 10.1.60 г. трэба ўжо здаць запіску аб выборы створа Кіеўскай ГЭС, — прыдзецца пісаць яе мне самому. Не знайшлі мы тут месца ні ў адным гатэлю, хоць усё аб'езьдзілі. Прышлося мне пераспаць на вакзале, у пакоі транзітных пасажыраў.*

*14.11.60. Дымер. Гатэль. №8. 9 г. 30 хв. веч.*

*Дарагія родныя! Сёньня паехалі мы з В.А.Дурантэ[1] ў Кіеў, у наведкі да нашае фондавае групы.*

*[...] Зайшліў Успенскі(?) сабор, пабудаваны ў 1862 г. і расьпісаны Васняцовым, Катарбінскім, Несьцеравым і інш. выдатнымі майстрамі.*

*У саборы толькі што скончылася служба. Два папы давалі цалаваць крыж. Нейкі прыгожы юнак чытаў псалтыр. [...] У бакавым прыдзеле ішло набажэнства, сьпяваў хор жаночы, поўна было людзей.*

*15.11.60. 11 г. веч. Дымер, гатэль, № 8. Ліст № 4.*

*Дарагія родныя![...] Езьдзілі сёньня на левы бераг Дняпра.*

*[...] Так прыемна, захопліваюча цікава было мне знаёміцца з мілым Надднядпроўем. І паветра тутэйшае здаецца мне дзіўным, лёгкім, бальзамічным, родным. Чую блізкасьць радзімы ў прыродзе.*

*[...] Развітаўшыся з вышукальнікамі (нялёгка ім жывецца, німа лазьні ў сяле, кепскавата з харчаваньнем, глухавата), паехалі да мясцовага рыбака — Паўла Іванавіча Рыбака.*

*[...] Да чаго гасьцінна яны нас прынялі. Асабліва ласкавай была гаспадыня. Як толькі яны нас частавалі. Далі сапраўды ўкраінскі боршч з добрым кавалкам разварыстага мяса (я такога зроду не еў!). Далі бульбу з мясам, навАрыстую, накшталт жаркога. Белы вясковы хлеб. І сьвежае халоднае малако па вялікаму кубку. Пасьля рэстаранаў ды чайных такі абед здаўся мне проста выключным. Ну і самагону 2 пляшкі было, але я не піў.*

*Чуў я прыгожую ўкраінскую мову. Дужа пацярпела сяло ад гітлераўцаў — усё было спалена. Ненавісьць да ворага і да гэтага часу не згасла.*

---

[1] Дурантэ В.А. — геолаг "Гідрапраекта".

*18.11.60. 11 г. веч. Канеў, гатэль, нумар 15. Ліст № 7.*

*Дарагія родныя! Добры вечар! Вось мая Вам чарговая справаздача.*

*Сёньня раніцою паехалі ўніз па Дняпры, на аўтобусе, да магілы Тараса Шаўчэнкі. Быў густы, густы туман.*

*Праз 20 хвілін былі ўжо каля запаведніку Шаўчэнкі. Узьнімаліся па лесьвіцы, на якой 137 прыступак. Абапал лесьвіцы кусты, далей лес па рову.*

*Узьняліся на гару. Убачылі пахілую фігуру Тараса на высокім, тыпу абеліску, пастаменце. Непадалёка каменны двухпаверхавы будынак музэю.*

*Як наблізіліся да помніка, зьнялі шапкі, разам ўсе 6 чалавек, і хвіліны 3 стаялі моўчкі, урачыста.*

*Потым пачалі ўзьнімацца да магілы, не надзеваючы шапак. На пліце надпіс, каб памянулі песьняра ў новай, братняй сям'і "нязлым, ціхім словам " і подпіс-аўтограф, такі скромны, індывідуальны.*

*Унізе на пастаменце ўразіў мяне надпіс з дзёньніка Шаўчэнкі, па-руску, з запісу 1857 году. Зварот да вялікага Фултона і вялікага Уата, што іх геніальныя вынаходкі прывядуць да зьмены ўсяго сацыяльнага ладу, якая зруйнуе бізуны, троны, панаваньне, а "дипломатами и помещиками только закусит". "Пророчество мое сбудется непременно". Мы ў гэтым ужо пераканаліся. Мяне ўразіла веліч і глыбіня поглядаў Шаўчэнкі, яго сапраўды рэвалюцыйная сутнасьць.*

*Помнік зрабіў Манізер*[1] *у 1939 годзе. Да таго стаяў помнік-бюст Тараса ў шапцы, а яшчэ раней быў проста крыж.*

*Кажуць, што на тым месцы, дзе зараз музэй, была некалі пасека. Да старого пасечніка наведваўся ў госьці Шаўчэнка, — яму там падабалася. Некаму са знаёмых Тарас сказаў, што хацеў бы быць пахаваным там.*

*Другі выканалі жаданьне. А пасечнік быў спачатку тлумачом і ахоўнікам магілы свайго прыяцеля.*

*Музэй рэмантуецца. Нас пусьцілі агледзіць. Але ўсе экспонаты пахаваны. Рыхтуюцца да 100-годзьдзя сьмерці (10.III.1861) і блізка 150-годзьдзя нараджэньня (9.III.1814). Тарас зрабіўся геніем свайго народу.*

*Сыйшлі мы з гары і пайшлі да с. Пекары, аглядаючы нешматлікія абгаленьні гляцыядыслакацый. Назад ішлі пехатою кіламетраў*

---

[1] Манізер Мацвей Генрыхавіч (1891-1966) - расейскі скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1933), народны мастак СССР (1958), акадэмік Акадэміі мастацтва СССР (1947); зрабіў помнікі Т.Шаўчэнку ў Харкаве (1935), Кіеве (1938), на магіле каля Канева (1939).

*7. Крыху стаміліся. Адчуваецца набліжэньне вясны. Птушкі па-веснавому сьпяваюць. Галубкі варкочуць. У палыньнях плаваюць дзікія качкі (іх нельга біць).*

*Усьцяж дарогі сустракаліся вельмі старыя ўкраінскія хаціны, покрытыя саломаю і паросльтя зялёным мохам. Такой была некалі і наша хата ў Багацькаўцы[1]. Неякай старажытнасьцю тхнула ад гэтых хацін.*

*Под нагамі мокра, растае сьнег, коўзка. Я паляцеў проста ў гразь, запэцкаў паўбока паліто і калашыну.*

*З насалодаю аглядаў абразкі шчылін. Колькі ж тут цікавага, надзвычайнага! Такога німа нідзе. Адшукаў крыху фаўны.*

*21.11.60. 10 г. веч. Дымер. Гатэль, пакой 3. Ліст № 10.*

*Дарагія родныя! Добры вечар! Вось і зноў мы ў Дымеры.*

*[...] У Кіеў прыехалі а палове першае.*

*[...] Трапілі ў экскурсійную групу. Нам прачытала спрактыкаваная экскурсаводка цікавую лекцыю, наказала кіно, павадзіла па Лаўры. Было цікавей, чым тады, калі мы з Табою хадзілі, Ларута, адны. Уразіла старадаўняя архітэктура, званіцы (96 м вышыні), меладзічнае адзваніваньне часу, фанатызм рэлігійны, найдаўнейшая друкарня (1625 г.!), будаўнічае майстэрства продкаў, магіла Качубея і Іскры (наведаньне яе Пушкіным — зараджэньне "Полтавы", зноў загучэлі словы: "... друзей с собой на плаху весть, над гробом слышать их проклятья"...) У Кіеве-Пячоры ёсьць мужчынскі манастыр на 50 манахаў, ёсьць і жаночы манастыр ў Кіеве.*

*[...] Сёньня бачыў на шляху Кіеў-Мінск новыя самыя маленькія аўтамабілі "Запарожац", досыць зграбныя, коштам нібы 5 тысяч рублёў, — мне яны спадабаліся.*

*Вітаю нашага даражэнькага, любенькага Ціку-Міку-Куламіку-Кірылку[2] з днём нараджэньня — ніхай ён будзе шчасьлівейшы са ўсіх нас!*

*Думкамі ў гэты ўрачысты дзень я з Вамі, саджу нашага нараджэнца на коніка і важу яго цэлы дзень.*

*Цалую Вас усіх моцна, абыймаю, вітаю. Хачу скарэй зьвярнуцца да хаты і нікуды пакуль што ня ехаць.*

*Бывайце, родныя, любыя!*

*Ваш Гурык*

---

[1] Багацькаўка — вёска на Магілёўшчыне, дзе нарадзіліся браты Гарэцкія.

[2] Ціка-Міка-Куламіка-Кірылка - так Г.Гарэцкі жартам называў свайго ўнука Кірыла, сына Усяслава Гарэцкага.

*27.11.60. 9 г. веч. Сяло Страхалесьсе на Цецерэві. № 16. Кватэра Вільнянскага.*

*Дарагія родныя! Сёньня ў Дымеры прачнуліся мы а палове 6-е. Зрадаваліся, што подмерзла. Роўна а 6-й прыехаў па нас шафёр 40-е партыі Георгі Георгіевіч на машыне ГАЗ-69.*

*І вось мы зноў на шашы Кіеў-Мінск. Было яшчэ зусім цёмна. Паабапал шляху лес, баравы, густы. Фары асьвяцілі амаль пусты шлях. Ідзе рэдкі сьнег. Сьняжынкі скоса ападаюць на нашу машыну.*

*Настрой прыўзьняты. Праз колькі год набліжаюся з поўдня да межаў Беларусі, да сапраўднага Палесься. Нават верш пачаў сам сабою складацца: "Родныя сьняжынкі насустрач ляцяць"... Але далей гэтага поўрадка справа не пайшла.*

*Вось прыехалі ў Іванкаў, старажытны горад Валадзімірачаў. Да адкрыцьця страўні-ідальні заставалася поўгадзіны. Мы тупалі на верандзе чайнай, у якой гарэлі агні. Быў досыць моцны мароз. Але нас да 8 г так і не пусьцілі ў цёплую страўню: так цьвёрды законы распарадку.*

*Пасьля сьнеданьня рушылі на Гарнастайпаль па досыць добрай дарозе. Вада замерзла. Мясьцінамі ў каляіны надзьмула гурбы сьнегу. Так рэзка зьмянілася надвор'е. Але мы радаваліся — можна будзе працаваць. Наш Георгі пахваляўся сваімі дасягненьнямі. Ён шафёр 1-га класу, зарабляў не менш 2 тыс. у месяц, езьдзючы на аўтобусах Масква-Разань. Вазіў людзей пазьней на аўтобусе да УСГВ (ВСХВ). Садзіў у аўтобус замест 60 да 100 чалавек і больш. Браў са ўсіх па рублю (езьдзіў без кандуктара), а выдаваў квіткоў 20-30. Кожны дзень клаў у кішэню па 600 рублёў — грошы, якія належалі б дзяржаве. Нарэшце — заўважылі і звольнілі.*

*На крадзеныя грошы накупляў за пайцаны крадзены будаўнічы матэр'ял і пабудаваў дом. І яшчэ пра розныя свае ўчынкі апавядаў з захапленьнем...*

*Шафёр — ліхач. Нястрыманы. Крыўдлівы. Хоча кінуць працу ў экспедыцыі, паступіць на завод. Недысцыплінаваны. Ня слухаецца Савенкава[1]. Грубіць. І г.д. Вось якая цаца. Але спрытны, разумны, кемлівы, хітры.*

*Страхалесьсе — досыць глухая веска. Німа лазьні. Німа страўні. Нечага купіць.*

*Вышукальнікі цярпліва ўсё выносяць. Працуюць вельмі добра, заўзята. Але нудзяцца па культурных умовах.*

---

[1] Савенкаў - геолаг "Гідрапраекта".

*[...] Аб'езьдзілі ўсе шчыліны. Буравікі добра сьвідруюць. Але шкада іх — мёрзнуць, бедныя, дрэнна апранутыя, гразныя. І тут жа — калектаркі, змучаныя, заімшэлыя. Суровая наша праца.*

*Ужо адчуваецца сапраўднае Палесьсе. Многа балот, сасоньнікаў, грыў, эолавых узгоркаў, нізін, — і скрозь — вада, пясок, як пануючыя стыхіі.*

*Вёскі раскіданыя па грывах, грудках, узвышшах. Усё менш хатак украінскага тыпу, пабеленых. Пераважаюць драўляныя хаты, старанна зробленыя, акуратныя. На высокіх дрэвах — хаткі з гнёздамі буслоў.*

*[...] Напісаў апошняе заданьне 32-й экспедыцыі на вышуканьні па міжрэччу Цецераў-Прыпяць. Адчуваю сябе добра. Не стаміўся, не застудзіўся.*

*Заўтра а 1-й г. раніцы выезджаем у Чарнобыль, дзе адбудзецца спатканьне з вышукальнікамі левага берагу Прыпяці. Дамо і ім апошняе заданьне. Агледзілі цікавыя абгаленьні каля Чарнобыля, а 12-й гадзіне паедзем на Дымер.*

*Ну, вось і ўся мая кроніка. Купіў Вам у падарунак 2 кг сушаных дулек, такіх смашных...*

*Дабранач, дабранач, мае родныя!*

*Цалую Вас, абыймаю, вітаю.*

*Ваш Гурык*

*28.11.60. 10 г. 30 хв. веч. Дымер, гатэль, покой 3. Ліст №17.*

*Дарагія родныя! Добры вечар зноў з Дымера. Сёньня ўсталі дужа рана, а 6-е гадзіне. Але выспаліся ў спальных мяхах добра.*

*[...] Ехалі праз лясы, пералескі, палеткі, раськіданыя вёскі, якія нібы ратуюцца ад палескай вадзяной стыхіі на ўзвышшах. Скрозь па нізінках вада. Лёд тонкі, пад машынаю праламываецца.*

*Многа праяжджалі маладых сасновых пасадак, лес тут не надта густы і ня дужа стромкі. Масты ў большасьці занядбаныя, ледзь ліпяць. Увесь час мы аб'яжджалі ваду.*

*Падвезьлі дзьвух бабулек, неспадзявана для іх — былі ўзрушаны. Адна бабулька вязла старого пеўня ў Чарнобыль.*

*Праз р. Уж пераехалі па лёду, але ўжо гэта апошнія пераезды. Чарнобыльскае ўзвышша маляўніча пануе над усім палескім краявідам. Прыгожы гарадок, компактны, з паднoўленаю царквою, з аднапавярховымі камяніцамі ў цэнтры.*

*Чарнобыльскае ўзвышша ўтварылася дзякуючы ледавіковым парушэньням, — гэта марэна напору.*

*Праз Прыпяць пераезд ужо забаронены. Таўшчыня лёду 10-12 см. Многа трэшчын. Машыны ўжо ня ходзяць.*

*Каля 1½ гадзін аглядалі абгаленьні на правым беразе Прыпяці.*

*[...] Аб 11 г. 48 хв. выехалі на Дымер; разьвітаўся, пажадаў посьпехаў, падзякаваў за посьпехі, наказаў найхутчэй на гэты бераг Прыпяці. Так і не задалося мне наведаць Беларусь... Перашкодзіла вясна, адсутнасць пераезду праз Прыпяць.*

*7.IV. 60. 9 г. 40 хв. веч. Чарнобыль. №2. Гатэль.*

*Дарагія мае родныя! Сёньняшні дзень — да 2 гадзін — прабыў у Дымеры. Гаманіў з геолагамі, сьвідравальшчыкамі, начальнікамі партый 35-е экспедыцыі. Высьвятліў, што зроблена, што трэба зрабіць па ранейшых заданьнях (1050 паг. м.), выдаў новыя заданьні — забясьпечыў працаю ўсю экспедыцыю на красавік і частку маю, — ну а далей пачнецца ўжо пераезд на Караганду.*

*[...] Палесьсе зусім асобнае, але яно яшчэ мёртвае, чорнае, поўнае пылу. Ветрык быў невялічкі, але на зямлі клубамі ішлі струменькі пылу і дробнага пяску. Тутэйшы няроўны мікрарэльеф утварыўся з самым актыўньш удзелам ветру.*

*Палесьсе — царства пяску і вады. Пяшчаная стыхія — страшная.*

*[...] Сёньня — нейкае сьвята, многа народу ідзе ў царкву, асабліва жанчыны. Жанчына — ахова старыны, традыцыі, мовы, звычаяў, стылю жыцьця, нацыі, таксама і рэлігіі.*

*Дужа я рад, што ўжо ў самым сапраўдным Беларускім Палесьсі буду.*

*Цалую Вас усіх, абыймаю, лашчу, вітаю.*

*Бывайце, родныя мае, любыя.*

*Ваш Гурык*

*10.IV.60. 11 г. 15 хв. веч. Чарнобыль, гатэль. Ліст 5.*

*Дарагія родныя, добры вечар! [...] Нешта мне рана неяк сумна па хаце, па родных зрабілася... Але я разумею, што сумаваць нельга, трэба ўпарта працаваць, шукаць, думаць.*

*[...] Вось і перайшоў я такую важную жыцьцёвую мяжу, як 60 год. Вясёлага тут мала. Гэта ўжо бясспрэчны пачатак старасьці. І трэба ў гэты час умець абмяжоўваць сябе, прыстасаваць намеры і жаданьні да ўзросту. А мне так ня хочыцца гэтага рабіць. Няўжо я стары, старык, дзед нязможны? Розумам уяўляю, што гэта так. А пачуцьцё ўсё йшчэ ня можа зьмірыцца... Але трэба.*

*Ну, ніхай будзе так — падпарадкуюся законам жыцьця. Ніхай ідзе няўхільнае.*

*Колькі прыгожых украінскіх сьпеваў наслухаўся я па радзіо, як яны кранаюць сэрца...*

*Дык дабранач, мае родныя, дарагія.*

*Цалую Вас усіх, абыймаю, ласкава ўкланяюся Вам з падзякаю за усё добрае, што Вы мне так шчодра даеце.*

*Ніхай Вам усім будзе добра!*

*Ваш Гурык — стары і малады разам (усё ж ня зусім стары...)*

*11. IV. 60. 10 г. раньня. Чарнобыль, гатэль. Ліст 6.*

*Дарагая мая, любая Ларута! Прыгожы мой Здрыжнічак! Мой любы дружа!*

*Неспадзявана сёньня на Чарнобыльскай пошце атрымаў пакет, перасланы сюды з Дымеру. У пакеце былі: вітальная тэлеграма Аддзелу геалагічных вышуканьняў, Аддзелу інжынернай геалогіі, Экспедыцыі 35, М.В.Рабкова[1] і С.Р.Сакалова[2], Твой дзіўны ліст.*

*Прыйшоў я вось зараз у свой гатэль, сеў у пакоі на дыван і ўсё прачытаў. І так мне добра зрабілася. Такія цёплыя былі вітаньні ад Серафіма Рыгоравіча і Мікалая Васільевіча...*

*А Твой ліст зусім ўзрушыў мяне, усхваляваў. І вось я вырашыў зараз жа напісаць Табе. Як мне добра, як ласкава, прывабна жыцьцё, усё навакольле.*

*Добрая мая, добрая Ларута! Родная мая, ласкавая, разумная, пяшчотная. Укланяюся перад Табою, нізка, нізка, з бязмежнай удзячнасьцю. Колькі чыстаты і прыгажства ў Табе, колькі шчырасьці. Сьветлая мая Ларута, сьветлая, крышталёвая.*

*Тулюся да Цябе і моўчкі так, моўчкі сяджу, доўга, доўга. Мне так хороша з Табою, так хороша, шчасьліва...*

*Не адчуваю зараз сваіх 60 год, мне значна менш, я маладзейшы, — як і Ты.*

*... Некалькі разоў перачытаў Твой ліст. Божа мой, няўжо гэта ўсё мне, такое багацьце!*

*І родных нашых Ты ўспомніла, маму, бацьку, Максіма, Івана... І Ганулю б была цяпер з намі. Мучаніца наша Ганначка, — ахвяравала сябе поўнасьцю для брата, і Ты сябе ахвяравала для мужа.*

*Ты заўсёды так цёпла адносілася да нашых родных, была сапраўды роднай ім — гэта такая добрая рыса ў Табе.*

---

[1] Рабкоў Мікалай Васілевіч — геолаг "Гідрапраекта".
[2] Сакалоў Серафім Рыгоравіч — геолаг "Гідрапраекта".

*Чамусьці я не адчуваю, што 60 год гэта ўжо многа, толькі ўсьведамляю гэта. Але, канешне, прайшлі мы німала, і перашкод было досыць многа.*

*І добра, што мы зараз такія. Будзем удзячны лёсу, што мы дадыбалі так далёка, што мы маем ад жыцьця шчодрыя падарункі, нашых сыноў — сакалоў, нашу сям'ю, нашы адносіны.*

*Дарагая, родная мая Ларута! Ніхай беражэ Цябе лёс і мы самі. Беражы сябе і сама Ты, не стамляйся, адпачывай, не раздражняйся, больш бывай у гасьцёх, у тэатры, на канцэртах.*

*Ня крыўдуй, што я ўсё ў дарозе. У гэтым, у геалагічных шуканьнях, найбольшая мая насалода. Я рад магчымасьці больш бачыць, крыху больш зразумець.*

*Вось я ўжо зусім наблізіўся да Беларусі, маленькі кавалачак яе геалогіі буду дасьледваць.*

*Шкадую, што так позна. Бо сілы мае ўжо ня тыя. Але яшчэ многае магу пабачыць на Беларусі, многае зразумець. Нават ня бываўшы ў многіх кутках Беларусі, буду ведаць пра іх па літаратурных крыніцах.*

*...Сёньня машыны ў Камарын будуць ісьці паміж 12 і 2 гадзінамі дню. Калі не задасца паехаць сёньня, дык паеду заўтра.*

*Сёньня раніцою даў заданьні на камеральную апрацоўку матар'ялаў, каму, што і калі зрабіць, што адбіраць на аналізы, дзе сьвідраваць далей. Цяпер я магу быць супакоеным, што ўсё зробюць.*

*Сам я, як бачыш, зрабіўся досыць гультайным. Мала рухаюся, шмат сяджу ў гатэлю, многа чытаю, ежджу ў кабінцы. Але пасьля 60 год, відавочна, так і трэба.*

*Думкамі я часта з Вамі, мае родныя. Але прабыць мушу тут як мага больш, бо гэта — рэдкая і апошняя магчымасьць сьвідраваньня на Беларускім Палесьсі.*

*Дык бывай, мая Ларутанька, мая родная! Бязмежна Табе дзякуй, мой верны, аддангы дружа, Зараначка мая ясная, зорка мая ранішняя і вячэрняя.*

*Бяру Цябе моцна за руку і ідзем мы з Табою ўсё далей і далей, да захаду нашага жыцьця.*

*Ласкава Цябе цалую, родная мая, тулю, хаваю.*

*Твой Гурык*

*12.IV. 60. Саўгас Пасудава. 8 г. 40 в. веч. Ліст 7.*

*Дарагія мае, любыя родныя! Учора а 2-й гадзіне дню пераплылі мы на пароме Прыпяць каля Чарнобыля і пад'ехалі да чыгункі Оўруч-Чарнігаў (яе Вы лёгка адшукаеце на карце), а потым пераехалі яе і паехалі ўсьцяж насыпу па шашы. У в. Гарадчаны згрузілі капёр і ўсё абсталяваньне дзеля сьвідраваньня шчыліны 1004; пакінулі там брыгаду вышукальнікаў.*

*Каля в. Гарадчаны доўгае, але вузкае болота, на тым баку якога ўжо пачынаецца Беларусь. Якраз на мяжы рэспублік, на шашы мост, але ён разабраны. І каб трапіць у вёску Пасудава, нам прышлося аб'яжджаць болота аж кіламетраў 9!*

*Вёска Пасудава цяпер частка саўгасу. І тут згрузілі мы капёр, брыгаду, маёмасьць сьвідравальшчыкаў (яны ўсё возюць з сабою). Скора і сьцямнела.*

*Пачалі шукаць кватэры. Вёска Пасудава была двойчы спалена ў часе вайны. Новыя хаты вельмі малыя, дрэнна збудаваныя, з саламянымі стрэхамі, непрывабныя, параськіданыя.*

*Спаміж гэтых хат заўважыў я одну з маляванай прыбудоўкаю, і пайшлі мы разам з С. І. Сусаковым*[1] *у гэту хату. Нас гасьцінна сустрэла гаспадыня, пусьціла начаваць.*

*Нам так было добра. Гаспадыня Серафіма Іванаўна — загадчык магазіна, гаспадар Антор Рыгоравіч Гаўрык (так зваў мяне бацька і цяпер заве Самусь*[2]*) — трактарыст. Абодвум гадоў па 40-42. У іх двое дзетак: сын у арміі, ў Маскве, шафёрам; дачушка скончыла 10-годку і цяпер у Алма-Аце, жыве ў дзядзькі і працуе на заводзе сьлесарам-мэханікам. А бацькі засталіся адны. С. І. і А. Р. прыгожа гавораць па-беларуску.*

*Каб ня было сумна, яны пусьцілі ў сваю першую хату кватарантку з дачушкаю. Кватэрантка Вольга Міхайлаўна Зуева з-пад Дарагабужа, гадоў 40, прыгожая жанчына-адзіночка, пакінутая мужам, уцякла з Смаленшчыны летась ад галадоўкі, а цяпер працуе рабочай у саўгасе. Вольга Міхайлаўна сухая, худая, змучаная, зьнядоленая — зусім не сьмяецца. Гаворыць мешанаю моваю, руска-беларускай.*

*А дачушка яе Таццяна, гадоў 11, вучыцца ў 3-ім класе, па-беларуску. Жвавая, ласкавая, разумная. Гаворыць добра па-беларуску, ужываючы некаторыя, палеска-украінскія словы: "се" — гэта, цэ; "сей" — гэты, цэй; "е" — ёсьць; "буў" — быў і г.д.*

---

[1] Сусакоў С.І. — геолаг "Гідрапраекта".

[2] Самусь — Каляснёў Самусь Георгіевіч, загадчык кафедры эканоміі Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі, акадэмік УСГА (1958), прафесар, сябар Г.Гарэцкага з юнацкіх гадоў.

*Гэта шчабятуха паказала мне ўсе кніжкі-падручнікі, беларускія. А потым начала рабіць пераказ твораў Пушкіна, Некрасова і інш., якія ёй найбольш спадабаліся. Лістае рускі падручнік, а гаворыць мне, перакладае па-беларуску — пра рыбака і рыбку, пра Мазая і зайцоў і г.д. Да чаго ж добра яна перакладала. З замілаваньнем слухаў яе я і быў шчасьлівы.*

*Сёньня мы многа езьдзілі, па жудасных палескіх дорогах, былі ў самых глухіх вёсках. Многа, многа ўражаньняў. Але напісаць Вам падрабязна не змагу, бо гаспадары (павячэраўшы разам з намі) кладуцца ўжо спаць, устаюць яны а 6-й гадзіне, а зараз ужо 10, — дык мушу я ўжо канчаць.*

*Кароценька пра галоўнае скажу:*

*1) сельская гаспадарка палескага тыпу амаль не зьмянілася за 30-40 год; ураджаі нізкія, угнаеньняў мала, жывёла худая, асушаныя землі скарыстоўваюцца нядбайна, заработкі малыя (100-300 руб. за месяц);*

*2) зьнешні выгляд весак надта бедны, нічога капітальнага; вельмі пагана з апалам;*

*3) прырода асаблівая, арыгінальная; пяскі, балоты, узгоркі, грудкі, грывы, нізіны, балотныя рэчкі, качкі, буслы (іх дужа многа);*

*4) русіфікацыя вялікая; надпісы, вывескі (шыльды), аб'явы, лозунгі, дыаграмы, малюнкі — усё рускае; кніжкі ў магазінах на 95% рускія; мова афіцыйная фактычна руская; настаўнікі ў беларускіх школах гавораць па-руску; вучні таксама па-руску, асабліва ў старэйшых класах, кніжкі беларускія чытаць не бяруць; за 2 дні радзіяперадач я не чуў ні воднага беларускага слова ні ў Пасудаве, ні ў Камарыне і г.д.*

*Але мова беларуская спаміж простого народу добра захавалася, асабліва спаміж жанчын.*

*Працувцца добра. Настрой часам псуецца, успамінаюцца словы Купалы: "Няміла мне слухаць, няміла, з зямлі маей гэткі прывет..."*

*Усё больш цяплее, вады ўсё больш, пачынаецца разводдзе, але зялёнае травы яшчэ німа.*

*Ну, дык мушу канчаць. Дабранач, родныя мае. Цалую Вас усіх ласкава.*

*Ваш Гурык*

*14.IV.60. Веска Бярозкі. 10 г. веч. Ліст 8.*

*Дарагія мае родныя! Даруйце, што ўчора я Вам не напісаў. Сапраўды ня было як.*

*Учора разам з С.І.Сусаковым цалюсенькі дзень езьдзілі. Былі на ўсіх шчылінах №№ 1005-1001, у Гарадчанах, імя Кацюбінскага (Нікалаеўка), Машава, Красно, Усаў. У адной шчыліне № 1002, у Малым Машаве, дайшлі да алювію Пра-Прыпяці (гэта так мяне зрадавала). Пастаялі на берагах Прыпяці ў с. Красно. Шырынёю Прыпяць з Дон, але надта няпрыгожы колер вады — балотны, цёмна-буры, брудны, не паэтычны.*

*Увечары прыехалі ў Пасудава і ўжо зьбіраліся начаваць у нашых знаёмых Гаўрыкаў. Аж зусім пад вечар прыехалі з-за Прыпяці 3 машыны, поўныя вышукальнікаў, разам з тэхнарукам М.В.Жулевічам (маім знаёмым яшчэ па Туломе, белорусам), касірам (прывёз рабочым грошы) і інструктарам па кадрах Аўдоцьцяй Архіпаўнай. Дык прышлося і нам далучыцца да іх абозу, каб павезьці іх на новыя мясьціны шчылін.*

*У кабінку першай машыны сеў я, каб весьці ўвесь наш атрад, бо я лепш ведаю дарогу. Аж сэрца мае моцна застукала і кроў прыліла да твару, — ці добра давяду ўсіх да мэты. Разумею адказнасьць і цяжкі стан камандзіра ў паходзе.*

*Але дарогу я запомніў да драбніц і прывёў ўвесь наш абоз у с. Калыбань і далей за сяло, у поле, проста на месца шчыліны 1007. Ужо было цёмна. Дружна разгрузіліся каля Брагінскіх балот. На болотах дзе-нідзе было відаць полымя, паўзучыя агеньчыкі, што надавалі ночы таямнічасьць і ўрачыстасьць.*

*З поля заехалі мы на край сяла Калыбань, каб пераначаваць. Сьвідравальнікі ехалі з сем'ямі, з дробнымі дзецьмі (гэта майстры з Енісейскай экспедыцыі № 8). Нашы машыны адразу абступілі жанчыны, мужыкі, дзяўчаты. Мова іх чысьцюсенькая, беларуская, з такім выразам нацыянальным, непаўторным, з такою ласкаю да людзей, цікавасьцю, гасьціннасьцю сустрэў нашых вышукальнікаў — масквічоў мой народ. Зараз жа запрасілі да сябе начаваць, як гасьцей, ці родных. Так мне было хараша і прыемна.*

*С.І.Сусакоў і я трапілі начаваць да Лізаветы Аверкіяўны Пугач (ласкава Лізавету завуць тут Сыля). Яна была адна. Муж яе вартуе колхозных кароў, будзе толькі к раніцы. А сын Коля надыйшоў пазьней; ён вучань 10 класу сярэдняе беларускае школы.*

*У хаце прыёмнік "Родина"', гучыць музыка, але асьвятленьне — цьмяная лямпа. Зварыла нам Сыля бульбу, паклала сала, хлеб. І так мы смашна падсілкаваліся... Пагаманіў з Колям, ён добра гаворыць па-беларуску, крыху па-кніжнаму. А маці гаварыла народною, чысьцюсенькаю беларускаю моваю, з такім прыгожым*

*вымаўленьнем. Сэрца моё зусім размякла — я ўпэўніўся яшчэ раз у няўміручасьці беларускае мовы, у яе трываласьці.*

*Спалі мы з С.І. на адным ложку. Усталі рана, а 6-й гадзіне. Не даў спаць клопат аб справах. Пагаліўся я. Гаспадар прыйшоў, гадоў 48 яму, але выглядае старэйшым. Зноў гаманілі мы з ім пра Брагінскія балоты.*

*Частавалі нас зноў бульбаю ("салонікамі"), салам, малаком — як мы палюбілі гэтую простую страву.*

*Сёньня езьдзілі зноў амаль 13 гадзін. Я зусім загарэў. Былі ў Александраўцы, Будзе, Ст. Іёлчы, Падрубцах, Вяльмі, Галках, Асарэвічах, Камарыне, — усё па правому берагу Дняпра. Як мне спадабалася быць сярод нашага народу, якая насалода гаварыць з ім на роднай мове. Які я шчасьлівы!*

*Прыехалі а 9-й гадзіне начаваць да Рыгора Сяргеевіча Грыцаўца, яму 71 год і жонцы столькі ж. Як нас гасьцінна сустрэлі. Чым толькі не кармілі: і сырое сала з малаком (ем столькі, як некалі ў Багацькаўцы), і малако з сьметанковым сырам.*

*Па вячэры я выбраў час, каб крыху пагаманіць з Вамі. Ужо больш половы 11-е. Трэба спаць. Заўтры а 8-й зноў едзем па ўсяму Камарынска-Брагінскаму Палесьсю.*

*Цалую Вас, мае родненькія, любыя. Побыт мой тут — сьвята для мяне, сто адпачынкаў, шчасьце.*

*Не сярдуйце ж, любыя.*

*Увесь Ваш Гурык*

*19.IV.60. 7 г. раніцы. Харкаў. Холодная Гара. Філіял гатэлю "Чырвоны воін", пакой 8. Ліст 10.*

*Дарагая мая, родная Ларута! Учора а 5-й гадзіне раньня прыехалі мы (Пяшчанава, Зяблава і я) у Харкаў. У дарозе (ехалі ўдзень з 2 г.) да самага цёмнага ўсё глядзеў у вакно, на краявіды Украіны, разглядаў пачатак праяў вясны: усе западзіны (прасадачныя сподачкі — іх тут у лёсах, па дарозе з Кіева на Харкаў, асабліва па Ягосьцінскай тэрасе, процьма), ўсе нізінкі поўны водою, абы-дзе ўжо зелянея маладая трава ці паасобныя травінкі (бліжэй да Харкава вясна адчуваецца мацней) лотаць ужо зрэдку жаўцея над празрыстаю вадою, нямала буслоў...*

*[...] А сёньня і заўтры трэба будзе пісаць тут розныя даведкі і дадаткі. Раней 2-х дзён адгэтуль ня выбярусь.*

*Адразу ж паеду зноў на Дняпро і Прыпяць — гэта апошняя мая магчымасьць. Ўсе нашы вышуканьні канчаюцца.*

*[...] Дык ня крыўдуйце, што я нібы не сьпяшаюся дахаты. На Палесьсі для мяне многа цікавога, трэба зразумець прычыны забалочваньня і праводзіць мае пра-рэкі на абшары Беларусі. Я б з прыемнасьцю, радасьцю застаўся б тут да 10.V — але напэўна не дазволюць. А прасіцца буду — дык Вы ня дзівіцесь. Ногі мае ўжо ступілі на тую зямлю, аб якой я ўвесь час марыў.*

*Ты разумееш мяне, Ларута: апошняя магчымасьць пабыць яшчэ крыху на Беларусі, у самым пачатку вясны...*

*Зараз кончаю ліст, іду на працу (пачатак а 8 г. 30 хв.). Учора быў у тэатры — былом "Бярэзілі", - бачыў "Споведзь Юліана", цікава, пастановачна, але гэта — не мастацства і драматызм, людзі не адчуваюцца, ёсьць толькі дзеі, ды ідэі, наогул кепска.*

*20.IV.60. Харкаў. Укргідрапраэкт. 11 г. 20 хв. дню. Ліст 11.*

*Дарагая мая, родная Ларута! Мілы мой дружа! Учора моцна наваліўся я на працу. Скончыў запіску па вадасхову. Напісаў запіску пра палі фільтрацыі. Распачаў запіску пра насыпнаакумуляцыйную станцыю.*

*Працавалі вельмі позна, а ж да 8½ гадзін увечары.*

*[...] Спаў я моцна, добра, толькі так мала. А 7-й ужо выйшаў на працу. Ня еўшы, засьпяшаўся да Дзяржпрому. Сеў на трам № 12, які даходзіць аж да самага Дзяржпрому.*

*Людзей, як гуркоў, або селядцоў у бочцы. А трам скрыпіць, грыміць, грукаціць... Ой, ну і транспарт!*

*Гамонкі ў траме, як і скрозь на вуліцах Харкава, выключна парускy. Ехалі па нейкіх занедбалых вуліцах, з кепскімі абшарпанымі будынкамі, з разбуранымі ў час вайны (але рэдкімі) камяніцамі, — гразнаваты Харкаў.*

*Вясна пакрысе мацнее. Усё больш зялёнай травы. На таполях і бярозках во-во зьявяцца зялёныя лісточкі. Пукаюцца бутоны на каштанах.*

*Горад рыхтуецца да 1-майскага сьвята і да ленінскіх дзён. Скрозь упрыгожваюцца будынкі.*

*[...] Выеду ў Дымер заўтра, каб яшчэ раз пабыць у Палескай Беларусі, агледзіць керн, абразкі глыбокіх (да 40 м) шчылін, абгаленьні ў Лоеве, задаць яшчэ з дзесятак шчылін. Гэта будзе мае разьвтаньне з Украінскім і Беларускім Палесьсем. Як многа далі мне вышуканьні на Кіеўскай ГЭС! Дзякуй, дзякуй усяму!*

*Цяпер патрэбна мне сьвідраваньне на Беларусі, па Дняпру да Быхава і Рагачова, каб прасачыць суадносіны Пра-Дняпра з самымі старажытнымі марэнамі. Як мне гэта патрэбна!*

*Няўжо лёс зноў ня зьмілуецца і не пашле мне гэтую неспадзяваную магчымасьць ?*

*[...] Ужо даўно мне сумна па Вас. Але праца скарачае час, і я не заўважаю яго лёту. І так хочыцца праведаць больш пра мілыя прарэкі, асабліва цяпер, калі яны так трапна злоўлены каля Чернобыля і Жарой...*

*[...] Глыбока зазіраю ў Твае вачаняты, тулю Цябе, хаваю, пяшчотна цалую.*

*Бывай мая родная, любая, верная.*

*Твой Гурык*

*22.IV. 60. 9 г. 10 хв. веч. Дымер, гатэль, пакой 3. Ліст 13.*

*Добры вечар, дарагая мая Ларутанька, любая мая Заранячка, мілы мой дружа!*

*Сёньня прыехалі сюды, зноў у Дымер. У дарозі вельмі добра выспаўся, адпачыў. А вясна рухаецца наперад надта марудна. Амаль уся азіміна загінула, усё пераворана — скрозь чорная зямля. І так радасна ўгледзіць абы-дзе кавалачак зелянеючай азімкі. Нават зялёнае травы мала. Чым будзе жывіцца худоба?*

*У Кіеві нас чакала машына. Каля помніка Леніну многа-многа кветак, былі ўрачыстыя мітынгі, стаіць ганаровая варта піанераў. Шмат сустракалі мы піанерскіх і школьных ланцужкоў, прыбраных, і ў горадзе і за городам.*

*[...] З ліста П.Рагавога зразумеў, што ў Саўміне справа мая так і будзе ляжаць бяз руху, бо нават Колас нічога не мог зрушыць яе. Вырашаны лёс мой у вышэйшай установе. Дык нават і чапаць гэтую справу ня варт — **сам я нічога рабіць ня буду, ні ў якай форме**.*

*А той кавалачак часу, які нам яшчэ застаецца, скарыстаю дзеля некаторага падсумаваньня сваіх назіраньняў і развагаў. **Нічога залішняга** — як гэта разумна гаварылі старажытныя рымляне. **Навучыцца сябе абмежаваць**, каб нямногае зрабіць лепш.*

*[...] Нешта халодныя тут вечары. І ў пакоі нашым такі холад. Кончаю, каб хутчэй схавацца пад коўдру ды яшчэ і паліто накінуць.*

*Дык, дабранач, родная мая Ларута, і усе мае родныя. Ужо 10 гадзін — час спаць.*

*Цалую Цябе і ўсіх Вас пяшчотна, ласкава.*

*Твой Гурык*

*24.IV.60. 1г. 40 хв. раньня. Гдзень, БССР. Ліст 14.*

*Добрай раніцы, дарагая Ларута!*

*[...] У Чарнобылі падмацаваліся ў чайнай, крыху адпачылі і паехалі ў Гдзень, дзе стаіць атрад экспедыцыі 32. На пароме пераехалі Прыпяць. Вада ўжо дасягнула піку, але ўзровень яе ледзь-ледзь сярэдні.* ***Вялікай вады, як прадбачылі, сёлета ня будзе.*** *Вось дык прагноз...*

*Зноў уразіла вада ў Прыпяці — бурая, брудная, балацяная. Дорога да Гдзені зусім паганая. Шаша разбурана, масткі паламаныя, — ніхто не дбае тут, на Палесьсі, аб дорогах, ніхто.*

*У Гдзені, як прыехалі, запалілі ўжо элекстру. Гэта — вялізарнае сяло, спаміж балот, ля самое Брагінкі. Гдзень — першае сяло ў БССР. Але насельніцтва лічыць сябе пераважна ўкраінцамі і калгас завецца "Украіна".*

*Увечары гаманіў з селянамі, гаспадарамі хаты, дзе стаіць наш атрад. Гаворка тут усё ж беларуская, з невялічкаю дамешкаю ўкраінскіх слоў. Раней была тут беларуская школа. Але пазьней яе скасавалі і зрабілі рускую школу з украінскай мовай як прадметам. А беларускую мову не выкладаюць нават як прадмет. Гэта ўсё — уплыў камарынскага начальства.*

*Але перадачы па радзіа мешаныя — нямала і беларускіх. Учора з прыемнасьцю слухаў Мінск — толькі мала было беларускіх мелодзій.*

*[...] Сёньня — ня такі холад, але і дробны дождж. Разводьдзя ў даліне Брагінкі амаль ня было. Вада з каналаў не разьлівалася. Гэта — дрэнная адзнака, можа перасохнуць торф, ня будзе ураджаю. А шлюзы для рэгуляваньня ўзроўню вады разбураны — якое ж гэта нядбальства!*

*Такая важная меліяратыўная сістэма, як Брагінская, і неўпарадкаваная. На што ж выдаткаваліся сродкі, каб гаспадарыць так дрэнна?*

*Ужо моцна захацелася мне да хаты. Але трэба яшчэ раз падзівіцца на Беларускае Палесьсе, пабыць на Брагінскім лёсавым масыве, пабачыць абгаленьні міжледавіковых адкладаў у Лоеве...*

*Ну, ужо пад'ехала машына — едзем...*

*Бывайце, родныя мае. Бывай, мой любы дружа, мая харошая Ларута.*

*Твой Гурык*

*26.VI.60. 8 г. 10 хв. раньня. Дымер, гатэль. Ліст № 3. Нядзеля.*

*Дарагая мая, родная Ларута! [...] Учора цэлы дзень быў таксама ў ярах-равах каля Вышгараду. Але абгаленьняў там было мала. Скрозь пяскі. Толькі ў адным месцы бачыў цікавы курган, які падзяляе яр на дзьве часткі. Гэты курган складзены з марэны. А на паверхні*

*кургана скрозь валуны, як гарбузы на бахчы. Аж сэрца мае зрадавалася. Доўга шукаў там рэштак палеаліту. Знайшоў некалькі краменьчыкаў, паклаў іх у кішэню. Але зьвярнуўшыся да гатэлю і старанна памыўшы каменьчыкі, пабачыў, што ніякіх сьлядоў апрацоўкі гэтыя краменьчыкі не маюць; дык укінуў іх у памыйку.*

*Упарадкаваўшыся, пачысьціўшыся, падмацаваўшыся, пайшоўу кнігарню і купіў там украінскую кніжку — раман Юрыя Збанацкага "Малінавы звон". Лёг на ложак і чытаў гэтую кніжку аж да половы 12-е. Уражаньне такое ж, як ад "Лілі" — крышталёвая чыстата, шчырасьць, хараство. Апавядаецца пра жыцьцё — пачатак працы маладога настаўніка на Украінскім Палесьсі. Кампазіцыйна нагадвае "На ростанях" Якуба Коласа. Так мне было прыемна.*

*Вось і сёньня, як зьвярнуся з поля, буду чытаць гэту кніжку. Мова дзіўная, простая, празрыстая.*

*[...] Радзіа тут, ня ў прыклад у параўнаньні з беларускім, цалюсенькі дзень цікавае, арыгінальнае, з украінскімі перадачамі на 95%, — нават апошнія весткі перадаюць па-украінску.*

*[...] А Цябе, Ларутачка, вельмі прашу не стамляцца: перад вачыма — Твое спрацаваныя рукі і мне так сорамна за іх выгляд. Пашкадуй крыху сябе.*

*Цалую Цябе, лашчу, тулю.*

*Твой Гурык*

*4.VII.60. 8 г. 35 хв. веч. Пераяслаў — Хмяльніцкі. "Общежитие" рабочых РТС. № 13.*

*Добры вечар, дарагая, любая Ларута! Як маешся, мілы мой дружа?*

*[...] А 4 г. 15 хв. ад Жытнай плошчы ў Кіеві паехалі на Пераяслаў-Хмяльніцкі ў комфортабельным аўтобусе ("шкляным") — экспрэсе. Ехаць было дужа добра, хоць і надта хіліла да сну. Гэтаму спрыяла не толькі стамленьне ад доўгага вандраваньня на грузовой машыне, але і дождж, хмары, якія ўвесь час нас праваджалі, а ў самім Хмяльніцкім пачаўся праліўны дождж, багаты такі.*

*Дарога была вельмі цікавай. Шырачэнныя, роўныя як стэп просторы левабярэжжа Украіны скрозь акультураны. Невялічкія гарадкі, тыпу Барыспаля, акуратныя вёскі, много садоў, у тым ліку новых, ўсё засеяна, добрае жыта, пышная ярына, асушаныя балоты з найбагацейшай травою, упарадкаваныя лясы. Па культуры тут ўсё нагадвае Заходнюю Украіну. Так мне было прыемна. Усе надпісы скрозь украінскія, гамонка ў аўтобусе таксама. Гэта — народ*

*сьвядомы, пэўны. Пераяслаў-Хмяльніцкі зусім малы гарадок. Якая там вобласьць?! Толькі для гістарычнай павагі.*

*[...] Дабранач, родная мая, дабранач. Далёка грукаціць гром, але ўжо паспакойнела.*

*Цалую Вас усіх, вітаю, абыймаю. Любому Радзімку жадаю натхненьня і ўздыму ў заканчэньні дзісертацыі.*

*Бывай, родная!*

*Твой Гурык*

*5. VII.60. 10 г. 45 хв. Канеў. Гатэль. Ліст 14.*

*Дарагая, родная Ларута! [...] А 4-й гадзіне ўвечары мне далі грузовую машыну ГАЗ-63 і ўважлівы шафёр-кубанец довёз мяне за 60 км ад Пераяслава-Хмяльніцкага ў с. Лепляву над Дняпром, а потым па дамбе да самага Дняпра.*

*Ехалі пераважна па другой надпоплаўнай тэрасе, лёсавай, з пераважна добрымі дарогамі. Але траплялі і пяскі.*

*Стан збожжа тут горшы. Многа жыта вымокла. Адсеялі кукурузай. Рэдка дзе сустракалася доброе жыта. Многа засеваў кармавога, салодкага лубіну, а таксама гороху.*

*Насельніцтва тут значна бяднейшае, чым вышэй Пераяслава. Хаткі невялікія, пераважна з саламянымі стрэхамі. Дняпро-Славуціч хвалявaўся нешта сёньня надта моцна. Шырокі ля Канева Дняпро, сапраўды могутная рака.*

*Прыехалі а 6 г. 15 хв. Паўгадзіны стаяў я на беразе, чакаючы маторны човен (за перавоз 2 рублі).*

*Правы бераг Дняпра такі прыгожы, такі маляўнічы Канеў, лясы, равы, гара-магіла Шаўчэнкі.*

*[...]Падарожаю я вельмі задаволены, асабліва ппа Беларусі. А трэба было б яшчэ больш наглядзіцца. Беларусь перад вачыма як жывая, асабліва Чачэршчына і стаянкі — Юравічы і Бердыж.*

*Цалую, абыймаю, вітаю усіх Вас, мае родныя, любыя — ніхай Вам усім будзе добра!*

*Дык дабранач, мае дарагія, дабранач! Лашчу Цябе, пешчу, кладу Тваю галованьку на грудзі, тулю Твое спрацаваныя рукі.*

*Твой Гурык*

*9. VII. 60. Гор. Чаркасы. № 18.*

*Дарагая, родная Ларута! Чаркасы мне мала спадабаліся. Горад вялікі, аднапавярховы, параськіданы як вялікая вёска. Рамантуюцца дарогі, будуюцца дамы — скрозь пыл, гразна, непрытульна.*

*Поплаў таксама забруджаны і засьмечаны. Але пляж нішто сабе і на ім процьма народу.*

*[...] Калі будзе машына, дык прыеду і на Кахоўскі вадасхоў, супраць каналу Днепр — Крывы Рог, у Знаменку і Камянку. А калі не, дык пастараюся праехаць туды на параходзе або кацеры.*

*У Маскве буду 15.VII, праз 5 дзён, як вызначана ў камандыроўцы.*

*[...] Цалую, абыймаю, вітаю ўсіх Вас, мае дарагія — ніхай будзе ўсім Вам добра.*

*Твой Гурык*

*10.VII.60. 9 г. раніцы. Крывы Рог. Гатэль "Руда", пакой 8. Ліст 19.*

*Хорошая мая, мілая Ларутанька!*

*Учора прыляцеў з Чаркасаў у Крывы Рог на самалёце, а 4-й гадзіне дню. Садзіліся ў Кіравааградзе (досыць прыгожы, компактны горад, але без рэчкі). Гарачыня была страшэнная, як на зямлі (да 40°), так і ў паветры.*

*Ужо жнуць азіміну. На Украіне ішлі дажджы і ўсё палепшыла на палетках і ў городах.*

*Зьдзівіла мяне, што на Украіне каля Конева і Чаркасаў так многа сосновых густых лясоў (з неба гэта добра відаць). Тасама зьдзівіла, што лясы рэзка зьнікаюць за Чаркасамі, між імі і Кіраваградам, **якраз на мяжы дняпроўскага зледзяненьня**. Значыцца на мяжы расьлінных зон (лесастэпу і стэпу) уплывае ня толькі клімат, але і антрапагенавыя адклады.*

*[...] Пабыў у Карачунах. Але Шарыпава[1] так і не дачакаўся — ён з суседам пайшоў вудзіць рыбу. Хадзіў яго шукаць на Інгулец, каля бетоннай грэблі. У ніжнім было так там прыемна, вада цёплая, усё зарасло вадзянымі расьлінамі, як на прудзе, вада чысьцюсенькая, качкі плаваюць, жабы сочна сьпяваюць. Усё нібы паснула. Пасядзеў я на беразе, памыў рукі, ногі (яны ў мяне вельмі пылюцца і чэшуцца, усе ў маленькіх зсадзінах, я аж жахнуўся), і так мне хороша было, нібы пабываў недзе на Беларусі, у далёкім маленстве.*

*12. VII.60. 10 г. 15 хв. раньня. Крывы Рог. Крыварож. Праектн. Аддзел ОКБ. Ліст 20.*

*Дарагая мая, родная Ларута! Пішу Табе апошні ліст з гэтае падарожы.*

*У нядзелю напісаў заданьне № 88 на геалагічныя дасьледаваньні на грэблі 18 — на 2 старонках. А потым, памятаючы загад свайго*

[1] Шарыпаў - геолаг "Гідрапраекта".

*любага сынулі Радзімкі, напісаў артыкул у ДАН "Шаўчэнкаўская гляцыя-алювіяльная сьвіта на Сярэднім Дняпры — на 5 старонак. Застаецца зрабіць толькі некаторыя палеанталагічныя ўстаўкі і перадрукаваць гэты артыкул. І сам я рад, што напісаў — гэта як бы падсумаваньне ўсіх маіх асноўных наглядаваньняў па раёну Канеўшчыны."*

На наступны год у Дакладах АН СССР (1961, № 6) з друку выйшаў артыкул Г. І. Гарэцкага "Шевченковская гляцио-аллювиальная свита на Среднем Днепре", у якім аўтар піша: "Переуглубленная часть днепровской долины в полосе гляциодислокаций выполнена оригинальным комплексом осадков, который назван мною шевченковской гляцио-аллювиальной свитой по имени местности "Могила Шевченко", у которой эта свита наилучше развита" (с. 1422).

* * *

Г. Гарэцкі ўсё больш супрацоўнічаў з многімі ўкраінскімі геолагамі, географамі, геамарфолагамі, археолагамі, яго часта запрашалі на розныя канферэнцыі, нарады, паседжанні вучоных саветаў, у тым ліку і ў якасці апанента па абароне дысертацыі. Як прыклад, прывяду вытрымку з ліста да жонкі ад 23.VI.61: *"[...] Сустрэў на вуліцы Марыніча*[1]*, — Ты яго памятаеш па экскурсіі ўкраінскай. З МДУ, дзе Марыніч абараняе ўвосень доктарскую дзісертацыю, прасілі мяне быць апанентам (тэма — паўднёвае Палесьсе), — я даў згоду, так блізка кранае мяне тэма Палесься. Пагаманілі з Марынічам крыху па-украінску, па-сяброўску".* У далейшым А. М. Марыніч паспяхова абараніў у Маскоўскім універсітэце дысертацыю на вучоную ступень доктара геаграфічных навук. Ён — вядомы вучоны ў галіне геаграфіі і геамарфалогіі, член-карэспандэнт НАН Украіны, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.

І зноў праца і вандроўка па Украіне.

*"21. VII. 61. 7 г. 40 хв. раньня. Днепрапетроўск. № 1.*

*Дарагія родныя! [...] Настрой добры. Бадзёры. На пляцу перад аэрапортам помнік Цыалкоўскаму з надпісам "За эрой самолетов винтовых последует эра самолетов реактивных". Якое геніяльнае прадбачаньне.*

*Цалую ўсіх, вітаю, абыймаю. Ваш Гурык*

---

[1] Марыніч Аляксандр Мяфодзевіч (н. 1920) — географ, геамарфолаг, навуковы дарадца Інстытута геаграфіі НАН Украіны, член-карэспандэнт НАН Украіны, доктар геаграфічных навук, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны (г. Кіеў).

*22.VII.61. 9г. 40хв. раньня. Сяло Мар'янскае. № 2.*

*Дзень добры, родныя!*

*Як Вы маецеся? Я маюся добра...*

*Учора прыляцелі мы ў Крывы Рог а 10-й гадзіне. Ляцець было добра. З гары відны былі пажатыя палеткі, зялёныя квадраты кукурузы, сёлы, істужкі рэчак, плямы прудоў.*

*Надвор'е ў Крывым Розе было ўмеркаванае, але цёплае, прыемнае. Даехалі на аўтобусе да гораду, па надта паганай брукаванай шашы. Заехалі ў дырэкцыю каналу. Нас ласкава сустрэлі. Абгаварылі розныя пытаньні.*

*[...] Далі нам машыну ГАЗ-69. Па дарозе заехалі на рынак. Гразка на ім, брудна, параськідана featureнае сьмецьце, пракіслыя гуркі, недаедкі... Пры ўваходзе малады інвалід сьпявае то гнусавым, то высокім голосам жаласьлівыя песьні. Шмат жанчын, сядзяць каля столікаў і проста на зямлі, — прадаюць яблыкі, абрыкосы, гуркі, нядорага: кучачка яблык 40-80 кап. (за 10-12 штук), баначка абрыкосаў 10-30 кап. і г.д.*

*Дарога на канал хоць і бетонная, асфальтаваная, але гразная, пыльная, няпрыемная...*

*23.VII.61. 9. 40 хв. веч. Вышгарад. № 3.*

*Дарагія родныя! Учора прыехаў з аэрапорту Кіеўскага ў Вышгарад позна ўвечары. Таму заначаваў у першай хаце, у дзьвюх сясьцёр з трохгадовым дзеткам у малодшай.*

*Беднота страшэнная, цяжкое было іх жыцьцё, перажылі 3 голады, акупацыю, выгнаньне ў палон, сьмерць родных з голаду. Гразнавата. Мулка і няроўна на ложку. Страшэнны галуза трохгадовы хлопчык. Грубасьць абыходжаньня з ім, зварот да яго з лаянкай — "сволач"... Адным словам, раніцою заўтры я ад іх уцяку. А сёньня ўжо дабуду, дамучаюся, бо некуды дзецца.*

*Але затое сёньняшні дзень быў для мяне надта цікавым. Хадзіў па катлавану пабудовы амаль 10 гадзін. Зроблена ўжо шмат. Добра працуе гідрамеханізацыя. Геалёгія знаёмая ўжо. Сабраў ракушак, кераміку (пачынаючы з неаліту), косткі зьвяроў і рыб.*

*26.VII.61. 8г. 45хв. веч. Вышгарад, хата Аўдоцьці Мусьяўны Ніжнік. Ліст 5.*

*Дарагая, родная мая Ларутанька! Заўтры, 27.VII, канчаецца мой тут побыт, які крыху зацягнуўся. Але хацелася мне праведаць, што тут новае дасягнута сьвідраваньнем, што тут новага*

*паказваюць катлаваны і тыя абгаленьні, якіх я раней не бачыў, што за адклады ў раёне трагічных падзей.*

*Сёньня знаёміўся з усімі новымі камеральнымі матар'яламі, з геалагічнымі профілямі, гаманіў з геолагамі, зноў аглядаў катлаваны, асабліва абсушаны поўнасьцю катлаван шлюза, і новым карты намыву.*

*Зноў сабраў кавалачкі керамікі, косткі зьвяроў і рыб, палову людское ськівіцы (чэлюсьці) з трыма зубамі (не маладога ўзросту, але Homo sapiens).*

*Хаджу па катлаванах, дзе так мала людзей, наглядаю, зьбіраю, разважаю. Непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы знаходзяцца і два фінскіх домікі-хаткі экспедыцыі; тут жа і палявая геатэхнічная лабараторыя. На жаль, нічога ня робіцца па геалагічнай дакументацыі; умова не заключана на гэтую працу; німа ані воднага натуральнага профілю, ані воднае фатаграфіі, замалёўкі, ані воднае сабранае керамікі, або костачкі, або будзь чаго... Гэта вельмі кепска. Зусім німа геалагічнага контролю...*

*На дне абсушанага катлавана процьма замытых некалі ў Дняпры дрэваў, асабліва дубоў. Людзі выйшлі як на лесанарыхтоўку і цягнуць драўніну на бераг, складаюць штабелькамі для сябе.*

*Улужынах на дне катлавана многа рыбы, — процьма рыбакоў ловяць рыбу і сеткамі і проста рукамі. Аж шкада прыгожых дужых рыбін, якім цяжка на паверхні, яны падскокваюць, падскокваюць і паміраюць.*

*Добра працуе вадаадліў механічны. І каля ўсіх механізмаў у буйках — толькі жанчыны.*

*Дужа паганая тут ідальня; так аднамаітна, несмашна, нагана кормюць. Я ледзьве не атруціўся блінчыкамі з мясам, — аж успомніць не магу прыкрага адчуваньня. Але ёсьць і ў гэтай страўні нарзан, кефір, ражанка, — жывіцца ёсьць чым.*

*[...]Надоечы было тут вяселые — цягнулася дзён 3. Самагону было, колькі хто зможа, пачастункаў таксама. Ну і, канешне, была бойка; біліся кулакамі, рамянямі, каламі; чацьвёра гулякаў трапілі ў больніцы.*

*[...] Застаўся жыць у Ніжнікаў, бо няведама, куды тут перасяляцца. Кватэры дужа дарагія — па 150-400 рублёў у месяц за кут, або пакойчык: так многа панаехала. Сёньня начую апошнюю ночку. Але затое маю практыку размаўленьня па-украінску і наслухаюся праўдзівых апавяданьняў про жыцьцё.*

*27.VII.61. 10 г. 10 хв. веч. Канеў. Гатэль, пакой 11. Ліст 7.*

*Добры вечар, мая родная Ларутанька, дружа мой верны, найлепшы!*

*Вось я і ў Каневі, у добрым пакоі. Слухаю прыгожыя ўкраінскія сьпевы. Толькі што добра памыўся — мыў і галаву, і шыю, і ногі. Голова чыстая і сьветлая. Настрой добры, бадзёры. У сэрцы разьліваецца пяшчотнасьць да Цябе, ласка. Так захацелася пагаманіць з Табою, сказаць Табе хоць некалькі ласковых слоў... Пасьля гамонкі з Табою ў лістах мне робіцца заўсёды так добра, хороша, супакоена, сьветла, радасна. Усё паганае забываецца, жыве толькі добрае, імкненьне да найлепшага, жаданьне рабіць, дзейнічаць, тварыць, нясупынна імкнуцца ўперад, уперад. І ніякай старасьці, ніякіх гадоў я тады не адчуваю. Здаецца, што я такі самы, як у 22 і 23 годзе, калі вырасла, нарадзілася наша духоўная блізкасьць. І так хочыцца жыць, дзейнічаць...*

*Дорога з Кіева была чароўная, маляўнічая.*

*[...] Асабліва спадабалася мне дарога паблізу Канева. Узгоркі, равы, балкі, вялізарныя даліны направа і налева ад дарогі. Скрозь усё жнецца, дасьпявае, зеляне, жаўцее... Нічога пустога. Але мясцінамі хлеб перасьпеў, як мне здаецца.*

*І над усім высока паўстала вялізарная поўная луна, і страшная, і прыгожая. Чамусьці прыгадаўся вялікі Тарас. Што вабіла яго на Канеўшчыне? Ён жа тут хадзіў. Мо бачыў тыя самыя краявіды, такую ж луну... Заўтры абавязкова наведаю яго музэй.*

*[...] І канчаю гамонку, бо мой сусед ужо лёг у ложак і варочаецца ад сьвету...*

*Дык дабранач, родненькая мая, харошая, любая... Ніхай Табе сьпіцца ціха, супакойна і ніхай Табе лёгка дыхаецца.*

*Цалую Цябе, маці, бацьку. Абыймаю Вас, вітаю.*

*Бывайце родныя.*

*Твой Гурык*

*28.VII.61. 8г. 30хв. веч. Пятніца. Канеў. Гатэль, пакой 11. Ліст 8.*

*Дарагая, родная, любая мая Ларута![...] Дык павёз мяне Саша ў музэй Шаўчэнкі. Прабылі мы там крыху больш гадзіны, пакуль яго не зачынілі. Вельмі добры музэй, лепшы, чым купалаўскі, багацейшы мастацкімі творамі, асабліва скульптурай і малюнкамі. Дзесяць вялікіх заляў. Усё падабрана з вялікім умельствам і старанасьцю, замілаваньнем. Каб усё ўважліва прагледзіць, трэба мець ня менш цэлага дню на агляд. Дужа многа наведвальнікаў, экскурсантаў. Магіла і музэй Шаўчэнкі — сапраўдная сьвятыня ўкраінскага народу.*

*Недалёка пахаваны Іван Ядлоўскі, які на працягу 50 год (1883-1933) вартаваў магілу Шаўчэнкі — вось гэта адданасьць!*

* * *

У канцы лістапада 1961 г. у бацькі раптоўна здарыўся прыступ — вантробныя колікі. Брат і я адвезлі яго ў Інстытут імя Скліфасоўскага. Адтуль ён пасылаў невялічкія пісулькі.

2.XII.61. 2 г. 15 хв. дню. Субота. Ліст 4.

Дарагія родныя!

[...] І ня мог адарвацца ад чытаньня "Дневника" Т. Г. Шаўчэнкі. Так усё блізка, зразумела, нібы сам на яго месцы. І так усё жыва, вось быццам гэта ўчора было. Даўно літаратурныя творы так не захаплялі мяне. І так чыста і хороша робіцца на душы — як ачышчэньне ад усяго другараднага, як вылучэньне галоўнага ў жыцьці.

Чамусьці ўспамінаецца Янка Купала, які быў у нас бліжэй да Шаўчэнкі, чым Якуб Колас. І той незабыўны ўчынак. Ахвяры, ахвяры...

*3.XII. 61. 7 г. веч. № 5.*

*[...] Чытаньне Т.Шаўчэнкі так мяне ўразіла, што я ніяк не магу чытаць што-небудзь іншае...*

*5.XII.61. 10 г. р. № 7.*

*Дарагія родныя!*

*[...] А я ўсё чытаю Шаўчэнку, пасьля дзёньніка і лістоў больш разумею яго лёс. Зьдзіўляе мяне, што Ш. у апошнія гады больш захапляўся маляўніцтвам, чым паэзіяй. Хацеў быць сапраўдным мастаком-гравёрам. Чаму? Ш. нават зьбіраўся за межы, каб займацца там маляўніцтвам... А Іванова-мастака Ш. не зразумеў і асудзіў...*

*Сёньня буду дачытваць лісты Ш.*

*7.XII.61. 10г. 30 хв. р. № 9.*

*Дарагія родныя!*

*[...] Прачытаў Міклуху-Маклая. Вельмі цікава. Вось — сапраўднае служэньне навуцы і людзям, людзкасьці. Асабліва цікавы развагі Маклая, чаму ён рабіў дасьледаваньні па этнаграфіі і этналогіі, а не іншыя прыродазнаўчыя. Бо прырода застанецца мала зьмененай, а чалавек першабытны, яго культура, звычаі і нават фізічны тып рэзка зьменяцца ў бліжэйшыя гады. Маклай захапіў яшчэ сапраўды*

*першабытнае: карыстаньне толькі каменнымі прыладамі, з поўнай адсутнасьцю мэталу і працэс вырабу каменных прыладаў і карыстаньня імі; няўменьне штучна здабываць агонь, а толькі захоўваць яго... Выключна цікава. Каб распаліць агонь, людзі нават на далёкую адлегласьць несьлі з сабою галавешкі.*

*Але сям'я ў папуасаў была ўжо сапраўдная, хоць яшчэ абы-дзе існаваў пераход жонак ад аднаго да другога мужчыны па чарзе, з веданьнем толькі матак, а не бацькоў (конец матрыархату).*

*Учора ўвечары зрабіў спробу заняцца мартыралогіяй, шуканьнем залежнасьці доўгавечнасьці ад прафэсіі і сац. стану, на падставе зьвестак аб людзёх веку Шаўчэнкі.*

*Самы кароткі век у паэтаў і артыстаў (40-50 год); за імі ідуць мастакі (50-55) і літаратары (55-60); потым вайскоўцы (60-75) і вучоныя (60-85), інжынэры (70-90 год). Найбольш жывуць жанчыны-інтэлігенткі (70-85). Гэта — папярэдняе ўражаньне, бо я ўсіх зьвестак яшчэ не апрацаваў, — апрацую сёньня. З гэтага вынік, што на даўгавечнасьць выключны ўплыў робіць стан нэрвовай сыстэмы і што "нармальны" працяг веку нават 70-90 год... Дык захоўвайце нэрвовую сыстэму, менш раздражняйцеся, менш хвалюйцеся, больш сьмеху, жартаў, раўнавагі...*

*8.XII.61. 10г. раніцы. № 10.*

*Дарагія мае родныя!*

*[...] Учора ўвечары чытаў аповесьці Шаўчэнкі "Близнецы". Чытаю з цікавасьцю. Чуецца насьледаваньне Гогалю і Салтыкову-Шчадрыну. Не хапае толькі майстэрскай шліфоўкі, нібыта гэта чарнавікі...*

*Шлю Вам першакрыніцу марціралогіі і табліцу апрацоўкі. З 151 улічаных чалавек да 45 год памерла толькі 16, да 65 год — 56, да 95 год — 79, больш паловы. У маладым узросьце паміраюць паэты, артысты, мастакі — гэта знача, людзі з неўраўнаважанай нэрвовай сістэмай, з напруджаным нэрвовым жыцьцём.*

*Звыш 65 год пераважна жывуць: інжынеры, вучоныя, літаратары і артысткі (наогул — жанчыны-інтэлігенткі) — гэта значыць, людзі з ураўнаважанай нэрвовай сыстэмай.*

*Улічыце ўсё гэта, мае родныя, і зрабіце адпаведныя вынікі. Усё на захаваньне нэрвовай сыстэмы, асабліва дзетак, жанчын і Славіка[1]. Не сварыцеся, не раздражняйцеся, не крыўдуйце; ніколі ня бійце*

[1] Славік — Усяслаў Гаўрылавіч, старэйшы сын Г.Гарэцкага (н. 1924 г., г. Масква), галоўны рэдактар часопіса "Начальная школа", галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута агульнай адукацыі (Масква), доктар педагагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Расейскай акадэміі адукацыі, член Саюза журналістаў Расеі, жыве ў Маскве.

*дзетак і самі ня бійцеся; ня думайце паганае, змрочнае; не хвалюйцеся; больш гуляйце на дворы, чытайце доўгія старадаўнія раманы, слухайце музыку класікаў; не стамляйцеся; больш сьмейцеся і жартуйце...*

*[...] А надворе і сёньня такое паганае, што Табе, Ларутанька, ніякім чынам нельга ехаць да мяне ў наведкі. Давай пачакаем марозаў і сьнегу, каб пазьней не шкадаваць. Табе трэба так берагчыся ад гэтай неадчэпнай астмы. Думкамі я заўсёды з Тобою, Ларутанька, дык давай цярпліва чакаць лепшага часу і больш спрыяльнага надвор'я.*

*10.XII.61. 10 г. 30 хв.р. Нядзеля. № 12.*

*Добры дзень, мае родныя!*

*[...] Статыстыка — дзіўны сродак вывучэньня. Вучоныя таму выйшлі пасьля інжынераў, што ў іх групе аб'яднаны вучоныя ўсіх рангаў і катэгорый. Каб вылучыць асобна групу вучоных-натуралістаў, то яна, пэўна стала б побач з інжынерамі.*

*Жанчына жыве даўжэй, мне здаецца, не праз асаблівасьці свайго арганізму, а дзякуючы сваей сацыяльнай функцыі: а) ня ўдзельнічае ў вайне; б) ня ўдзельнічае ў бойках і сутычках грамадскага парадку; в) менш актыўна ўдзельнічае ў сацыяльнай барацьбе; г) менш атручвае свой арганізм пітвом, курэньнем, гашышам і інш.; д) менш актыўна ў палавых адносінах (а гэта захоўвае жыцьцёвую моц) і г.д.*

*А маю раду пра захаваньне нэрвовай сыстэмы Вы ўсё ж абмяркуйце як-небудзь за сталом і зьвярніце ўвагу на Славіка (першнаперш), на Лідачку[1] (таксама перш-наперш) і на дзетах (не дапушчаць дзіцячай істэрыі, ня біць іх, ня пужаць, ня крычаць на іх, не раздражняцца і г.д.). Бярыце прыклад з бацькі[2].*

*[...] Вось што напісаў С.В.Аксакаў Т.Шаўчэнку пра яго аповесьць "Прогулка"... ("Матрос"): Я не советую вам печатать эту повесть, — она несравненно ниже вашего огромного стихотворного таланта, особенно вторая половина. Вы лирик, элегист; ваш юмор невесел, а шутка не всегда забавна. Правда, где вы касаетесь природы, где только доходит дело до живописи — там все у вас прекрасно, но это не выкупает недостатков целого рассказа. Я без всякого опасения говорю вам голую правду. Я думаю, что такому таланту, как вы, можно смело сказать ее, не опасаясь оскорбить самолюбия человеческого. Богатому человеку не стыдно надеть сапог с дырой.*

---

[1] Лідачка — Лідзія Іванаўна, жонка Усяслава.
[2] Бацька — Восіп Іванавіч Парфяновіч, тата Ларысы Восіпаўны Парфяновіч-Гарэцкай.

*Имея перед собой блистательное поприще, на котором вы полный хозяин, вы не можете оскорбиться, если вам скажут, что вы не умеете пройти по какой-нибудь степной тропинке".*

*І Т.Шаўчэнка моўчкі згадзіўся з такім прысудам... П.Куліш не раіў друкаваць аповесьць Шаўчэнкі па іншых меркаваньнях...*

*Мастацкія якасьці аповесьцей Шаўчэнкі не надта вялікія. Але я чытаў іх з найвялікшай цікавасьцю, бо перада мною паўставаў жывы аўтар, з яго думкамі, успрыманьнем навакольнага, само навакольнае. Чаму Ш. пісаў па-руску? Таму, што не спадзяваўся на магчымасьць друкаваньня па-украінску. Таму ён і выбраў форму апавяданьня, а не паэмы, таму ён выразна ішоў сьледам за Гогалем...* ***Пазнаць Ш. без яго аповесьцей немагчыма****.*

*14.XII.61. Чацьвер. 12 г. дню. № 16.*

*Дарагія мае родныя!*

*[...] Многа ўчора чытаў. Дачытаў "Засьценак Малінаўкі". Зусім ня тое, што мне здалося. І ўжо — мала цікава, расьцягнута... З захапленьнем пачаў чытаць Т.Шаўчэнку "Мікіта Гайдай ", "Наймічка". Але а 10-й гадзіне ўвечары брат (здаравенны хлопец) прапанаваў мне легчы спаць...*

*[...] Зрадаваўся, што на двары — сапраўдная зіма, невялікая завіруха. Нават вароны схаваліся ад холаду на нашу лісьцьвяніцу. На падваконьні сьнег. Толькі рэдкія галубы садзяцца каля вакна — пройдуць, зазірнуць праз вакно і паляцяць: я не маю чым іх пакарміць.*

*Бачу, як людзі хаваюцца ад холаду ў цёплыя паліто... У палаце дужа сьветла ад сьнегу.*

*Увайшла сястра (не — няня) у мой пакой і кажа: "Вось палата, у якую прыемна хадзіць"... Увайшла другая няня і кажа: "Як у Вашай палаце ўсё чыста, прыбрана"... Прыйшла мая доктарка, прывіталася за руку і кажа: "Вось прыемны хворы, заўсёды бадзёры, ні на што не жаліцца... Ну, рыхтуйцеся, рыхтуйцеся да 16..."*

*[...] Учора была добрая перадача пра Грыга. А канцэрт нарады па сельскай гаспадарцы нечарназемнай зоны быў такі нікчэмны. Гэтага паганца Бруно я слухаць не магу, такая брыдота.*

*З самага раньня дачытаў "Наймічку". А таксама прачытаў "Баранка". Зараз пачну чытаць "Княгіню". А геалогію прышлося пакуль што адкласьці ў бок, ніхай ня крыўдуе.*

*[...] Чамусьці мне ўспомнілася наша жыцьцё на Кольскай паўвыспе, у Коле і Мурмашах, і як Ты, Ларута, стаіш каля ліхтара ў завірухе, у роспачы, у чаканьні, а навакол — такая мяцеліца, такі сьнег, сьцюжа, няпрытульнасьць... І мне так Цябе шкада...*

*Бывайце, мае родныя! Цалую Вас усіх моцна, абыймаю, вітаю. Ніхай бы ў Вас усё было добра, спокойна, каб ніхто не хварэў і ўсе былі ласкавымі адзін з другім, уважлівымі...*

*Думкамі я з Вамі...*

*Ваш Гурык*

*15.XII.61. 9 г. 30 хв. раньня. Пятніца. №17.*

*Дарагія мае родныя!*

*[...] Бедны сын малодшы нясе такую ж вялікую ношку безадкладных спраў, як і старэйшы. Уся наша моладзь, ды і самі мы, працуем на знос. Гэта — самая вялікая загана нашых сучасьнікаў! Усе перагружаны процьмай спраў і абавязкаў, німа націску на галоўнае, мала арганізаванасьці, няўменьне адпачываць...*

*[...] З захапленьнем чытаю Т.Шаўчэнка. І вось што прачытаў у яго пра Беларусь ("Музыкант ", стар. 280):*

*"Так как они приближалися к стране постоянно голодной, то есть Белоруссии, то, кроме инструментов, от города до города (лошадка) везла за ними и порядочный запас печеного хлеба.*

*Трогательные картины случалось ему видеть в сей убогой стране. Знаете, голод, нищета, разврат и гнусные спутники разврата. Все это я описываю в назидательном тоне.*

*Так, например, когда они проходили чуть ли не Усвяты, то, вместо того чтобы арестантам подать милостыню, толпа мальчишек с толстыми коленями бросилась к арестантам и стала просить хлеба, а когда увидели, что им давали хлеб наши арестанты, за мальчишками бросились и взрослые и старики. Голод не знает стыда.*

*Пройдя страну сетования и плача, они вступили, наконец, в благословенные пределы нашей милой Малороссии"...*

*Ой, якія сумныя малюнкі...*

*18.XII.61. 2 г. 30 хв. дню. Панядзелак. № 20.*

*Дарагія мае родныя!*

*[...] Многа чытаў. Спачатку прамову М.С., потым прагледзіў гісторыю Горы-Горацкага Земляробчага Інстытуту (якое падкрэсьлена — правінцыяльнае, убогае, выданьне, па тэхнічных якасьцях...), том Шаўчэнкі (не магу чытаць яго вершы ў перакладзе, нібы кветкі без паху, яблыкі без соку).*

* * *

У першую палову 60-х гадоў Гарэцкі пачаў пільна працаваць над серыяй манаграфій пра алювій антрапагенавых прарэк, у якіх абагульніў шматлікі фактычны матэрыял, мэтанакіравана і карпатліва сабраны ім у час інжынерна-геалагічных вышуканняў пад многія гідратэхнічныя аб'екты, зрабіў шмат важных агульных новых высноваў па чацвярцёвай геалогіі і заклаў падмурак новай навукі — палеапатамалогіі (навука пра рэкі геалагічнага мінулага). У выдавецтве "Наука" (Масква) выйшлі дзве буйныя (больш за 400 старонак) манаграфіі: "Аллювий великих антропогеновых прарек Русской равнины. Прареки Камского бассейна" (1964) і "Формирование долины р. Волги в раннем и среднем антропогене. Аллювий Пра-Волги" (1966), за якія яму была прысуджана першая прэмія Маскоўскага таварыства даследчыкаў прыроды (1968).

Нарэшце 30 ліпеня 1965 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "... отменить постановление Совнаркома БССР от 6 декабря 1930 г. в части исключения из состава действительных членов Белорусской академии наук академика Горецкого Гавриила Ивановича", а 28 верасня Прэзідыум АН БССР пастанавіў "считать в составе Академии наук БССР в Отделении химических наук..." Але цяпер ён стаў акадэмікам па спецыяльнасці не "эканоміка", а "геалогія". У 1968 г. Г. Гарэцкі здолеў вярнуцца ў Менск — спачатку жыў адзін у аспіранцкім інтэрнаце, а пасля таго, як у сакавіку 1969 г. яго прызначылі загадчыкам сектара палеагеаграфіі антрапагенавага перыяду Лабараторыі геахімічных праблем АН БССР — пе раехаў назаўсёды ў Менск, але яшчэ на 4 гады заставаўся на грамадскіх асновах галоўным кансультантам Гідрапраекта.

А перад гэтым яшчэ былі многія паездкі па Украіне...

*24.VI.65 г. 12 г. дню. Гор. Славенск (Славянск).*

*Дарагая, любая Ларута! Дарагія родныя!*

*Учора прыехаў на Курскі вакзал прыблізна за гадзіну да адыходу цягніка "Данбас". Пачакаў, надзівіўся на людзкі натоўп, на развітанні.*

*[...] Колькі хараства ў лясной зоне навокал Масквы. Як добра, што такую зону стварылі.*

*З таполяў у Маскве і пад Масквою нам у вокны ляцелі белыя лятучкі-насенне. Скрозь травы, зялёнае мора, зялёныя палеткі. Мае вочы адпачывалі на зялёным прыволлі і мітусення было менш, — асабліва, калі глядзець на цёмнае або цёмна-зялёнае. Ака вельмі змялела, звузела... Праскочылі Тулу. І паснулі. А ўсю дарогу іграла нам цягніковае радыа, перакруцілі ўсе пласцінкі, некаторыя аж двойчы...*

*[...] У Славенску ў гатэлі"Украіна" месц няма, дазволілі пакінуць там толькі чамаданы.*

*Горад нам спадабаўся, многа зелені, дрэвы ствараюць густы я прысады на вуліцах, невялічкія дамы і хаты. Многа ўкраінскіх тыпаў. Але мова гучыць не часта, пераважна ў простых людзей, асабліва ў жанчын.*

*[...] Хачу, каб скончыць тут усю працу за сёньня і заутра, а ў суботу каб быць ужо ў Беланенкі (гол. інжынер Данбасводтрэсту), скласці акт, і ў нядзелю быць ужо ў Харкаве.*

*Найбольш цягне мяне Дняпро, Канеў, катлаван.*

*[...] Ужо чвэртка першай, а харкаўчан німа. Мае спадарожнікі прапануюць нават, каб сёньня ня ехаць на споўзень. Але я настойваю, каб абавязкова ехаць. Шкада часу.*

*Цалую Вас усіх, абыймаю, тулю.*

*Дзякуй за ласкавыя праводзіны, Ларута.*

*Твой Гурык*

*29.VI.65 г. Аўторак. 7 г. рання. Славенск. Гатэль "Колас".*

*Любая мая, дарагая Ларута!*

*Дарагія, любыя родныя!*

*Учора скончылі ўсе палявыя працы. Зрабілі агляд навакол споўзьня. З высокага правага берага Паўночнага Данца, з найвышэйшых неагенавых тэрас, бачылі маляўнічую даліну ракі, з каналам, чыгункамі, возерамі, шматлікімі заводамі, гарадамі і гарадкамі, комінамі, вежамі, апорамі электраперадач, дратамі, ляскамі і садамі, — тыповы культурны краявід Данбасу...*

*Бачылі добрыя абгаленні трыасу, палеогену і неагену. Асабліва добрыя былі абгаленні найдаўнейшага алювію — палеагенавага і неагенавага. Высока некалі цяклі воды Палеа-Данца.*

*Многое ўдакладнілі ў геалогіі раёну споўзня, у магчымых межах далейшага пашырэння споўзня і г.д.*

*Прыемна было бачыць, якой высокай культуры досягнула будаўніцтва дамоў у ўкраінскім сяле Высока-Іванаўскім.*

*З радасцю наглядалі за гульнямі украінскіх дзетак, за іх гамонкамі, уражаннямі ад кіно ("доктор Зорге"), старанной гамонкай з староннімі па-руску і між сабою па-украінску.*

*З дзіцячай непасрэднасцю адна дзяўчынка крычэла другой: "Галко, іды сюды, я тобі зубы наб'ю"...*

*30.VI.65 г. 10 г. веч. Кіеў. Прасп. Дружбы народаў. Кватэра Укргідрапраекта. N° 60.*

*Дарагая, любая Ларута! Любыя, дарагія родныя!*

*Сёння а 1-й гадзіне дню падпісалі мы пратакол-заключэнне Камісіі Гідрапраекта.*

*[...] На Кіеўскі напрамак, на самолёт транзітны з Адлеру (а 2 г. 50 хв. праходзіць), ня было вольных месц. Прышлося чакаць самалёта да 4 г. 41 хв. Трапіў на яго я ў самы апошні момант, перад самым адлётам. Гэта — ІЛ. не надта камфартабельны, адны лавы па баках, і досыць ціхаходны: да Днепрапятроўску ляцелі 1 г. 40 хв., да Кіева — 2 гадзіны. Пасажыраў было зусім мала — чалавек 15, а да Кіева — толькі 4.*

*Сеў я ў самы хвост, бо адтуль лепш відна зямля. Сачыў па карце, што дзе праляталі. Гэта — надта цікавы занятак — пазнаваць, што пралятаем.*

*Надвор'е было сонечным, лецелі мы досыць нізка (метраў 300-500), і ўсё было дужа добра відаць.*

*Ужо некалькі разоў пралятаў я паўз даліну Дняпра. І кожны раз здзіўляе мяне зусім асобны тып дняпроўскай поймы, амаль выключна пяшчанай.*

*Дняпро ўвесь зарэгуляваны. Перад Днепрапятроўскам ляцелі над Днепрагэсаўскім-Ленінскім вадасховам. За Днепрадзяржынскам (кінулася на вочы полымя вялізных печак, жоўты хлорны дым некоторых камінаў, чарната гораду) убачылі вялізарную грэблю і новае возера-вадасхоў. Вада абы-дзе зялёная ад водарасцей.*

*Праляцелі над Крэменчугам, над ГЭС, грэбляй і яшчэ адным вялізным вадасховішчам. Досыць многа мелкіх мясцін, забалочаных зямель, многа зялёных водарасцей, песковых выспак.*

*Прыгожымі здаліся Чаркасы, а за імі пацягнуўся сасновы бор. Хутка ўбачылі канеўскія кручы, магілу і помнік Тарасу Шаўчэнку, музэй, новы гатэль.*

*Канеўскае будаўніцтва з-гары не спадабалася: скрозь адны пяскі і пяскі. Катлаван невялікі, ніякіх старычных*[1] *парод ня відна: малая тут будзе ў мяне спажыва.*

*[...] Кіеў прыгожы, як заўсёды, толькі ў новых кварталах мала яшчэ зялёных раслін. Помнік Хмяльніцкаму зноў здаўся прыгожым, дынамічным.*

*Абвесткі ў кіно, надпісы вуліц — выключна ўкраінскія. Але жывой украінскай мовы чуваць мала...*

*30. VI. 65. 12 г. дня. Данецк. Данбасводтрэст.*

*Любая, дарагая Ларута! Дорагія родныя, любыя!*

---

[1] Старычныя пароды — пароды, якія ўтварыліся ў старыцах ракі.

*Учора машынаю ГАЗ-69 ("Козёл") усцяж канала прыехалі ў Данецк. Вельмі прыемна было глядзець на канал, поўны вады, з садамі на абодвух баках, з зялёнымі берагамі.*

*Гэта канал — вадзяная артэрыя Данбасу, кожную секунду па ёй ідзе зараз 18 кубаметраў вады.*

*Асаблівых ускладненняў у працы канала няма; абы-дзе ёсць споўзні, абы-дзе падтапіла землі, сёлы, сады. Вялікую карысць прынёс гэты канал...*

*Прыехалі ў Данецк а 6-й гадзіне ўвечары. Начавалі ў гатэлі "Украіна".*

*[...] З 9-га наверху — дзіўны краявід на горад. Як вока стае скрозь піраміды-тэрыконы, сведкі вялікіх высілкаў людзей, многіх пакаленняў. І скрозь каміны, каміны, многія з дымам. Тахкае нястомна сэрца Данбасу...*

*У цэнтры гораду — вялікія сучасныя будынкі. А па ўскраінах — мора аднапавярховых шахцёрскіх домікаў, у садах...*

*l.VII. 65. Канеў. Гатэль, пакой 3. 8 г. 15 хв. веч.*

*Дарагія родныя! Учора начаваў у Кіеве, на кватэры Гідрапраекту.*

*[...] А 8-й на ракеце "Шторм" рушылі на Канеў. Сядзеў у самым перадзе, каб найлепш наглядаць наваколле, сачыць за мясцовасцю па карце. Асабліва цікавых антракагенавых абгаленняў зусім мала. Здзіўляюць вялізарныя споўзні, асабліва каля с. Селішча і вышэй яго.*

*[...] Першая палова дня была зусім незадашлівая. Доўга шукаў экспедзіцыю, — іх загналі на самы край гораду. Нікога з геолагаў ў экспедзіцыі ня было. Ня было і тэхнікаў.*

*Пайшоў аглядаць катлаваны адзін. А перад тым зайшоў на пошту, каб даць Вам тэлеграму (прыкладаю Вам яе, як дакумант). І ў мяне тэлеграму гэту не ўзялі, звярнулі назад: паводле афіцыйнай інструкцыі (мне далі яе пачытаць) на мовах народаў СССР можна пасылаць тэлеграмы толькі ў межах рэспублік і на мове той рэспублікі, куды тэлеграма пасылаецца. Настрой мой сапсаваўся...*

*Агледзеў вялікія катлаваны, нічога цікавага німа, адны пяскі маладой, галацэнавай поймы... Сумна зрабілася яшчэ болей... Ужо падумаў хутчэй варочацца назад...*

*І раптам заўважыў невялічкі катлаван шлюза. Пайшоў туды і ўбачыў, што пад маладым алювіем поймы з добра выяўленым базальным гарызонтам ляжыць яшчэ адзін алювіяльны гарызонт*

*(світа), таксама з базальным гарызонтам, а пад ім — дняпроўская марэна[1]!*

*Стамленне маё знікла зусім, і абыякавасць таксама. Пачаў шукаць, наглядаць.*

*Знайшоў чарапашкі, вялікі зуб маманта (кілаграмаў 5!), рогі гіганцкага аленя, некалькі пазванкоў... Так рад! Не здарма я сюды імкнуўся...*

*Працаваў да 7 г. вечара, крыху стаміўся. Павячэраў, памыўся, і вось гаманю з Вамі, слухаючы радзіа.*

*Пайду рана спаць, каб рана пачаць працу...*

*Дабранач, родныя, дабранач!*

*Цалую, вітаю, абыймаю.*

*Ваш Гурык*

*7. VIII. 65. Дарагі, любы Радзімка!*

*[...І Працуецца добра. 17-31.XI зьбіраюся быць разам з мамаю ў Адэсе — на нарадзе па неагену поўдня Украіны.*

*18. VI. 66. 9 г. 15 хв. Субота. Кіеў. Гуртажытак Кіеўскай ГЭС. Пакой № 12.*

*Дарагія, родныя, любыя! Добры вечар. Сёння а 8 г. 30 хв. рання выехаў аўтобусам з Мазыра ў Кіеў. Месца меў 3-а, першае па правай руцэ. Наглядзіўся на Украінскае Палессе, на Мазырскае ўзвышша. У лесе бачыў многа лісічак і сыраежак.*

*Аднак дарога моцна стамляе. Бо надта многа брушчаткі, рамонту, аб'ездаў. Дык і драмаў крыху, кляваў носам...*

*Ад Іванкава пайшлі ўжо знаёмыя мясціны, асабліва пасля Дымера. Кіеўскае мора вялікае і прыгожае. Толькі дорога зусім папсаваная, пабітая, і дужа многа пылу, пяску.*

*[...] Але ў кафэ п'юць украдня гарэлку і надта брыдка лаюца ўсімі матавымі словамі. Гэта так крыўдзіць, так зневажае... Няўжо і праз 100 год пасля Кастрычніка так будзе?*

*Успомніўся мне прыгожы, ціхі Дняпро каля Борхавага Рову. Сонечная раніца. Прыгажство. Рыбы процьма. Два хлопчыкі часта цягалі яе вудамі. А я разглядаў таямнічае абгаленне з пахаваным торфам. І слухаў, як адзін з хлапчукоў праз кожнае слова сыпаў матамі, якім пазайздросцілі б і дарослыя з кафэ Кіеўскай ГЭС.*

---

[1] Дняпроўская марэны — адклады, якія назапасіліся ледавікамі пры іх руху і выворванні ложа ў час дняпроўскага зледзянення, найбольш шырока распаўсюджанага на поўдзень па Усходняй Еўропе.

*Хоць я і накрычэў на таго хлопца, нічога не памагло — ён лаяўся ўсё так жа брыдка.*

*Бруд лаянкі трэба знішчаць так сама рашуча, як злачынства, туняядства. З такім брудам нельга рабіць чыстую справу...*

*18.VI.66. 10 г. 30 хв. веч. Нядзеля. Кіеў. Гуртажытак Кіеўскае ГЭС. № 18.*

*Дарагія родныя, любыя!*

*Сёньня аглядаў Кіеўскую ГЭС і яе ваколіцы. Прыемна было наглядаць, як многа зроблена. Вялікая земляная грэбля. Шлюзы, гэс, аванпорт, Кіеўскае мора, гарадскога тыпу пасёлак, частка ГАЭС...*

*Мора вялікае, з чоўнамі пад белымі ветразямі, параходамі, ракетай, значнай колькасцю турыстаў, зусім своеасаблівым краявідам.*

*Усё мне тут знаёмае, часам да дробніц, як было. Пахадзіў па абгаленнях, па равах, па садах, па лесу. Знайшоў некалькі суніц, тры добрых абабкі, многа сыраежак.*

*23. VI. 66. 8 г. рання. Пасёлак Кіеўскай ГЭС. Пошта. № 23.*

*Дарагія родныя!*

*[...] Учора бачыў партрэты Купалаўцаў*[1] *на ўсім Хрышчаціку і на вул. Леніна, вельмі добра падабраныя: 3.VII. яны прыяжджаюць на гастролі ў Кіеў. Публіка спыняецца каля партрэтаў, здымкаў асобных трапных тэм і хваліць тэатр. Мне прыемна...*

*Надвор'е дзівоснае. Але мне так захацелася дахаты, што кінуў бы ўсё і хутчэй дадому. Гэта таму, што не маю лістоў.*

*Моцна ўсіх цалую, абыймаю, вітаю.*

*Ваш Гурык*

*27. VII. 66. Серада. 9 г. 30 хв. № 4.*

*Дорагія родныя!*

*[...] Ехалі да Белай Царквы 120 км. Бачылі парк Качубея, дзе Орлік у замку рабіў яму допыт — замку ўжо німа. Нічога паэтычнага ў Белай Царкве не засталося, — толькі ў вершах Пушкіна яно ...*

*16. VIII. 66. 4 г. дню. Аўторак. КрэмГЭС. Камера шлюза. Пароход "Чарнышэўскі", каюта 1 кл. № 3. Ліст 19.*

*Дарагія, любыя, родныя!*

*[...] Наглядзеўся прыгожых краявідаў, вялікіх (хоць і рэдкіх) абгаленняў, наслухаўся гамонак хваль. Крамянчугскае мора — самое*

---

[1] Купалаўцы — артысты Беларускага нацыянальнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы ў г. Мінску.

*вялікае на Дняпры, часамі зусім ня відна было берагоў. Адны рэдкія чайкі над вадою, ды паадзінкавыя белыя мятлушкі...*

*Адна бяда — уся вода зялёная ад водарасьлей, часам іх так многа, што аж смярдзіць, трываць нельга.*

*29. VI. 67. 7 г. 50 хв. р. Шлях у 5 км ад г.Борзна ў бок Чарнігава.*

*Дарагая, любая, родная, харошая Ларута!*

*Учора надвечар прыехалі ў г.Борзну. Дарога была вельмі цікавая з геалагічнага пагляду. На абшарах трубежскай тэрасы цягнулася амаль суцэльная нізіна, надзвычайна забалочаная — спадчына пасьлядняпроўскага часу, калі тут была вялізарная лагчына стоку.*

*[...] Лясоў тут амаль німа, а ў лясах німа грыбоў, — на вялікі жаль...*

*У Борзне ніяк не маглі знайсьці вуліцу Энгельса, а калі знайшлі вуліцу, дык ніхто ня мог паказаць дом № 2. Борзна — гэта гогалеўскі Міргарад нашага часу.*

*[...] Настрой вельмі добры, бадзёры. Так я рад гэтай кароткай, але важнай для маёй працы падарожы.*

*Цалую Цябе ласкава, пяшчотна, і маці, і ўсіх родных.*

*Бывай, любая!*

*Твой Гурык*

*30. VI. 67 г. 8 г. 35 хв. р. Любеч, поплаў на левым беразе Дняпра.*

*Добрай раніцы, родная мая Ларута!*

*Учора ехалі з-пад Барзны на Чарнігаў па ягоцінскай ("марэннай") тэрасе і па трубежскай тэрасе. Праехалі некалькі ўкраінскіх сёл, вялікіх, доўгіх, па 2-3 км! Гэта ўжо паўночная, шэрая (па колеру дамоў і хат) Украіна. Многа буслаў: мальвы ў городах і дужа рэдка — макі; мяне няпрыемна ўразіла, што і тут макі не ў пашане, відаць.*

*Скрозь украінскія надпісы, прывітанні пры ўездах у сёлы з малюнкамі прыгожых жанчын. Але жывуць тут, відаць, менш багата.*

*Чарнігаў нам яшчэ раз спадабаўся. Па дарозе ў Любеч, у адным невялічкім лясочку, дзе пасьвіцца статак, знайшоў 2 маладзесенькія баравікі і 2 такія ж маладзенькія абабкі, процьма сыраежак.*

*У Любечы, у даўно вядомых абгаленнях, знайшлі адзнакі гляцыядыслакацый.*

*Заначавалі на беразе Дняпра. Расклалі першы раз (бо ёсьць дровы) вялікае вогнішча. Непадалёк пахаджваў адзінокі бусел, нейкі сумны, доўга не ляцеў нікуды.*

*Дняпро шырокі, магутны, але параходаў на ім так мала.*

*[...] Надвор'е выключна добрае, сонечнае, ласкавае.*

*У Мінску будзем 3.VII.67.*

*Бывайце дарагія, любыя. Цалую ўсіх, вітаю, абыймаю.*

*Пяшчотна лашчу маю любую, родную, дарагую Ларутаньку.*

*Гурык*

*28. VII.67 г. 9 г. рання. Поле (іржышча) у 140 км ад Днепрапятроўска на дарозе з Кіева.*

*Дарагая, родная, любая Ларута! Учора мы добра пераначавалі ў Кіеве.*

*[...] Раніцою добра падмацаваліся і ў добрым настроі паехалі па асфальтаваным шляху на Дняпрапятроўск, па правым беразе Дняпра, усцяж края дняпроўскага зледзяненння, праз Міронаўку, Смелу, Знаменку, Александрыю.*

*Гэта было цудоўнае вандраванне, ні з чым не параўнанае. Такой разнамаітасці і прыгажства краявідаў мы нідзе не бачылі. Глыбокія балкі, узвышшы, вузкія вадападзелы, палеткі, сады, лясочкі, усё сонечнае, радаснае, як і паселішчы, людзі. Ехалі, нібы ў казцы. Лясоў малавата. Але траплялся масівы то бароў, то лісцьвяных лясоў з дубу, клёну, ясеню, вяза; стаяць высокія, густыя, магутныя, нібы войска перад боем...*

*Гэта — радзіма Т.Шаўчэнкі і Б.Хмяльніцкага. Недалёку ад дарогі застаўся Суботаў, дзе адбылася драма Хмяльніцкага (напад на хутар, яго знішчэнне, паланенне жонкі), Чыгірын.*

*30. VII. 67. 12 г. дня. Херсон. Нядзеля.*

*Дарагая, любая Ларута! Вось мы і ў Херсоне. Начавалі ў стэпу, у 100 км адгэтуль, каля лесапаласы.*

*Вось дзе сапраўдны стэп! Бязмежнасць, курганы, мноства цыркуной, чорнае неба, цёплыя ночы, пах палыну.*

*Вялікія палеткі кукурузы, магутнай вялічыні, з двумя пераважна пачаткамі. І процьма кветак: брузэлевыя васількі, найбуйнейшыя незапамінайкі, мядункі жоўтыя і белыя, вялізарныя зяпы лева, жаўцякі і інш.*

*Кахоўку прамінулі, Берыслаў таксама. Веліч дняпроўскай даліны бачылі толькі здаля.*

*4. VIII. 67. 8 г. 45 хв. рання. Сасоннік на поўнач ад г.Казельца на Чарнігаўшчыне.*

*Дарагая, родная, любая Ларута!*

*Учора да нашай радасці, што свідраванне ў дэльце Дняпра сёлета адбудзецца хоць часткова, далучылася і няпрыемнасць: захварэў моцна на радыкуліт наш шафёр. Проста ня можа сагнуцца — баліць яму спіна.*

*[...] Чарнігаўшчына сустрэла нас бярозкамі, лясамі, прахладаю і фруктамі — паабапал дарогі каля сёл і вёсак стаяць людзі, каб мець якую капейку ад продажу яблык, слівак, дулек, жардзёл, цыбулі, бульбы, часнаку.*

*На Чарнігаўшчыне была новая навальніца — многа сучча зноў валяецца на зямлі і зусім свежага."*

* * *

Апошнія дваццаць гадоў жыцця на Бацькаўшчыне былі для Г. Гарэцкага яго самым шчаслівым часам, сапраўдным падарункам лёсу, якога ён сам змог дамагчыся. Нягледзячы на досыць сталы ўзрост (ужо пад 70), ён працаваў так заўзята, так апантана, што нават маладыя супрацоўнікі не паспявалі за ім, асабліва на палявых працах, на якія ён кожнае лета выязджаў на доўгі час. Аб'ездзіў усю Беларусь, краіны Балтыі, суседнія раёны Расеі і, канешне, не забываў і Украіну. Яшчэ ў 1967 г. Гарэцкага прызначылі старшынёй Камісіі па вывучэнні чацвярцёвага перыяду пры Секцыі навук аб Зямлі АН СССР і старшынёй савецкай секцыі Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнні чацвярцёвага перыяду. Ён адзін ці два разы амаль кожны месяц ездзіў у Маскву, удзельнічаў у шмат якіх (у тым ліку і міжнародных) нарадах і канферэнцыях як у Маскве, так і ва Украіне, Малдове ды інш. У Беларусі ён стварыў і узначаліў Беларускую антрапагенавую камісію, моцную беларускую школу геолагаў-чацвярцічнікаў, якая да гэтага часу карыстаецца шырокай вядомасцю.

У 1970 г. была надрукавана трэцяя манаграфія "Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра". На наступны год за ўсе тры кнігі Гарэцкі атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР. З часам пабачылі свет яшчэ дзве яго манаграфіі. У 1972 г. яму прысвоілі званне "Заслужаны дзеяч навукі БССР". У жніўні 1982 г. ён быў намеснікам старшыні аргкамітэта XI кангрэса Міжнароднага саюза па вывучэнні чацвярцёвага перыяду (г.Масква), на якім выступіў з вялікім дакладам і быў абраны ганаровым членам гэтага Саюза. У 1986 г. яму разам з групай яго вучняў была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. Да апошніх дзён ён пісаў артыкулы, выступаў на вучоным савеце Інстытута. 20 лістапада 1988 г. сэрца Гаўрылы Гарэцкага перастала біцца.

Працуючы ў Менску, Г.Гарэцкі не кідаў сувязі з украінскімі геолагамі, часта з многімі з іх сустракаўся на канферэнцыях, перапіс-

ваўся, абменьваўся друкаванымі працамі. Сярод іх былі такія вядомыя вучоныя, як акадэмікі У.Г.Бандарчук, А.С.Вялаў, Я.Ф.Шнюкаў, члены-карэспандэнты А.Е.Бабінец, М.Ф.Векліч, П.Ф.Гожык, А.М.Марыніч, прафесары А.М.Багуцкі, Д.К.Біленко, К.І.Геранчук, П.К.Заморый, С.В.Кухцій, Г.І.Маляўко, І.В.Мельнічук, Д.П.Назарэнка, В.П.Паліенка, І.Г.Шоўкапляс, АЛ.Шаўчэнка і многія іншыя.

Г.Гарэцкі вельмі падтрымліваў і ўхваляў мае цесныя шматгадовыя сувязі з геолагамі Украіны на розных пасадах і ўдзел у разнастайных праектах: кіраўнік савецкай часткі праекта № 86 Міжнароднай праграмы геалагічнай карэлядыі (МПГК) " Усходне-Еўрапейская платформа — паўднёва-заходні край", у якім удзельнічалі навукоўцы з краін Балтыі, Беларусі, Малдовы, Расеі і Украіны на чале з членам-карэспандэнтам Васілём Васільевічам Глушко (1975-1982); старшыня Міжрэспубліканскай каардынацыйнай навуковай рады АН УССР, АН БССР і АН МССР па праблеме "Вывучэнне геалагічнай будовы тэрыторыі Украіны, Беларусі і Малдавіі ў сувязі з задачамі развіцця мінеральна-сыравіннай базы народнай гаспадаркі і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў (1980-1989)"; адзін з аўтараў (разам з вучонымі-геолагамі Чарнігава Ю.А.Арсірыем, А.К.Цыпко ды інш.) серыі картаў Прыпяцка-Дняпроўскага прагіну (1977-1981); намеснік галоўнага рэдактара (разам з В.В.Глушко, П.Ф.Шпаком ды інш.) серыі картаў "Тектоника нефтегазоносных областей юго-запада СССР" і тлумачальнай запіскі да іх (1988), адзначанай Дзяржаўнай прэміяй УССР, ды інш. І пасля смерці бацькі я працягваў сумесныя працы з украінскімі геолагамі і геафізікамі: "Схема глубинного строения литосферы юго-западной части Восточно-Европейской платформы" (разам з акад. Анатолем Васільевічам Чакуновым, чл.-кар. Усеваладам Барысавічам Салагубам ды інш.) (1992); міжнародныя праекты "Европроба", "Евробридж" (разам з акад. Віталём Іванавічам Старасценкам ды інш.), праект МПГК "Неогеодинамика Балтики" (разам з праф. Валянцінай Пятроўнай Паліенка) ды інш; член рэдакцыйнай рады ўкраінскіх часопісаў "Геофизический журнал", "Геологія і геохімія горючих копалин".

100-годдзю з дня нараджэння Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага была прысвечана ўрачыстая навуковая канферэнцыя ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Вельмі было прыемна, што спецыяльна прыехаў дырэктар Інстытута геалагічных навук НАН Украіны член-карэспандэнт (пазней акадэмік) Пётр Фядосавіч Гожык, які выступіў з цёплым прывітаннем. Да гэтай даты выйшла з друку кніга "Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы" (Мінск, 2000), у якой узялі ўдзел і ўкраінскія геолагі.

А.М.Марыніч у артыкуле "Летопись великого Пра-Днепра" адзначыў: "[...] Среди работ Г.И.Горецкого, связанных с Украиной, наиболее крупной является фундаментальная монография "Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра" (1970). В ней на основе огромного фактического материала — сотен скважин, анализов, десятков опорных геологических профилей, комплексных исследований — создана стройная история развития и формирования долины Днепра и ее притоков, по-новому освещен ряд принципиальных спорных проблем. [...] Эта монография стала классической работой по истории формирования крупных речных долин. [...] Научные труды Г.И.Горецкого широко известны на Украине и имеют практическое применение при геологических и геоморфологических исследованиях и в учебной работе" (с. 126).

Б.Г.Ськоў у артыкуле "Киев, Канев, Херсон..." успамінае: "В памяти остались близкие сердцу отпечатки далеких 60-70-х годов, когда я встретился с Гавриилом Ивановичем, работал рядом с ним. [...]. Его финишный рывок принес результат, который не имеет аналогов в российской, советской и мировой геологической науке: пять томов энциклопедии о великих прареках Русской равнины за 10 (с 1970 по 1980) лет. Огромное количество фактического материала, перелопаченного, просеянного сквозь сито многосторонних научных знаний и разложенного по соответствующим полочкам в свете единой научной теории. [...] Летом 1976 г. в Киеве проходило Всесоюзное совещание по изучению краевых образований ледниковых оледенений. На открытии совещания выступил Гавриил Иванович как сопредседатель совещания (вторым сопредседателем был академик АН УССР В.Г.Бондарчук). Начал выступление Гавриил Иванович на русском языке, продолжил на украинском и закончил на белорусском. Долго не смолкали бурные аплодисменты, что нечасто бывает на серьезных научных форумах" (с. 129-131).

І.В.Мельнічук у артыкуле "Полевая экскурсия в Западную Украину" падкрэсліў: "[...] По мнению Г.И.Горецкого, ледниковые и водно-ледниковые отложения бассейна Верхнего Днепра (разрезы Крукеничи, Рудки, Дубаневичи и др.) одновозрастные. Он предложил именовать ледниковый комплекс днестровским. Идея Г.И.Горецкого нашла на Украине своих последователей. [...] Что касается трех зон краевых образований Украинского Полесья, то Г.И.Горецкий предположил, что они принадлежат отдельным ледниковым языкам. Предположения Г.И.Горецкого были позже подтверждены материалами бурения" (с. 132).

П.К.Заморый адзначыў: "Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра" — чудесная и полезная книга"; К.І.Геренчук — "Ваша монография — капитальная работа, она войдет в золотой фонд палеогеографии плейстоцена"; М.М.Жукаў — "Книга об аллювии Пра-Днепра капитальна. Со скрупулезностью проанализирован огромный материал, - с позиций стратиграфии антропогена, литологии и палеонтологии. Появилась монография крупнейшего бассейна стока европейской части СССР. [...] Книга производит большое впечатление".

А.Е.Бабінец, Б.Г.Яськоў і С.В.Кухцій у рэцэнзіі "Геологическая летопись Днепра" канстатавалі: "[...]Благодаря энтузиазму и неутомимой энергии Гавриила Ивановича к работам по исследованию аллювия Днепра были привлечены крупнейшие специалисты различного профиля многих ведущих геологических учреждений Украины, Белоруссии и РСФСР, а изыскания по многим гидротехническим объектам именно с помощью Г.И.Горецкого были поставлены на должную научную основу. [...] Стратиграфическая схема аллювиальных отложений Г.И.Горецкого широко применяется в практике строительства на равнинных реках "Гидропроектом", "Укргипроводхозом" и многими другими организациями. [...] Книга написана в особом, присущем только Гавриилу Ивановичу приподнятом стиле, свидетельствующем о вдохновенном творчестве, о великой любви к объекту его исследований".

Да 85-годдзя з дня нараджэння Г.І.Гарэцкага геолагі-чацвярцічнікі Украіны напісалі: "... патриарха четвертичного периода, мудрого учителя и наставника четвертичников Советского Союза, мужественного гражданина и ученого, бесконечно великодушного и столь же скромного человека, большого друга четвертичной комиссии Украины поздравляем...".

П.Ф.Гожык падкрэсліў тады, што " [...] Гавриил Иванович не только ученый, но и мой идейный вдохновитель, к которому испытывал и испытываю глубокую симпатию, несоизмеримую с моим отношением ни к одному из наших корифеев..."

У Інстытуце геалагічных навук НАН Украіны ў 2000 г. адбылося пашыранае ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета, прысвечанае 100-годдзю Г.І.Гарэцкага. Я разам з вучаніцай Г.Гарэцкага, супрацоўніцай нашага Інстытута Р.А.Зінавай, былі запрошаныя ў Кіеў на гэтае пасяджанне. З вялікай прыемнасцю і радасцю сустрэў я там многіх сваіх сяброў і калег, у тым ліку былога міністра геалогіі Украіны Петра Фёдаравіча Шпака, у якога ў 1981 г. быў апанентам на абароне доктарскай дысертацыі ў Маскве. На тым Вучоным савеце пачуў шмат добрых сардэчных слоў пра свайго любага тату, такіх шчырых, цікавых, жывых успамінаў, што, здавалася, ён сам ці яго светлы дух

прысутнічаў у зале... З вялікім гонарам і шчырай удзячнасцю пабачыў у Інстытуце партрэт акадэміка Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага сярод самых выдатных даследчыкаў геалогіі Украіны.

Свой нарыс мне хочацца закончыць тымі ж кароткімі, але выразнымі словамі, якімі я, як прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", завершыў сваё прывітанне на Сусветным форуме ўкраінцаў у жніўні 1997 г. у палацы "Украіна" у Кіеве: "Жыве Беларусь!", "Слава Украіне!"

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

Гарэцкі Гаўрыла Іванавіч (10.04.1900 - 20.11.1988) - эканаміст, дэмограф, геолаг, археолаг, географ, грамадскі дзеяч, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928-1930 гг. па спецыяльнасці "эканомія"), акадэмік АН БССР (1965-1988 гг. па спецыяльнасці "геалогія"), доктар геолага-мінералагічных навук (1946), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1972), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), Дзяржаўнай прэміі БССР (1986). Вялікі ўплыў на фармаванне светапогляду Г.Гарэцкага меў ягоны родны старэйшы брат Максім Іванавіч Гарэцкі (18.02.1893 -10.02.1938) - беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, фальклярыст, грамадскі дзеяч, адзін з пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы, класік беларускай літаратуры. У жыцці і дзейнасці акадэміка Гаўрылы Гарэцкага вельмі шмат звязана з Украінай. Вытрымкі з лістоў Гарэцкага друкуюцца так, як яны напісаны іх аўтарам.

## Звесткі пра аўтара

Гарэцкі Радзім Гаўрылавіч нарадзіўся ў 1928 годзе ў Менску. Акадэмік НАН Беларусі, замежны член Расейскай АН, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі РАН імя акадэміка М.С.Шацкага, прэміі імя акадэміка ВА.Капцюга Сібірскага аддзялення РАН і НАН Беларусі. Ганаровы дырэктар Інстытута геахіміі і геафізікі. Былы віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі, член Амерыканскага геафізічнага саюза, прэзідэнт Рэспубліканскага фонду братоў Гарэцкіх, былы прэзідзнт Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" і Беларускага геалагічнага таварыства.

Навуковыя працы прысвечаны геалогіі, тэктоніцы, геадынаміцы і карысным выкапням платформаў, уключаючы тэрыторыю захаду Усходне-Еўрагіейскага кратона і Беларусь Галоўны рэдактар часопіса "Літасфера", член рэдакцыйных саветаў шэрага геалагічных часопісаў суседніх краін — Украіны, Расеі, Летувы.

Аўтар кніг "Шляхам адраджэння" (1997), "Ахвярую сваім "Я"..." (1998), "Вечна жыве Беларусь!" (2003), "Академик А.Л.Яншин — дорогой мой учитель и друг" (2005), суаўтар кніг “Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы" (2001; 2005), укладальнік кніг "Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы" (2000), “Гаўрыла Гарэцкі. Выбранае" (2002). Надрукаваў шэраг артыкулаў, прысвечаных нацыянальнаму адраджэнню Беларусі, жыццю і творчасці Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, некаторых вучоных і беларускіх пісьменнікаў.